НАША НІВА

Беларуская газэта *Вільня №3, 1994*

Тэмпэратура Крыві



У ЮГАСЛАВІІ ўсё як у Беларусі. Адзін, быццам, народ, пацярпелы ад розных імпэрый, адна, быццам, мова, і — розныя веравызнаньні: праваслаўныя, каталікі... Але ў нас няма грамадзянскай вайны, а ў Югаславіі ёсьць. Чаму?.. Гэтай тэме прысьвечаныя артыкул Энтані Сміта «Паўставаньне нацыі», гутарка з харвацкім прафэсарам у рэдакцыі «НН», ліст Бісэркі Райчыч з Сэрбіі ды іншыя матэрыялы.

ЮРЫ ГУМЯНЮК:

Маркіз дэ Сад шпацыраваў па навакольлі,
распавядаў кабетам пра пінгвінаў.
Ну а жанчыны трызьнілі Купальлем,
як прэзыдэнты плачуць ля мартэнаў.

ІДЭЯ МЁРТВАГА ДОМУ. Артыкул пра тое, як беларуская ідэя зь ідэі творчасьці паступоваператварылася ў знак руціны. Пачаткі гэтага ператварэньня — у пачатку нашага стагодзьдзя.

ІЎЛІН ЎО. Страшнае апавяданьне «Маленькая пагулянка містэра Лавдэя».

КНІЖНЫ РЫНАК У ІСЛЯНДЫІ. У беларускай газэце такі тэкст адразу ператвараецца ў антыўтопію. Трэба толькі ўявіць сабе празьмерны рост маштабаў нацыянальнай кніжнай прадукцыі і народ, які зачытваецца біяграфічнымі раманамі пра Вольгу Корбут ці Мікалая Дземянцея.

ВЯЛІКДЗЕНЬ. Рэдакцыя «Нашай Нівы» віншуе ўсіх сваіх супрацоўнікаў, фундатараў і чытачоў са сьвятам радасьці й вясны.



МЛОСЬЦІ

Кароткая аповесьць пра гідкасьць

Адам Глёбус

Гідка. Ну, калі хочаш, тады раскажу, як пачуцьцё гідлівасьці перапаўняла мяне...

На летняй практыцы пасьля другога курсу. Мы жылі ў вёсцы Латыголь. Елі ў школьнай сталоўцы, а ўвечары куплялі малако — выдатная вячэра — малако з лустаю хлеба. Дзяўчаты з нашае групы таксама прыносілі сабе слоікі з малаком. Выйшаўшы на ганак, я ўбачыў, як з прыступак у траву скокнула жабка. І зьявілася думка: укінуць жабку ў слоік з малаком. Так і зрабіў, укінуў жабку ў поўны трохлітровы слоік і ўжо накрываў яго капронавай накрыўкай, як убачыў на паверхні лупавокі тварык. Я вылавіў жабку, прывязаў ёй ніткай да нагі каменьчык, каб гадаўка не ўсплывала, і апусьціў у малако. І ў думках не было, што яна захлынецца, выпрастае свае тонкія лапкі. Заставалася чакаць. Першай вярнулася з вуліцы Галя. Наліла малака поўную шклянку і спакойна выпіла. Другая — Жана — пасьпела выпіць толькі паўшклянкі, бо калі Галя налівала сабе чарговую шклянку, у малацэ паказалася здохлая жабка. Жана папярхнулася, малако палілося праз нос. Асабіста ў мяне жабка ў малацэ, нават нежывая, не выклікае агіды. Мусіць, таму я адзін мог піць з таго слоіка.

На той самай практыцы было яшчэ адно здарэньне, якое выклікала амаль ва ўсіх пачуцьцё гідкасьці. А галоўным пэрсанажам выступіў маленькі кудлаценькі сабака. Я так і ня ведаю, ці меў ён якога гаспадара. Мусіць, меў, бо ў вёсках меней валачашчых сабак, чым у мястэчках і гарадах. Гэта на гарадзкіх і местачковых сьметніках сабачая гайня — зусім ня дзіва.

Але што я ўсё пра сабачае, калі паабяцаў пра млосьці...

Сабака колеру вільготнага пяску пачаў штовечар прыходзіць пад школьны ганак і выпрошваць чаго паесьці. Дзяўчаты кідалі яму скарынкі. Ён чвякаў, ускідваў галаву, каўтаў хлеб, а потым пачынаў зноў віляць закручаным у абаранак хвастом. Вострая лісіная пыска зіркала чорна-фіялетавымі вочкамі лісьліва й хітра. Сабачка меў і сапраўды нейкую кемлівасьць, бо праз колькі дзён ён ужо сам ведаў расклад нашага практыканцкага жыцьця й як з-пад зямлі вырастаў перад намі, калі мы выходзілі са сталоўкі. Хутка прайшла першая радасьць, як і цікаўнасьць да закіданьня ў ружовую іксластую пашчу кавалкаў хлеба. Карміць сабаку зрабілася абавязкам. Кінулі каля ганку што-небудзь і пайшлі. Спраў хапала. Усім трэба было тэрмінова скончыць партрэт цёмнай, як зямля, бабулі. Партрэты маляваліся ў старой на панадворку, мэтраў трыста ад школы. Мы ціхамірна пэцкалі палотны, калі пачулі голас Алеся Агафончыка. Ён бег ад школы й нешта крычаў, слоў не разабраць, але па ўзмахах рук мы зразумелі, што трэба дапамагаць. Хто кінуў пэндзаль на палітру, а хто й з пэндзлем у руцэ, пабеглі насустрач. Задыханы Алесь пачаў, зьбіваючыся, тлумачыць: нейкі гад укінуў сабачку ў прыбіральню, сабака яшчэ плавае, але вось-вось захлынецца й загіне. Дзяўчаты адмовіліся ратаваць улюбёнца, хлопцы таксама ня выказалі вялікага жаданьня дапамагаць Алесю. У бок школы пайшлі мы ўтрох: Алесь Агафончык, Алесь Ласевіч і я. «Я б яго выцягнуў, але ён баіцца — уцякае. Я руку ў дзірку апушчу, а ён у другі канец ямы плыве», — расказваў па дарозе Агафончык, і ягоныя вочы плавалі за тоўстымі павелічальнымі шкельцамі акуляраў. У Агафончыка была піянэрская звычка глядзець субяседніку ў вочы, таму ён ішоў на паўкрока паперадзе, не раўнуючы, як той сабака... «Ну й смурод!», — Алесь Ласевіч спыніўся мэтраў за дваццаць ад пабеленага будана прыбіральні. І сапраўды цяжкі дух хвалямі разыходзіўся ад доўгай шара-срабрыстай прыбіральні, на сьцяне якой чарнелі два вялізныя павукі літараў «М» ды «Ж».



«Ён там яшчэ плавае...» — Агафончык першы зайшоў у смуродлівую хвалю. Па звычцы мы памкнуліся ў мужчынскае аддзяленьне. Чатыры цёмныя адтуліны заваражылі мяне. Агафончык апусьціўся над адной і прыняў такую позу, нібыта ў спартовай залі зьбіраўся адціскацца ад падлогі. Агафончык — чалавек спартовы, і ўсе практыкаваньні рабіў нібыта дзеля ўзору, дзеля прыкладу — рабі як я раблю. Пераадольваючы млосьць, я зазірнуў у адтуліну. Па-над алейнымі пералівамі густой жыжкі ўзвышалася адно сабачая галава. «Не дастанем адсюль, трэба ў жаночае аддзяленьне йсьці». На слушную прапанову Ласевіча заструменіўся гук падзеньня сікуноў. «Хто гэта там?» — Агафончык ускочыў і ўтаропіўся на дашчаную перагародку, што сымбалізавала наяўнасьць процілеглых полаў. «Я!» Мы ўтрох паглядзелі на дошкі, з-за якіх прыляцела такое самаўпэўненае, ну проста экзыстэнцыяльнае «Я». «Што за я? Хто там?» Вялікія вочы Алеся Ласевіча выказвалі непаразуменьне. «Я — Ларыса Данількевіч! А ты, Лось, калі прыйшоў у прыбіральню, дык рабі сваю справу ціха й не перашкаджай іншым». Тыраду суправаджаў шорах апранахаў. «Дурань!» Агафончык, Ласевіч і я выскачылі на двор. З жаночага аддзяленьня выплыла чырвоная Ларыса, дзябёлая дзявуля. «Вар'яты. Я ўсё раскажу Кіму Тодаравічу!» «Там сабака захлынаецца», — Агафончык наставіў на Ларысу лінзы

Працяг на старонцы 2

Дзёньнік прыватнага чалавека



ВІЛЬНЯ. У адносінах беларусаў зь Вільняй за апошнія 50 гадоў адбылася мэтамарфоза. Яшчэ 50 гадоў таму Вільня спараджала беларушчыну. Людзі тут атрымлівалі натхненьне дзеля свае чыннасьці. Гэта была лесьвіца ў неба, вакно ў сусьвет, брама Высокай Культуры. Гэта было месца любові, мядовага месяцу беларускае мовы, нацыянальнае сьведамасьці, чалавечнасьці ў беларускім абліччы. Дагэтуль кожны, хто пыяжджае ў Вільню, адчувае магутны пыліў жаданьняў. Нідзе так натхнёна не працавалі архітэктары, палітыкі, сьвятары, настаўнікі. Нідзе не напісана столькі клясычных беларускіх вершаў... Цяпер усё наадварот. Мы вышукваем тут не натхненьня, а фактаў-зачэпак нацыянальнае прыналежнасьці. Гэты будынак, гэты пляц, гэты крыж зьвязаны зь беларускай культурай! Вось доказы! Доказы замест натхненьня... Шчасьце шлюбу, каханьня й любові зьмянілася судоваю цяжбай. Зацята даказваючы прыналежнасьць сабе (падабенства да сябе) таго ці іншага прадмету, мы тым самым зацята сьцьвярджаем свой зь Вільняй развод.

МЭВА МАРОН. Ірляндзкі карэспандэнт «Нашай Нівы» публікуе свае тэксты ці ня ў кожным чарговым нумары й паступова робіцца фактарам беларускае літаратуры. Зьява зусім унікальная. Бо гэта эсэістыка экстракласы, таго жанру, да якога наша літаратура яшчэ не дажыла. Яна не перажыла яшчэ мяжу інфармацыйнае перасычанасьці ведамі пра самую сябе. Груба кажучы, у нас яшчэ магчымы чалавек, які *чытае ўсё*. Але колькасьць літаратуры множыцца, літаратура ўліваецца сваім прытокам у магутнае рэчышча эўрапейскага й сусьветнага кантэксту, што й ставарае перадумовы для экстраклясная рэфлексіі. Пасярод гэтага кніжнага мора той, хто хоча прасачыць ягоныя гальфстрымы з гальфстрымікамі, ужо можа разь- лічваць толькі на самога сябе, свае здольнасьці й сваю творчую энэргію.

ПРЭЗЫДЭНТ. Прэзыдэнцкія выбары на Беларусі будуць незвычайныя й дзіўныя. Матывы ўсіх удзельнікаў моцна адрозьніваюцца ад тых, што самі сабой зразумелыя ў іншым сьвеце. Беларускія палітыкі разьлічваюць на «сознательность» і чакаюць ад народу менавіта «сознательности». «Вспомните, как мы жили!» — кажуць камуністы. «Будзьце патрыётамі!» — кажуць незалежнікі. Народ жа прапускае гэта міма вушэй і глядзіць, каторы з палітыкаў сымпатычнейшы. Іншых парамэтраў проста не йснуе. Між тым, як на добры лад, я мушу галасаваць за таго, за каго мне выгадна. Мне, а ня нейкім мітычным радзімам ці адзінствам-братэрствам. Напрыклад, за каго выгадна галасаваць Рэдакцыі «НН» і той культурнай плыні, якую яна прадстаўляе, — таго яна й падтрымае. І ніякай «сознательности».

ЮГАСЛАВІЯ. Ня ведаю, ці Беларусь яшчэ не дасьпела да міжканфэсійнай грамадзянскай вайны ці справа й сапраўды ў тэмпэратуры крыві — у гарачым подыху арыенту, у тым, што Расея — ня Турцыя, і кроў яе, пакуль дабяжыць ад «азиатского подбрюшья» да «паўночнае Пальміры», астывае... Падзел на веравызнаньні ў Югаславіі стаў дэструктыўным падзелам адзінага этнічнага цела. Гэтак нейкае касьмічнае цела пасьля выбуху разламваецца на некалькі меншых, і камэнтаваць можна па-рознаму: ці нешта згінула назаўсёды, ці — нарадзілася пяць новых плянэт... Урэшце, хто можа сказаць, якая была зададзенасьць?.. Пабітых людзей шкада, і сябе шкада. І добра, калі без вайны... Між тым, і ў нашай гісторыі здараліся моманты, калі адзінае цела нацыі выпрабоўвае на трываласьць міжканфэсійны разлом. Мы засталіся цэлай плянэтай. Але й разлом нікуды ня зьнік.



Здымак Алены Адамчык

МЛОСЬЦІ

Працяг са старонкі 1

акуляраў. «Ну, і хай сабе захлынасцца». — Ларысіны пальцы з абгрызенымі пазногцямі аправілі клятчастую спадніцу. «Пайшлі выцягнем!» — я накіраваўся да жаночага аддзяленьня. І чаму ў жаночых прыбіральнях заўсёды чысьцей? Мусіць, з-за таго, што слабейшая палова чалавецтва ўсе патрэбы робіць седзячы. Сабачая галава з прыціснутымі да шыі вушамі цяпер пагойдвалася пад мужчынскай паловаю. Доўгая рука Ласевіча схапіла сабаку за поўсьць. Сабака нават не завішчаў. На двары ён стаяў у траве і калаціўся. Ягоны некалі закручаны хвост зьвісаў з худога азадку роўненькім пруткому. Агафончык прынёс вядро вады і вывернуў на перапалоханага сабаку. Сабака страпянуўся, прысеў на ўсе чатыры лапы, падскочыў і кінуўся ўцякаць. Ён больш не прыходзіў на ганак і не выпрошваў хлеба.

А праз тыдзень, зусім выпадкова, я даведаўся, што кінуў сабаку ў прыбіральню вясковы вар'ят Юрачка, клышаногі пераростак, зь якім нават малыя дзеці не хацелі гуляць. Юрачка хадзіў па Латыголі ў вялікай картовай кепцы і ўсьміхаўся ўсім сустрэчным, агаляючы ружовыя, нібыта плястмасавыя дзясны. Крыўдаваць на такога грэх. Хоць я, вядома, азьліўся.

Васемнаццаць гадоў — такі ўзрост, калі ледзь ня ўсе праявы жыцьця выклікаюць у душы гідкасьць. Юнацтва скончылася, цынізм і максымалізм адыйшлі ў мінулае, а ім на зьмену прыйшло непрыняцьце існага, і ўсё навокал зрабілася агідным. Нават каханьне стала іншым, біялягічным. З плятанічных, мройных, летуценных адносінаў яно трансфармавалася ў матэрыялістычнае вывучэньне й дасьледаваньне аб'екта. Такім аб'ектам стала для мяне Жана Шук — высокая, паўнацелая, белая дзяўчына. Яна была белая ўся і паўсюль, нават смочкі на поўных грудзях былі ружовыя, сьветлыя, амаль белыя. Мы бралі эцюднікі, кардонкі ды йшлі нібыта пісаць краявіды. Мы нават разыходзіліся ад школьнага цэмэнтовага ганку ў розныя бакі, а потым сустракаліся дзе-небудзь на ўзьлеску ці каля рэчкі. Мы шукалі зацішнае месца, кідалі ў траву мастакоўскі рыштунак і, цалуючыся, распраналі адно аднаго. Мы ня ведалі нават самых простых рэчаў. Кожнае набліжэньне, дотык, ласка зьнітоўваліся зь пераадольваньнямі сораму, скутасьці, уяўных маральных нормаў. Пацалункі... Бясконцыя, ненатольныя, балючыя... Яна ўкусіла мяне за ключыцу. Тыдзень я саромеўся распранацца перад хлопцамі.

Гадзінамі мы ляжалі распранутыя побач... Пакуль не пачынаўся дождж ці не цямнела, ці не надыходзіў час бегчы палуднаваць... Мы разглядалі адно аднаго так, нібыта адкрывалі таямніцу сусьвету. І ў той дзень мы распрануліся й ляжалі ў жыце, на зямлі, і я выпадкова патрапіў у яе. Яна раскінула рукі, выгнулася ўсім сваім доўгім целам насустрач майму целу й закрычала. Крык разьляцеўся на ўсё поле й пад самае белае неба. А я пералякаўся, спалохаўся й зьдзівіўся, убачыўшы, якое ў яе ружовае паднябеньне. Такое ж ружовае, як дзясны вар'ята Юрачкі, што хацеў утапіць у прыбіральні сабаку. Нехта крычыць?! Пайшлі паглядзім! Ай, пэўна ж, дзеўка з хлопцам забаўляюцца... Увушшу яшчэ стаяў крык, і праз яго выплылі галасы вясковых жанчын. Мы апрануліся, стоячы на каленях, саромеючыся ўстаць і сустрэць позіркі чужых, варожых нам людзей.

Жана не кахала мяне, яна кахала Алеся Ласевіча. Зь ім яна гуляла па вёсцы Латыголь доўгімі цёплымі вечарамі. Яны трымалі адно аднаго за руку, гэтак, як некалі й я трымаў за руку Вольгу Пакроўскую. Жана, як і Вольга мне, расказала Алесю пра ўсё, што здарылася на жытнёвым полі. І Алесь прыйшоў у школу, я чытаў, лежачы на ложку, і ён папрасіў пайсьці на вуліцу й пагаварыць... Мы стаялі каля прыбіральні. «Я кахаю яе, і яна мяне кахае. Нашто ты нам перашкаджаеш? Паабяцай, што *гэтага* болей ня будзе!» Тады я першы раз у жыцьці паабяцаў, што *гэтага* больш ня будзе, і зразумеў, як лёгка паабяцаць, і ўсе застаюцца задаволеныя. Мне даводзілася шмат разоў абяцаць, што *гэтага* ці *таго* больш не паўторыцца. А яно паўтаралася, множылася, і я перастаў сур'ёзна ставіцца да сваіх і чужых абяцаньняў. Ну, чаму я павінен адмаўляць сабе й Жане ў цялеснай любові? Чаму двоім трэба слухаць аднаго? І мы ня

Ідэя Мёртвага Дому

Сяргей Паўлоўскі

Тэкст, які падаецца ніжэй, выкананы ў жанры «інфантыльнага снабізму» альбо «снобскага інфантылізму», — як каму больш падабаецца. Маючы на ўвазе гэткую зыходную жанравую адмоўнасьць, аўтар імкнуўся знайсьці й абазначыць яе станоўчы антыпод — у паэзіі, культуры, палітыцы. Але не знайшоў і таму самаўпэўнена зрабіў выснову пра тое, што заняпад беларускай ідэі ёсьць і ён непераадольны ў тых формах, у якіх гэтая ідэя йснавала ды йснуе дагэтуль.

Цяпер для мяне ня так істотна ды вызначальна, хто я — сноб, інфантыл, уцякач, здраднік. *Гэтаму* ўжо можна здраджваць. Нібыта пасьля доўгае хваробы мне вярнуўся першапачатковы сэнс ідэі: беларушчына — гэта творчасьць. Шматгадовыя ваганьні й прыблізны сэнс адраджэнства склаліся ў адзіную прычыну паразы на пераможным шляху. Цяпер я ведаю, чаму нашыя першыя сапраўды шчасьлівыя хвіліны далучэньня да яе сталіся з часам для многіх з нас неахвотным мэханічным дзеяньнем — руцінаю «адраджэньня». Але першапрычыны такое мэтамарфозы — у колішнім часе, на пачатку стагодзьдзя. Там, разам з усім, што ў нас ёсьць, закладзеныя падваліны Мёртвага Дому беларускай ідэі.

Цяпер я ўпершыню зьбіраю да кучы тыя пытаньні, на якія ў розныя гады стараўся не дашукваціца адказу. Напрыклад, чаму нашыя вялікія паэты-прарокі, і першы зь іх — Купала, зусім невядомыя ў сьвеце? Іх імёнаў няма ў шэрагу Уітмэнаў з Апалінэрамі... (Праз доўгі час я пераконваў сябе, маўляў, ёсьць клясыка сусьветная і — для ўнутранага карыстаньня, «для служебного пользования». Але перачытваць вершы пра «долю беларускага мужыка», напісаныя ў раскошным віленскім рэстаране, не хацелася ніколі. Хацелася — калі не пэйзажныя й любоўныя, дык жорсткія, мужныя, ваяўнічыя.) Чаму такі пазытыўны твор беларушчыны, як «Адвечным шляхам» І.Абдзіраловіча, так настойліва ігнаруецца тымі, хто вершыць сёньня тое адраджэньне? І самае-самае: чаму для мовы, культуры, нацыянальнае сьведамасьці няма годнае сустрэчы з боку людзей? Калі гэта Дзіва (а такім яно адкрылася нам), дык яно мусіла б быць жаданым дзівам і для астатніх...

Я ведаю мноства самапераканальных, гіпнатычных адказаў на гэтыя пытаньні. Але яны не даюць выйсьця. Мне ж трэба, каб гэтыя пытаньні аднойчы перасталі стаяць. Хай паўстануць наступныя. Купала — заснавальнік традыцыі й заснавальнік заганы. Дойлід Мёртвага Дому. Гэта ён — найвялікшы пясьняр нацыі й адначасова — галоўны ідэоляг руціны (варта параўнаць сьветлую ·й жывую «Нашу Ніву» А.Уласава з сухой, пратакольнай газэтай, рэдактарам якой стаў Купала). Калі ў пачатку стагодзьдзя (і крыху раней) узьнікла ўнутранае процiборства ў рыфмічнай пары паміж «воляй» і «доляй», беларушчына зазнала сама імклівы свой узьлёт і тут жа — сваю злаякасную пухліну. Выяўленьне Волі ці пошукі Долі? Гэта й значыла — творчасьць ці руціна? Гаспадар ці просьбіт, утрыманец? Валоданьне сваёй сытуацыяй ці маўклівы пратэст супраць «аб'ектыўных прычынаў»? (Аб'ектыўныя прычыны бываюць толькі ў аб'екта). Таленту ці нават проста жаданьня не хапіла, і перамагло другое. Пошукі Долі. Літаратурныя й палітычныя мэтры пачалі множыцца, капіявацца, набіраць штаты — у большасьці на сацыяльную нажыўку. Выяўленьне Волі паступова стала выключэньнем з правілаў беларушчыны, магістралю якое занялі пошукі Долі. Гэтак славутая «Пагоня» — стала выключэньнем у грамадзянскай паэзіі М.Багдановіча.

І тады прагучаў кліч: шукаць! Не будавацца, ня ўзворваць, а шукаць! Дзе? Вядома ж, на шляхох. Беларускі шлях! Ня дом, а гасьцінец, брук, бальшак. З гэтага паўстала цэлая філязофія валацугаў, што мыкаюцца без кала й без двара. Сяк-так дацягнулі да БНР. Але вынечваньне Долі ўжо запаланіла розум, і рушылі ў шлях. Савецкі час і сытуацыя Заходняй Беларусі канчаткова вымелі з традыцыі Волю ў абодвух яе значэньнях. Доля стала сымбалем экстэнсіўнага, занападнага «росквіту». Да нашых дзён.

Адрозьненьне хіба ў тым, што на пачатку стагодзьдзя пад сьцягі шукальнікаў долі ішоў сацыяльна заклапочаны элемэнт, а сёньня пад тыя ж сьцягі зьбіраецца элемэнт дэклясаваны. Жорсткая насьмешка гісторыі, карыкатура, уедная мэтафара: «Наша Доля», першая газэта беларускага адраджэньня, сёньня стала органам таварыства інвалідаў...

Філязофія бадзякаў. Незалежнасьць на маршы. Шлях, рух, фронт... Вечныя Вандроўнікі. Вось прапанаваныя крытэрыі, прастора, мэнтальнасьць, у якіх існуе сёньня беларуская ідэя. Абветраная, выцьвілая, усохлая. Яна на шляху. Дом яе Мёртвы. Замест новых Луцкевічаў, Уласавых, Канчэўскіх сюды найшлі казённыя людзі са сваімі камісарамі. Квазібальшавікі, амаральныя маралізатары, людзі-рэчы, «бывшие в употреблении» удзельнікі ўсіх партый. Яны — учарашнія камуністы, службісты, кар'ерысты-аўтсайдэры. Мроеную й жаданую, сьветлую ідэю яны гвалтуюць як прадажную самадайку і, як у тым анэкдоце, ляпяць ёй на задніцу свае бухгальтарскія штампы. Ня дзеля таго, каб прысвоіць ці адзначыць, а толькі каб прыпадобніць да сябе.

Жывыя людзі абмінаюць гэты Мёртвы Дом. Бог даў Беларусі ня толькі самае горшае ў сьвеце начальства, але й самых нікчэмных патрыётаў, самых баязьлівых палітыкаў, самых бязвольных змагароў...

Яшчэ ўчора руціннасьць гэтага руху ратаваў арэол падпольля. Але ўжо колькі гадоў як гэты арэол разьвеяўся. І што ж змагары? Дагэтуль па ўсёй Беларусі стаяць стоды ранейшае ідэалёгіі (ці гэта камуністы вінаватыя, што не прыбралі?), так і ня ўзгоднены паміж адраджэнцамі правапіс роднай мовы, ня створана дзяржаўная ідэалёгія беларускага парадку. Нічога ня створана. Уся дзейнасьць змагароў — гэта апэляцыі да наяўнае ўлады, якую яны называюць незаконнай. Гэта тыя ж крыкі пра Долю. І ніводнага свайго валявога рашэньня.

У гэтай філязофіі ёсьць і свае спадзевы (вось, вырастуць дзеці, тады...), і свае апраўданьні (жывем дзеля Бацькаўшчыны). Але гэта філязофія адмаўленьня творчасьці. Яна — тыя няўзьдымныя кайданы, у якіх даклыпала да нашых дзён беларуская ідэя. Ідэя Мёртвага Дому.

А я ўсё думаю — як зьвязаць творчасьць паэтаў майго пакаленьня з творчасьцю ўсіх гэтых панчанкаў, камейшаў, макалёў? Паміж імі — прорва. Як знайсьці агульную мову з апазыцыяй, што абрала сабе такі непрывабны імідж і чыя ідэйная прадукцыйнасьць уся ад адваротнага, «ад агіднага», ад сваркі на гэтых ленінаў, камуністаў і г.д., але бяз каліва чыну «у адказ».

Яны шукаюць Долі. Паміж імі й сучасным новым незалежнікам утварылася прорва. Для іх зусім непрымальныя парасткі Волі ў сучаснай паэзіі й палітыцы. Для мяне гэтыя парасткі — усё, што ў гэтай паэзіі ды палітыцы ёсьць. Бо я хачу нармальна жыць сёньня, ствараць сваю сёньняшнюю Беларусь. Бо сёньняшняму народу патрэбны сёньняшні, а ня колішні стэрэатып *свае Радзімы, якая не прадаецца*. А для гэтага я, творца стэрэатыпу, мушу быць адным зь іх, а не іх камісарам. Сёньняшняму народу трэба мець прызнаньне ў сьвеце. А для гэтага ён, народ, мусіць прадукаваць культуру эўрапейскага ўзроўню.

Мне шкада маіх сяброў, якія калісь зазналі тую першую радасьць усьведамленьня. Многія зь іх адыйшлі ад беларушчыны. Але найболей шкада тых, што засталіся, што заглушылі свае творчыя поклічы й прынялі правілы Мёртвага Дому. Яны папаліся на множаньні, на рэпрынтах.

Яшчэ гадоў 10 таму фотакопіі твораў Луцкевіча, Станкевіча, Варонкі... прынасілі асалоду здабыткаў. Але сёньня самая ідэя вяртаньня — гэта прафанацыя. Ну, надрукавалі вершы Булака-Балаховіча й Езавітава — што далей? Магутная інэрцыя выцягвае энэргію на ўсё новыя брашуркі варонкаў, цьвікевічаў, мамонькаў... І няма ім канца. Рэпрынты, перадрукі, публікаткі... Складнікі філязофіі руціны. Рэпрынтная палітыка, рэпрынтныя адраджэнцы... Быццам сабраліся паўтарыць усё, што так доўга ляжала ў спэцсховах. Паўтарыць адраджэньне тых — з тайным ці яўным помыслам апраўдаць уласную нятворчасьць. Нібы за выратавальнае кола, хапаюцца яны за тыя прозьвішчы, назвы, рэчы... І ўсё адно тонуць. Добраахвотныя паўпрэды Купалы й Крэчэўскага. Імітацыя паэзіі, палітыкі, дзейнасьці, выканьньня абавязку перад бацькаўшчынай, перад ідэаламі ўласнае маладосьці.

Рэпрынтная палітыка й паэзія. Выдатная мэтафара — у апавяданьні А.Мінкіна «Стары Дом».

Копія з копіі — правіла Мёртвага Дому. Ужо даўно множыцца тое, чаго ніхто ніколі не чытаў і не прачытае — нават самі капіравальнікі.

І ўсё ж мае адкрыцьцё гэтага ўсяго нагадвае мне маё першае адкрыцьцё Дзіва беларушчыны. Я адкрыў ня Мёртвы Дом. Наўзбоч ад яго зьявіліся новыя жывыя парасткі выяўленьня Волі. Паэты, музыкі, настаўнікі... Яны ёсьць. І на гэты раз яны ўжо ведаюць сабе цану ды нізавошта ня выйдуць на біты шлях.

Раней, раз-пораз зазіраючы ў гэты тупік, я казаў сабе — ня блытай жанры. У іх дыдактычна-асьветніцкая задача, у цябе — чыста творчая. Цяпер я бачу, што гэта ня жанры, а два розныя сьветапогляды: руціна і творчасьць. У кожным свая дыдактыка, асьвета й свае фікцыі. Калі Беларусь перастае быць сынонімам творчасьці, яна становіцца сынонімам Мёртвага Дому. І мне няма чаго там рабіць. Я йду дагледаць парасткі Волі. Традыцыю, якую мы мусім запачаткоўваць у палітыцы, навуцы, паэзіі. Яе код — нармальнасьць. На разьвітаньне ў мяне няма слоў. Ёсьць апошні зборнік паэзіі Глебуса, «Скрыжаваньне», — як апальсын, кінуты ў шыбіну Мёртвага Дому...

Яны ёсьць. Жыве Беларусь.

слухалі. І я не папракаў Жану за тое, што яна ўсё расказала Алесю. І ўпэўнены, што яна не папракне мяне за тое, што я ўсё расказваю табе. І ня трэба казаць пра мараль. Варта гаварыць пра пачуцьці. Пра гідкасьць, якую ў васемнаццаць гадоў я так востра адчуваў.

Мне было агідна стаяць у перадпакоі менскай кватэры Кіма Тодаравіча Жэрдкі. Ягоны доўгатэрміновы запой пачаўся яшчэ ў Латыгалі. Кім Тодаравіч піў з дырэктарам школы, дзе мы жылі. Пілі яны чарніла, таннае пойла. Язык не паварочваецца сказаць — віно! Набіралі ў крамцы па дзесяць-дванаццаць пляшак, зачыняліся ў дырэктарскіх апартамэнтах і жлукцілі бурачковую бурду да пасіненьня твараў. Дырэктар — лысы біцюг зь вялізным, што зьвісаў праз пас, жыватом і азызлым, колеру сьвежага мяса тварам, увечары заходзіў да нас і казаў толькі адно слова. Забярыце! Я не хадзіў забіраць Кіма Тодаравіча. Яго валаклі па вашкольных калідорах Генадзь Чэх і Валодзя Паненка, бо іх часам запрашалі на папойкі, а астатнім не прапаноўвалі. Вось хлопцы й адпрацоўвалі. Дырэктар тым часам ішоў дамоў. Унурыўшы галаву, зь якой зьвісалі доўгія белыя пасмы, якімі, калі быў цьвярозы, ён спрабаваў прыкаваць лысіну. Дырэктар цяжкім крокам сунуўся па вуліцы і ў гэты момант рабіўся надзвва падобны да майго роднага дзядзькі, бацькавага брата Юзіка, які таксама быў дырэктарам вясковай школы й выкладаў фізыку.

На пахаваньні сваёй маці, маёй бабы Броні, дзядзька Юзік, расчырванелы й разьмяклы ад гарэлкі, курыў каля незачыненай хаты. «А мне што? Маё жыцьцё яснае. Грыбы, ягады, рэчка. Набяром харчоў пабольш і на рэчку. Паляжу на сонцы, апаласнуся, паем смачна. Што мне трэба! А нічога ня трэба! А бацька ваш усё нечага дамагаецца, некуды лезе, нештa ўсё давесьці хоча... Каму? Вось ты мастак, правільна, і думаеш, што будзеш маляваць што захочаш. Хвігу! Вось глядзі. Цукерка. А на абгортцы напісана «50 год БССР». Што партыя скажа, тое й будзеш маляваць. Яны там пасядзяць у кабінэтах, прыдумаюць, і табе толькі застанецца заданьне выконваць. А не захочаш, нагою пад сраку. Галодных мастакоў хапае».

У нечым дзядзька Юзік меў рацыю. Бо дырэктар школы ў Латыгалі за тое, што мы месяц у яго жылі, запатрабаваў зрабіць пано. Зь нейкага часопіса, накшталт «Палітінфарматар і агітатар», ён выскуб малюнак: тры постаці, два мужчыны й адна жанчына, якая аддалена нагадвала Мікелянджэлаўскую сібілу. Камуністычная тройца трымала ў руках сымбалі прагрэсу. Сібіла ўздымала макет спадарожніка, на якім сабакі лёталі ў космас. Адзін мужчына трымаў цыркуль, чамусьці вялікі, нібыта зьбіраўся крэсьліць крэйдавыя кругі на школьнай дошцы, а другі трымаў транспарцір, таксама вялікі, школьны. Лепшай рэчы не прыдумаеш. І градусы ёсьць. Шкада, што ня тыя, якія так любілі дырэктар з Кімам Тодаравічам. Праз гэтае кандовае пано я ледзь не атрымаў па мардасах.

Ёсьць дурная завядзёнка ў беларускай вясковай моладзі — біць-таўчы нетутэйшых. І робяць вяскоўцы сваю непрыгожую справу ў апошні вечар перад ад'ездам чужынцаў. Хлопцы нашыя былі вучаныя, таму й падманулі вясковых даўбакоў. Сказалі, што зьедуць першага, а аўтобус прыйшоў на тры дні раней. Усе пагрузіліся, і бывай, гасьцінная вёска Латыголь. А я з Кімам Жэрдкам застаўся, каб скончыць агітацыйнае пано. Скончылі й пакостам пакрылі, каб блішчала, як начальства любіць. Прымацавалі да сьцяны. Бляск, здалёк відаць! У дырэктара ўзьняўся настрой, і ён павёў Жэрдку ў апартамэнты, а мне сказаў, што я павінен быць цьвярозы, каб затарабаніць свайго выкладчыка ў Менск. «Мяне б не давёз. Ува мне шэсьць пудоў жывой вагі! А Кім ваш, камуністычны інтэрнацыянал молодзі, драбната, кіляграмаў пяцьдзесят. Ты яго да самай сталіцы данесьці зможаш. Але не сумуй. Дам я вам каня, каб раніцай да чыгункі падкінуў». Каня ён даў, не падмануў.

Але да раніцы трэба было ноч перажыць. Мае рэчы паехалі ў Менск, і мне зусім не было чаго рабіць, я бадзяўся па апусьцелай і гулкай, як бочка, школе. У незачыненым піянэрскім пакоі знайшлася цэлая падшыўка часопіса «Беларусь». На адной з каляровых крэйдаваных уставак я ўбачыў рэпрадукцыю Кіма Тодаравіча.

Працяг на старонцы 4

Юры Гумянюк



ЛЁС

Калі зраблюся белы, як мярцьвяк,
і літары расшарпаюць мой чэрап —
усім скажу: «Нікому я ня веру»,
па-над руінамі ўздымуся, нібы птах.

Гадзіньнік абыякава «цік-так»
адмерыць час драпежнікам-хімэрам,
нашчадак старажытнага Гамэра —
Грэк Зорба — мне зайграе жвава ў тахт.

Тады ўзьбяруся на вялізны Эвэрэст
і, патануўшы ў сонечным напоі,
я выстралю атручаным набоем,
каб выказаць кумірам свой пратэст.

І мне ўсёроўна: Д'ябал ці Хрыстос
па сьмерці вырашыць мой лёс.

ПОЎНЯ

Па закрэсьленым шкле
твае вусны плывуць, нібы зімнія хвалі.
Я ў малочнай імгле.
Не паверыш, мяне ўжо даўно пахавалі.

Пачарнеў далягляд,
легіёны крыжоў... Зноў вандруе ў нябесах.
Сонца — толькі фасад.
Поўня ведае сэнс і пануе над лёсам.

Паміраюць дамы,
бо заплюшчваюць хутка маркотныя вочы.
Дзе знаходзімся мы?
Адказаць на пытаньне ніхто нам ня хоча.

ВЕЧАРОВАЯ САНАТА

1. Каменнае скляпеньне чакае свайго гаспадара ля восеньскага лесу, калыхаецца ў вечаровай імгле, падае нікому не вядомыя знакі.

2. Знакі ператвараюцца і паўзуць чырвонымі нэонавымі зьмеямі паўз старыя могілкі, зіхацяць на струхнелых крыжах і амшэлых мармуровых плітах.

3. Часам выбухае беспадстаўны сьмех, парнафанічныя гукі, арганныя мэлёдыі.

4. Потым усё пераходзіць у іншае вымярэньне, і на галаву ліецца бязьлітасная какафонія.

5. Галава пачынае хітацца на плячах.

6. Ліхтары плывуць па паркалёваму небу, нібы пунсовыя хмары, запаленыя агнявым вілом заходзячага сонца.

7. Цела дрыжыць і прагне асалоды, адзінага імгненьня, каб адыйсьці ў забыцьцё і застацца тамака назаўжды сярод касьмічнае мэлёдыі.

ПРЫЗНАЧЭНЬНЕ

Нас не сустрэнуць ніколі нябёсы.
Мы пацячэм з вышыні шэрых гмахаў
цалкам жывыя, сьветлавалосыя,
белыя вязьні няявыклага страху.

Быццам дажджынкі ў калюжынах нафты
створым дзяржаву сапраўдных каханкаў.
Хай пазайздросьціць нам Хлоя і Дафніс,
нават сьпірытус у бацькавай шклянцы.

Нас не заўважаць сівыя пачвары,
мы абмінем па чарзе габінэты,
каб павыцягваць мільёны сакрэтаў,
у неба даслаць запаветныя мары.

ПРАГУЛЯНКА МАРКІЗА ДЭ САДА

Маркіз дэ Сад шпацыраваў па навакольлі,
распавядаў кабетам пра пінгвінаў.
Ну а жанчыны трызьнілі Купальлем,
як прэзыдэнты плачуць ля мартэнаў.

На тое вось яны і прэзыдэнты,
расчырванелыя, бы прысак, экстрасэнсы.
Ня тое, што фашысты-акупанты,
а проста прайдзісьветы Санчы Пансы.

Жывуць яны ў Садоміі далёкай,
дзе лётаюць аблокі-цэпэліны.
Там ладзяць аўтаматы недарэкаў.
І птушкі выраблююць габэлены.

З нагоды юбілею ягамосьці
фахоўцы змайстравалі агрэгаты,
каб сам маркіз ня змог ужо прапасьці
зьніштожыць на Зямлі ўсе інстытуты.

Бо ён аматар штучных мацыёнаў,
наўмысны мастурбатар-канспіратар,
цнатлівы дзеяч, бацька балаганаў,
сын прэзыдэнтаў, ладны экзэкутар.

А шпацыр — гэта існая праблема,
паштоўка ад пінгвінаў з Антарктыды,
нібы матыў паэзіі Тувіма,
дзясятая бляхада Ленінграда.

ШПАЦЫР

Кроў блакітная струменіць...
Вусны чорныя маўчаць...
Нарадзіцца ў Бэтлееме,
у Гародні — спачываць.

Ноччу крочыць па бульвару,
вымаўляць: — Ёсьць лічба «3».
І нэйлёнавыя чары
напускаць на ліхтары.

Каб забыцца на хвіліну,
на падлозе адпачыць
ды містычную жанчыну
да мастацтва далучыць...

МЛОСЬЦІ

Працяг са старонкі 3

«За родную зямлю» — так узьнёсла называўся твор. І мне зрабілася ясна, чаму так любіў паўтараць Кім Жэрдка: вучыцеся ў раньніх італьянцаў. Конь белы, здаровы, асьветлены вечаровым, а можа й ранішнім, карацей, нізкім сонцам. Скакун быў яўна ў сваяцкіх адносінах з канём 1456 года нараджэньня. Праўда, замест Ніколы да Таленціна на ім сядзеў будзёнавец у востраdзюбай шапцы, азоранай пяцікапцовым чырвоным знакам. А-а. Вучыцеся ў раньніх італьянцаў. Мелася на ўвазе — перамалёўвайце з твораў Паола Учэла. Ясна. Выдатна. Не дарма прагартаў стос часопісаў. Я мог бы, пад настрой, зрабіць яшчэ некалькі адкрыццяў, каб ня грукат у шыбу. «Выходзьце!» У думках я яшчэ згадваў бітву пад Сан-Рамана. Коні, Вершнікі. Дзіды. Сьцягі. Мячы. Сякеры. Іржаньне. Ляскат. Труп у ракурсе... На ганку мяне чакалі. Матацыклы. Ланцугі. Боты. Дзецюкі. Нахабства. Лаянка. Зьдзіўленьне. Запытальныя позіркі. Загад. «Кліч астатніх!» А я адзін. «Як адзін?» У школьныя дзьверы ўскочыў дробненькі падшыванец з пысаю ўслужлівага пацука. Нікога! «А дзе ўсе?» У Менску. Бойкі не адбылося, біць аднаго вясковыя бэйбусы не захацелі. Яны запрасілі мяне выпіць. І я ўліў, увагнаў у сябе тры стограмовікі сівой самагонкі. Закусвалі салам, шырокім, на чатыры пальцы, і цыбуляю, якую тыцкалі ў насыпаную на газэціне соль.

Як мне нараніцу было кепска! Жах! І яшчэ сонца. Бязьлітасная гарачыня. І конь, які ня йшоў, а валокся. Мёртвы ад п'янства Кім Тодаравіч ляжаў у саломе на возе. А мы з фурманам ішлі побач. Я маліў Бога, каб фурман перастаў гаварыць і безь ягонай балбатні галава пухла. На станцыі я зьбегаў па квіткі, і мы разам з фурманам завалаклі раскіслае цела выкладчыка ў вагон. «Да Маладэчна працьверазее!» — абнадзеіў мяне фурман на разьвітаньне, і дарма. Не ачомаўся камуністычны інтэрнацыянал моладзі да Маладэчна, дзе давялося ляснуць яго па шчацэ, каб хоць з вагону выпаўз. Дзе там! Вывалак я яго на пэрон і паставіў каля плоту. А сам пабег па квіткі. Прыбягаю назад, а ён ляжыць на зямлі, скруціўся, як кот, у клубок, сьпіць, а над ім два міліцыянты спрачаюцца, каму зь іх весьці п'янога ў выцьвярэзьнік. Яны, мусіць, крышачку ўзрадаваліся, каля я падыйшоў і пачаў прасіць не чапаць майго выкладчыка. Каму ахвота з п'яным валэндацца. «Каб праз хвіліну вас тут не было!» Міліцыянты сыйшлі, а я пад пільнымі позіркамі пасажыраў павалок утрупянелага настаўніка ў электрычку. На дашчанай лаўцы я ўздыхнуў з палёгкаю. Людзей было мала, і Кім Тодаравіч мог ціхамірна храпсьці, адзін на цэлыя тры месцы. Толькі чым бліжэй да Менску, тым пасажыраў больш, ты ж ведаеш. І вось у Заслаўі Кім Жэрдка ўжо спаў седзячы, прыціснуты маім плечуком да сьцяны, каб не паваліўся на кабет, што злосна касавурыліся на нас. А ў Зялёным адбылося «уваскрашэньне зь мёртвых». Імгненнае цудадзейства. Кім лыпнуў вачыма, здрыгануўся і ажыў. Лепш бы ён спаў, лепш бы ён нарабіў сабе ў порткі, чым пачаў заляцацца да румяных таўстух, што кпілі зь яго й мяне. «А праўда, вы мастак? Гы-гы!» Жывёліны. Раскормленыя, непадмытыя скаціны. Я ня буду казаць, чым патыхала ад Кіма Тодаравіча, але ад істотаў у спадніцах цягнула іржавым селядцом. Калі б Кім Жэрдка курыў, я б выйшаў зь ім у тамбур. Але ён не курыў. «Лепш выпіць сто грамаў, чым каўтаць дым». Сэнтэнцыя, пастулят, якога прытрымліваўся яшчэ адзін выкладчык з нашае мастацкае вучэльні, Уладзімер Бароўка. І што? Згарэў! Самым натуральным чынам згарэў у майстэрні. Адчышчаў ацэтонам уфэнданую ў алейную фарбу калашыну. А быў ужо вечар, і прапала электрычнасьць, і Уладзімер Бароўка пасьвяціў сабе запалкаю. Ці адчысьцілася калашына? Паходня! Крык! Не пасьпелі ўратаваць. Судмэдэкспэртыза пацьвердзіла развагі пляткароў. Бароўка быў нецьвярозы. Вось табе й лепей сто грамаў.

Лепш бы яны курылі, тады б я прапанаваў Кіму Тодаравічу цыгарэту. Натуральна выглядала б. Толькі й я тады не курыў, я чырванеў ад брыдкасьці гэтых беспэрспэктыўных заляцаньняў аж да Менску-пасажырскага. З вакзалу мы пайшлі ў гастраном і набылі дзьве пляшкі «Вермуту». Ня змог я нічога зрабіць! Калі такім вермутам абліць нагавіцы, дык ніякі ацэтон ня возьме. З чаго яго рабілі? З нафты? А чаму не, штучную чорную ікру рабілі з нафты. І елі людзі, і я еў... Плястмасай крыху аддае, але, калі пасыпаць буйной сольлю, можна й заглынуць, як той вермут. Заплюшчваеш вочы і, не адрываючыся, уліваеш у сябе бутэльку цалкам. Ня дай Бог, спынісься, другі раз ня зможаш да роту данесьці — фантан пусьціш, выверне. Так і вывернула Кіма Тодаравіча Жэрдку. Ну, і бываюць жа прозьвішчы! Жэрдка! Ну, якое ён мае дачыненьне да жэрдкі? У ім жа росту ўсяго якіх паўтара мэтра з хвосьцікам. Не пайшло! Кім выцер насоўкай рот і з сумам паглядзеў на цёмную лужыну, якую ўсмоктваў пясок прывакзальнага двара. А ў мяне зайшло. І толькі час ад часу спрабавала выйсьці, пакуль, спатыкаючыся, мы брылі да дому Кіма Тодаравіча. «Якая ў мяне жонка? Камень, не чалавек. Мы аднойчы кілямэтраў трыццаць прайшлі. Яна калі разулася, дык у чаравіках поўна крыві было, і не паскардзілася нават». Жонка Кіма Жэрдкі — шэрая сухая жанчына з пляскатым расейскім тварыкам адчыніла кватэру. «Ізноў!» На яе канстатацыю факта я замест прывітальных сказануў разьвітальныя словы. А вось дамоў я пайсьці ня змог. Куды ў такім выглядзе пойдзеш? Маці шкада! Месяц дома ня быў, а тут зьявіўся й ледзь стаіш. І смурод з роту верне.

«Які ты зялёны!» — у інтэрнацкім пакоі мяне сустрэў Паненка. «Я тут пасплю». «Сьпі, вунь ложак Карпіка вольны». А пасярод ночы я прахапіўся. Са сьцяны на мяне сыпалася шкло ад пабітых шклянак і пляшак. Ігар Дручко гуляў. Ён вучыўся на афарміцельскім аддзя-

ЭРАС БЕЛАРУСКІ

Ксэракс беларускі. — Полацак: Полацкая ляда, 1994, № 5.

У часы, калі ў адраджэнскіх колах ідуць апантаныя дыскусіі пра перавагу «пэйдж мэйкера» над «вэнтурай» і «Эпла» над «АйБіЭмам», Ксэракс Беларускі набыў асаблівы шарм. Сьціплы машынапіс, адбіты на ратапрынце, шэрыя старонкі, белая вокладка зь дзіцячымі каракулямі, — усё гэта ўспрымаецца ўжо як эстэцкая рэмінісцэнцыя над даўна мінулымі часамі «забароненых» выданьняў. А калі дадаць да гэтага відавочныя алюзіі на «Дудку беларускую», «Смык беларускі» й г.д., Ксэракс можна сьмела абвяшчаць «кузьняй» беларускага постмадэрну. Зьмест апошняга, пятага нумару паказвае, што слова «постмадэрн» тут зусім невыпадковае.

У гэтым нумары Алесь Аркуш разьвітваецца з соцартам, Вінцэсь Мудроў падае фрагмэнт жыцьцяпісу ката Барыса, Сяржук Сокалаў-Воюш дэбютуе ў якасьці эротазнаўцы-мэдыевіста, а Славамір Адамовіч закрывае тэму альтруізму ў беларускай літаратуры. Увесь нумар працяты тэмай эрасу і сканчаецца грунтоўным падсумаваньнем Ігара Сідарука. Эрас беларускі ў полацкай інтэрпрэтацыі набывае нарэшце шматвымернасьць і глыбіню й выводзіць беларускае пісьменства з сэксуальнага гета, у якое яно было заганае Глёбусавымі «Дамавікамі». Глёбус спрабаваў дасягнуць пэўнага эфэкту на кантрасьце халоднае канструктывісцкае тэхнікі пісьма й «гарачае» тэматыкі. Полацкая эратычная школа настойвае на адваротным: гарачая эратычная тэхніка й халодна-мройныя аб’екты пісьменства. Характэрным прыкладам гэтага падыходу ёсьць «Альтруістычнае» Славаміра Адамовіча:

Калі мне пачалі даваць,
я ўжо быў сыты,
але не адмаўляў, хаця
быў як спавіты
ці то сном летаргічным, ці
сусьветнай комай.
Я быў, як вецер у трысьці,
засьпеты стомай.
Мне не хацелася, каб так,
што дазарэзу.
Я ціха тлеў, я траціў смак,
і нават рэзус
мяняла кроў мая ўва мне
спакойна, ўпарта,
і мне было, як на вайне
ці ў кнігах Сартра —
нудотна, брыдка, а рабі.
І я стараўся
араць глыбока плоць ральлі,
цягаў каменьні
на грудзі крушняў, а калі
яны казалі: досыць, досыць! —
я заціхаў і слухаў шэпт
гарачых вуснаў.
Удзячны шэпт.

Застаецца адзначыць яшчэ, што «Пан і Надэ» Сокалава-Воюша, выраблене «паводле французкага сярэдневяковага фарсу», рызыкуе стацца ўзорным тэкстам беларускага постмадэрну. Гэта нават ужо ня «знак», а «знак знаку» рэчаіснасьці. А можа нават «знак знаку знаку». Сокалаў-Воюш апэлюе да «французкага фарсу», фарс самы мае на мэце апэляцыю да «куртуазнай культуры». Для рэчаіснасьці ў гэтым ланцужку месца ўжо амаль не застаецца.

З чым мы й віншуем беларускую літаратуру.

Стывэн Д.

ПАСЬЛЯ ГІСТОРЫІ

Krasnogruda. Narody. Kultury. Małe ojczyzny Europy środkowo-wschodniej. Sejny, jesień, 93 nr 1.

Пісаць водгук на пэрыядычнае выданьне — досыць няўдзячная рэч, бо ў бальшыні выпадкаў яны (пэр. выд.) самыя ёсьць водгукам на нешта. Выратавальнае колца ў гэткай сытуацыі знаходзіцца, тым ня менш, досыць лёгка, — варта ісьці праз заяўленую прастору да ейных каранёў, рэцэнзаваць ня тое, *што* патрапіла сказацца, а тое, *адкуль* гэта гаворыцца.

У дадзеным выпадку гутарка пра фэномэн Сярэдня-Ўсходняе Эўропы. Беларусь толькі падымаецца да ўсьведамленьня істотнасьці гэтае зьявы. Можна нават сказаць, што Беларусь штучна выштурхоўваецца ў гэтую прастору — як тупым культурным імпэрыялізмам Расеі, так і культурнай абыякавасьцю Захаду. Тое, што ў савецкія часы выглядала прыгожай утопіяй, мітам альбо нават інтэлектуальнай зброяй (як Кундэрава «Сярэдняя Эўропа»), сёньня бачыцца натуральным кантэкстам, што патрабуе ня столькі развагаў, колькі актыўнасьці, дыялёгу, — праектаў.

«Краснагруда» — адзін з гэтых праектаў. Першы нумар прапануе нам шырокую панараму сярэдне- і ўсходнеэўрапейскіх аўтараў, паасобку вядомых і чытаных, але ўпершыню сабраных разам, пад адной вокладкай. Тут ёсьць Мілаш (куды ж безь яго) і Крутвор, Яновіч і Арлоў, Кекштас і Кановіч. Тут ёсьць інфармацыя пра культурныя асяродкі й фундацыі, праекты й ідэі. Усё гэта ня мае асаблівай «прычасанасьці» пад пэўную канцэпцыю ці галоўную ідэю. Затое ёсьць адчуваньне рэчаіснасьці.

Характэрнаю рысаю «Краснагруды» ёсьць ейны агістарызм. Хіба што ўпершыню за цэнтральна-ўсходнеэўрапейскі праект бярэцца не гісторыкі. Гэта дорыць пэўныя спадзяваньні. Бо так абрыдлі ўжо гэтыя «вельмі сур’ёзныя» спрэчкі — чыё было Вялікае Княства, альбо што лепей: навуковасьць ці патрыятызм. Нарэшце можна спакойна заўважыць, са *свайго* месца — лепш *экзыстэнцыя* й *культура*.

«Краснагруда» — гэта толькі пачатак.

Стывэн Д.

БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ГІПЭРТЭКСТ

Энцыклапэдыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.1. А—Беліца. — Менск: Беларуская Энцыклапэдыя, 1993. — 494 с., [8]к.: іл.

Гартаць такую Энцыклапэдыю — акурат працаваць на кампутары. Праз словы-ключы трапляеш з аднаго артыкула ў зусім іншы — як на дысплеі можна выйсьці з аднога тэкставага вакна ў другое. Гэта рэалізаваная мадэль гіпэртэксту.

Беларускі гістарычны гіпэртэкст ведае зусім нечаканыя зьмены сюжэтаў — нібы гэта розныя беларускія гісторыі. Гісторыяграфічныя дыскусіі апошняга дзесяцігодзьдзя ўзмацнілі найбольш менавіта прыкладны блёк Энцыклапэдыі — крыніцазнаўства, археаграфію, картаграфію, генэалёгію, геральдыку. Досыць грунтоўнымі сталіся матэрыялы па найсучаснай гісторыі. Але Энцыклапэдыя яшчэ паслугоўваецца чужымі гістарычнымі тэрмінамі — да прыкладу «Айчынная вайна 1812 г.», гэткае ж яшчэ й зіхаценьне зорак — на пагонах і фрэнчах. У Беларускую гістарычную энцыклапэдыю трапляюць людзі, якія нарадзіліся за Ўралам, але бралі ўдзел у выгнаньні нямецкіх захопнікааў з тэрыторыі Беларусі падчас Другой сусьветнай вайны. Для нас істотна, што заканчэньне фашыстоўскай акупацыі азначала працяг савецкай. У такім разе, каб была вытрыманая лягічнасьць падыходаў, мы павінны ў наступным томе Энцыклапэдыі ўбачыць партрэт фэльдмаршала Гудэрыяна...

Вынікае, што рэдакцыя хоча назваць у Беларускай гістарычнай энцыклапэдыі ўсіх прыкметных асобаў, што так ці інакш зьвязаныя зь гісторыяй Беларусі. Але па-першае, ёсьць яўны прапарцыйны перакос у бок прасавецкіх дзеячоў. Па-другое, усё павінна быць названа сваімі імёнамі: камуністычны сакратар райкаму такі ж прадстаўнік акупацыйнай адміністрацыі, як і нацысцкі ортскамісар. Ёсьць і адрозьненьні — іншы антураж, іншая (але усё роўна ня наша) мова, іншыя мундзіры. Гэтыя адрозьненьні толькі адцяняюць тыпалягічныя падабенствы. Прынцып вызначэньня тэрмінаў паводле іх «саманазоваў» прыглушае эклектычнае стракаценьне інфармацыі, але не пазбаўляе яе разнастайнасьці. І мы зноў за спраўным кампутарам.

Ян Грэчыц

НАШ ТЭЎТОНСКІ ОРДЭН

Краўцэвіч Алесь. Тэўтонскі ордэн: Ад Ерусаліма да Грунвальда. — Менск: Навука і тэхніка, 1993. — 46 с.: іл.

Гэтая кніжка — праява таго, што на Беларусі замацоўваецца кампэтэнтная навукова-папулярная літаратура. Пра кампэтэнтнасьць і навуковасьць сьведчыць: 1. выверанасьць тэрмінаў; 2. здольнасьць паказаць розныя канцэпцыі; 3. не апалягетычная (для беларускага боку) накіраванасьць кніжкі. У выніку дадзеныя прынцыпы ствараюць «-папулярнасць», але ня нейкае адмысловае спрошчваньне зьместу, каналізаваньне канвы.

Падобна, што даўняя спрэчка ў навукова-папулярным жанры паміж «пісьменьнікамі» і «прафэсіяналамі» вырашаецца на карысьць апошніх.

Кніжка вельмі сучасная паводле свайго камплектаваньня, таму што ўлічвае дамінацыю ў канцы XX ст. відэакультуры. Аўтар імкнецца сфармаваць ілюстрацыйны блёк, які можна гартаць сам па сабе. Толькі вось як Давыд Гарадзенскі на ўздыбленым кані так гарызантальна трымае цяжкі меч?

І яшчэ. Аўтар «крыху» сымпатызуе тэўтонам — яны фактар нашае гісторыі. Акрамя мілітарнай яшчэ й гаспадарчай, лінгвістычнай — таму мы маем падставы для выбару паміж тэрмінамі Грунвальд і Дуброўна. Гэта гісторыя акрамя ўсяго рамантычная. Тут шмат месца асабістым учынкам, а ня толькі ўзброеным натоўпам. І ліцьвіны былі там пераможцамі.

Ян Грэчыц

леньні, ім ужо выставілі адзнакі за практыку, таму Дручко з чыстым сумленьнем мог пусьціцца ў загул. Ён і пусьціўся; набраў піва, гарэлкі й шампанскага, напаіў Генадзя Чэха, Валодзю Паненку й напіўся сам. Мяне не дабудзіліся. Як піць-гуляць, дык не змаглі раскатурхаць, а як бутэлькі аб сьцяну лупіць — Вова, уставай. Дручко — барадаты дзяцюк, быў старэйшы за мяне гадоў на дзесяць, і ягоная творчая біяграфія складалася ня толькі з чаканак і малюнкаў. У школе гэты бык займаўся боксам і нават заняў другое месца ў Гомельскай вобласьці. Колькі ж трэба натаўчы ў чалавечы нос?! А пасьля кінуў бокс, пачаў чаканкі дзяўбсьці, паступіў у маскоўскую мастацкую вучэльню, але там чамусьці ўспомніў папярэдняе захапленьне й раскрышыў выкладчыцкую пашчэнку. Пасьля турмы Дручко ня змог аднавіцца ў Маскве, а ў Менску яго пашкадавалі. Калі па праўдзе, чалавек ён добры, але як залье за каўнер — магіла, чорныя вочы. Дручко станавіўся на галаву, каб злосьці набрацца, а потым крушыў усё, да чаго дацягваліся яго кулакі. З засыпанага шклом ложка я ўскочыў, але сварыцца ня стаў. Хай лепш бутэлькі разьбіваюцца аб сьцены, чым аб маю хворую галаву. Паненка неяк угаварыў Дручко легчы спаць, у яго быў талент угаворваць, асабліва дзяўчат. А мне з Чэхам давялося прыбіраць пакой. Чэх не захацеў класьціся, і мы па пустым праспэкце пашыбавалі ў мастацкую вучэльню.

Вахцёрка ўставіла пратэз верхніх зубоў і, не адчыняючы дзьвярэй, прашамкала нам нецэнзурнасьці ў зашклёныя твары. На праспэкце запрашальна разявіліся дзьверы цырульні. Чэх прапанаваў, а я хітнуў нячэсанай тры дні галавою. Маладыя людзі, і ці можна так не глядзець на сваю галаву. Чэх не расчэсваў і ня мыў доўгія, у сасулькі, валасы, мусіць месяц. Зь ім такое здаралася. Бзік? А можа, сілу волі й моц духу выпрабоўваў? Ён быў чалавек замкнёны ў сабе. Яго справа. А вось гіпсавая пасьмяротная маска Пушкіна й гіпсавая прыжыцьцёвая маска Генадзя Чэха, што віселі каля ягонага ложка на цьвіках, мяне раздражнялі, бо на абодвух тварах чырвонай фарбаю былі намаляваныя прышчы. Брыдота несусьветная, асабліва гідка было глядзець на прышчаватага Пушкіна.

Псаваць гіпсы ў мастацкай вучэльні было справай гонару. Колькі іх, мёртвых галоваў, стаяла на паліцах у кладоўцы, якую ахоўваў адстаўны вайсковец у мышыным халаце — Тырдан. Прозьвішча такое. Ён выдаваў іх пад росьпіс старасты групы. І бедныя старасты расплочваліся з Тырданам за адбітыя насы й вушы, за размаляваныя вочы й вусны. Вэнэры, Сакраты, Давіды, Вальтэры, Гатамэлаты, гудонаўскія торсы бяз скуры, галовы лупавокіх коней... Гіпс — сымбаль мастацкай вучэльні. Мёртвы акадэмічны матэрыял! Ад яго зыходзіць эфірны халадок сьмерці. Што можа быць больш антыэстэтычнае за гіпсавую галоўку Нэфэрціці? Хіба што толькі маска Апалёна. А былі ж, былі аматары маляваць гіпс. Не, не шары й піраміды з торамі, а менавіта галовы й торсы. Іх натхняў мастак-спартовец Луцэўскі, загарэлы, каротка стрыжаны, жорсткі. Ён патрабаваў на праглядзе ставіць двойкі ўсім, хто не любіў маляваць гіпсы, а потым ехаў на ровары займацца каратэ, прынцыповы чалавек. Толькі ў нашай групе ён не выкладаў, і мы не любілі гіпсавага раба Мікелянджэла. У знак пратэсту я чырвонай фарбаю пакрыў рабскі чэлес і машонку. Луцэўскі віішчаў. «Знайсьці й выгнаць, выключыць бяз права аднаўленьня!» Як жа, знойдзеш... А каб хацелі, маглі б і знайсьці. Малюю блакітныя вочы гіпсавым галовам, і гіпс — жывы. Быў жа такі вершык, зьмешчаны на старонках «Маладосьці» пад маім набычаным фотаздымкам. У маладосьці я чамусьці, калі хацеў зрабіць сур’ёзны выгляд, набычваўся, як набычваўся і ў цырульнях.

З-пад ілба я глядзеў, як абстрыглі маю й Чэхаву галовы «пад нуль». Пагладжваючы й пачэсваючы нязвыкла круглыя галовы, мы вярнуліся ў вучэльню.

За практыку і я, і Генадзь атрымалі пяцёркі. Хоць пра эцюды лепш ня згадваць, звычайная брудна-зялёная алейная фуза на маленькіх кардонках і палотнах. Кусты, дрэвы, хаты, царква, каза, конь... Не пішыце сьветлыя нябёсы. Гляньце, каза ўсё ж сьвятлейшая за аблокі. П’яненькі Кім Тодаравіч тыцкаў канцом алоўка ў бок недаравальна белага казьляняці, таму на большасьці эцюдаў неба атрымалася сьвінцовае, а дробны й буйны рагаты скот — гіпсавы.

Іншыя эцюды мы прывезьлі з Раўбічаў пасьля трэцяга курсу. Замест Кіма Жэрдкі нам прызначылі ў выкладчыкі Галіну Гласаву — мастачку-маржа. Раніцамі, да заняткаў, Гласава ў любое надвор’е бегла на рэчку й апускала сваё неабдымнае цела ў хвалі Сьвіслачы. Яе сувязі ў спартовым сьвеце й дазволілі нашай групе пасяліцца ў Раўбічах, у двухпавярховым акуратным гатэлі, вокны якога пазіралі на высозныя лыжныя трампліны й на шыкоўны, пад чырвонай дахавіцаю, другі гатэль — для абраных. Гласава, вядома — абраная, жыла пад яркай дахавіцаю, а мы неабраныя, пад рубэроідным пляскатым дахам. Праўда, абедалі мы разам у рэстарацыі, ва ўтульнай залі з камінам і дубовымі сталамі. Мурзатыя афіцыянткі нас не любілі, але трывалі, як ня самае вялікае зло на сьвеце. Мастакі — не трактарысты, якія часам завітвалі пасмактаць піва ў рэстарацыі для абраных. За сталы трактарыстаў не садзілі, яны, стоячы ў фае, смакталі сваё піва з рыльца й незадаволена паглядалі на нас. А мне было з найвышэйшай трампліновай прыступкі напляваць на хабёльскую незадаволенасьць раўбіцкіх пралетарыяў. Я іх не хацеў бачыць і рабіў выгляд, што ня бачу й ня чую народных жартаў. «Любка, а ці праўда, што мастакі ўчора каля рэчкі тваю голую дупу малявалі?»

Працяг на старонцы 6

Віцебск. Часопіс. Бахцін.

Валянцін Акудовіч

Диалог. Карнавал. Хронотоп. — Віцебск: Выдавецтва Віцебскага пэдінстытуту №1 — 1992, №2 — 1993.

Віцебск — гэта Беларусь безь Беларусі, «адкрытая культурная зона», мяжа ўсяго з усім, дзе «нашае», топабыційнае згорнутае ў маргіналію этнаграфічнага дзіва і ўжо адно ў якасьці гэтага дзіва роўніцца зь іншымі дзівосамі, што досыць памяркоўна хаўрусуюцца тут між сабой.

Віцебск (у спрыяльных для яго гістарычных умовах) дэманструе нам, якой магла б быць уся Беларусь, калі б не было *Беларусі* (зусім): у адным *хранатопе дыялёг* «славянскага базару» з эўрапейскай *карнавальнай* традыцыяй...

Гэта ўжо іншая рэч, *што* ў нас саміх паўстае супраць такой Беларусі, дзе на адной вуліцы ў адну пару ганарова шпацыруюць у блакітную вечнасьць Шагал, Бахцін, Малевіч, Кандзінскі, Салерцінскі, Юдзіна... а тутэйшы месьціч тужліва туліцца да прыцемку сьцяны.. Гэта ўжо іншая рэч, *чаму* нам не даспадобы такая вось «карнавальна-базарная» Беларусь і *што* нас мусіць шукаць, выдумляць, ладзіць нейкую іншую... Якую?

Але не пра гэта цяпер гаворка.

Зьяўленьне пэрыядычнага часопіса («Диалог. Карнавал. Хронотоп» плянаваўся як квартальнік), цалкам прысьвечанага адной постаці (расейскаму філёзафу эўрапейскага кшталту Міхаілу Бахціну), у якім заўгодна горадзе Беларусі сёньня сапраўды выглядала б на дзіва... У якім заўгодна, але ня ў Віцебску... (Што, натуральна, не зьмяншае павагі да тых людзей, якія вымагаюцца, каб рэалізаваць гэты праект.)

Але акрамя, так бы мовіць, онталягічнай магчымасьці, прытоенай у фэномэне места, была й рэальная падстава для такога выданьня менавіта тут. Бахцін жыў у Віцебску з 1920 па 1925 год. Якраз у «віцебскі» пэрыяд, уласна філязофскі пэрыяд творчасьці Бахціна (пазьней «філязофія» ў яго будзе пераважна запакаваная ў літаратуразнаўства), сфармаваліся пачаткі ці ня большасьці тых канцэптуальных ідэй, якія потым будуць разгортвацца на працягу ўсёй творчасьці. І найперш — «культура мяжы», культура, як тое, што адбываецца, выяўляе сябе адно на мяжы ў *дыялёгу* (Бахцін тады яшчэ не ўжываў гэтага апорнага для яго слова-філязафэмы) з *другой* («другі» — яшчэ адно зь яго базавых слоў-філязафэм) культурай.

Ня станем спрошчваць і казаць, што ўладкаваны на памежжы культураў ды ідэалягічна запачаткаваны на дыялёгу з кожным як з другім Віцебск неяк непасрэдна паўплываў на фармаваньне сьветаглядных канцэптаў Бахціна. Але й зусім выключаць фактар места (прысутнасьці быцьця ў чалавеку, як *падзеі быцьця*), напэўна, было б таксама залішне катэгарычна...

Што да самога часопіса «навуковых росшукаў пра біяграфію, тэарэтычную спадчыну і эпоху Міхаіла Бахціна», то тыя два нумары, якія мы маем на руках, яшчэ не даюць падставаў для нейкага сур'ёзнага аналізу й акцэнтаваных на нечым высноваў (пакуль даволі таго, што часопіс распачаўся). Адно вось на што хацелася б зьвярнуць увагу. У дэклярацыях, якія папярэднічалі выхаду часопіса, згадвалася, што ён будзе друкавацца і на беларускай мове. А ў другім нумары нават пазначана, што 500 асобнікаў надрукавана па-беларуску. Праўда, ні я, ні мае знаёмцы тых беларускіх асобнікаў ня бачылі, але калі гэта сапраўды так і яны існуюць рэальна — то шкада... дарэмнай працы... Мэханістычны пераклад-калька (а іншае ў Віцебску немагчыма таму, што не магчыма) дзеля нейкіх кан'юнктурных ці хай сабе й «благих» мэтаў нічога не дадасьць беларускасьці, бо беларускасьць гэта ня тое, што ёсьць, а тое, што адбываецца, ня тое, што марнее ў каморцы/архіве, а тое, што дзеецца, выпінае, мусіць...

Так, часопіс узьнік у нашай топакультуры, але не з турбот нацыянальнага духу ён паўстаў, не да праблемаў беларускага мысьленьня ён зьвернуты. Больш за тое, у модулі «Диалога. Карнавала. Хронотопа» не закладзена хаця б магчымасьць *дыялёгу* з культуралягічным дыскурсам Беларусі. І гэта засмучае куды больш, чым мова выданьня ці нічым не ўтаймаваная эклектыка (апошняе, ёсьць надзея, паступова перадолеецца).

У 1905-1911 гг. сям'я Бахціных жыла ў Вільні і Міхаіл вучыўся ў Віленскай першай гімназіі.

МЛОСЬЦІ

Працяг са старонкі 5

«Ты ў мяне піва папросіш. Сцыкунамі сваімі апахмелісься заўтра...»

Каля рэчкі мы малявалі, але зусім не аголеную афіцыянтку Любу, мы пісалі партрэт асьветленага сонцам бадзягі па мянушцы Кілім. Ён прыбіўся да нашае групы ў Менску. Жыў Кілім без пашпарту. На якія грошы? Ніхто ня ведаў. Пасяліўся ў інтэрнаце. Дзяўчаты яго шкадавалі, а ён іх біў. Сьвеце Цыпко, якая папрасіла яго на вуліцы, каля дваццатага гастраному, вярнуць пазыку, Кілім надзеў на галаву сьметніцу, поўную недакуркаў і пляўкоў. Такі быў Кілім. А з хлопцамі ён не канфліктаваў з-за слабога здароўя. Кілімава маці пісала зь Берасьця ў менскія вайсковыя камісарыяты, каб сына забралі ў салдаты, а камісары не маглі знайсьці Кіліма. Хто ж здагадаецца, што прызыўнік працуе натуршчыкам у Раўбічах і сумленна, па тры гадзіны ў дзень, сядзіць каля рэчкі? Увесь астатні час Кілім лавіў рыбу й прыставаў да нашых дзяўчат. Яму адмовілі ўсе, акрамя Марыны Шурман. Пра іх полавы кантакт ніхто б і ня ведаў, каб ня пільнасьць Агафончыка, які, выйшаўшы на вечаровую прабежку, вымушаны быў спыніцца на мосьце праз чыстую, нават ракі вяліся, рачулку без назову. Марына Шурман упіралася рукамі ў парэнчы й вохала, яе аголеныя ногі былі шырока разьведзеныя, а на белых клубах цямнелі загарэлыя лапы Кіліма. Агафончык схапіў каханка за кашулю на сьпіне й адарваў яго ад Марыны. Тая апусьцілася на калені й заплакала. «Мы... Яна сама ўгаварыла... Я з гэтай малпай не хацеў!» Кілім пераступаў нагамі ў спушчаных нагавіцах. Змагар за сацыяльную чысьціню полавых зносін пабіў Кіліма. Страцілі ўсе. Група згубіла натуршчыка. Жахліва непрывабная Марына Шурман — пацучыныя зубкі, тонкія ножкі й шырачэзны пляскаты азадак, чырвоныя й падсьлепаватыя вочы — страціла каханка. Мусіць, таму па вяртаньні ў Менск яна завяла кабяля-баксёра й наталяла страсьці садоміяй. А сам Агафончык, сапсаваўшы трэніроўку, цэлую ноч ня мог заснуць, садзіўся на ложку й гаварыў на ўвесь пакой. «Амаральна! Я на такое глядзець не магу! На мосьце! А ўсім — усё роўна. Гвалт! Разбэшчанасьць!» Хлопцы маўчалі. Ніхто не хацеў чапаць дурачка, чыя творчая кар'ера скончыцца на керамічнай фабрыцы, дзе Агафончык будзе ваяць бідэ й унітазы. На ўсё воля Божая. Мяне зусім не кранулі гэтыя страты. Партрэт Кіліма ў пілотцы я скончыў па памяці. Вінныя ім пяць рублёў сьпісаў на ўласную разяватасьць. А з Марыніных сьлёз пасьмяяўся разам зь Сіўчыкам, можна было пасьмяяцца і з Чэхам, і з Паненкам, але яны не паехалі ў Раўбічы. Яны пацягнулі свае палотны ў родныя вёскі да дзядоў. З астатнімі аднагрупоўцамі сьмяяцца над брыдкай сытуацыяй было небясьпечна.

Ну, хіба можна было сьмяяцца разам з Кулікоўскім — сквапным кабанчыкам, які мог набыць у кнігарні танны альбом Пабла Пікаса, а потым тры дні чакаць, каб той альбом раскупілі, каб павыхваляцца — у мяне ёсьць, а ў вас няма й ня будзе. Што да Пікаса, яго я палюблю пазьней; а на практыцы пасьля трэцяга курсу я захапляўся Эдвардам Мункам, хваравітым скандынавам, з чыіх палотнаў зьдзіўлена пазіралі на сьвет твары тапельцаў. Я спрабаваў падрабляцца пад халоднага паўночнага экспрэсіяніста, маляваў азёры й нявестаў у блакітных доўгіх сукенках, маляваў бясколерную Жану Шук, яе бякла-шарыя вочы й доўгую шыю. У маіх эцюдах панавала маркота й мэлянхолія. Бадзёрай Гласавай мае пошукі не падабаліся, але яна абмяжоўвалася выразамі «фармальныя пошукі» й «юначы пэсымізм». Яна не чапала мяне, і дзякуй ёй за гэта. Дзякуючы Гласавай, я даведаўся, што ў менскім тэатральным інстытуце вучыўся Алег Цалкоў, чые морды-дупы ўсхвалявалі нават парыскіх калекцыянэраў. За пляшкамі чырвонага сухога віна, якіх накуплялі з нагоды заканчэньня практыкі, Гласава й расказала пра Алега Цалкова. Ён вучыўся з Галінай Гласавай у адной групе, на аддзяленьні станковага жывапісу.

Цалкоў насіў пад пахаю францускі альбом з рэпрадукцыямі Ван Гога і ўсім тыцкаў яго пад нос. Вось як трэба пісаць! Шышкін і Рэпін — ідыёты! Алег пісаў пад Ван Гога — і яго выгналі зь менскага інстытуту пасьля другога сэмэстру. А самае дзіўнае ня гэта. З Цалковым адразу было ўсё ясна й зразумела. Разам з Алегам у наш інстытут паступіў яшчэ адзін масквіч — ціхі хлопчык Ігарок. Ён хадзіў у Цалкова за ад'ютанта, але на працах гэтае сяброўства зусім не адбівалася. У Ігарка былі крэпенькія акадэмічныя пастаноўкі й чацьвёрачныя малюнкі. Ігарок скончыў інстытут і вярнуўся ў Маскву. «Я ня бачыла яго гадоў пятнаццаць, а тут раптам сустрэла на вуліцы Горкага каля рэстарана «Валдай». Да мяне падыйшоў салідны зь сівой барадой джэнтэльмэн у шэрым строі. — Галя? Няўжо не пазнаеш? — Пазнаць ціхага Ігара было проста немагчыма. Быў хлопчык, даволі бяздарны хлопчык, а тут эўрапейскі дыплямат, ня менш. Я — Ігар. Мы ж разам шэсьць гадоў правучыліся. — Зайшлі ў «Валдай», і ён за каньячком расказаў, што жаніўся з нашай агульнай знаёмай, натуршчыцай Ірэн, што ўвесь сацыялістычны рэалізм ён забыў і малюе фантастычныя краявіды, прадае іх замежнікам, купіў майстэрню й мэрсэдэс, а цяпер думае перабрацца, як і Алег Цалкоў, у Парыж». Мы ўсе слухалі і, разявіўшыся, глядзелі на Гласаву, пілі сухое віно й закусвалі «пыжамі» — кулінарнае вынаходніцтва Галіны. Звараныя ўкрутую яйкі абіраюцца й разразаюцца роўненька напалам. Жаўток вымаецца, у лунку накладаецца гарчыца й накрываецца жаўтком. А ў роце адбываецца бабах. Можа, ад кіслага віна, можа, ад гарчычных бабахаў, а хутчэй за ўсё, — ад аповедаў пра Ігарка й Алега ў мяне разбалеўся страўнік. Усю апошнюю ноч у Раўбічах я прасядзеў на ўнітазе пад фіялетавай лямпачкай, другіх у пакаёўкі не знайшлося. У прыбіральні й скончылася мая трэцяя практыка.

Калі хочаш, я магу расказаць і пра першую практыку, толькі яна менш рамантычная, бо праходзіла на ўскраінах Менску. Адзіным заданьнем, якое паставіў перад намі сухенькі акуратненькі мастак-плякатыст Трахім Ігнацэвіч, было маляваньне акварэльлю камля. За два дні я вымаляваў сасновую кару на невялікім аркушы, атрымаў ухваленьні Ігнацэвіча й заняўся сваімі ўлюбёнымі аб'ектамі: старымі хатамі й хлявамі, брамамі й платамі, а таксама бульдозэрамі, трактарамі й экскаватарамі. Любоў да вялікіх землекапалак праявілася ў гіпэррэалістычным вымалёўваньні ўсіх зубоў на вялізным каўшы. Экскаватар стаяў пасярод поля, на беразе сьвежае канавы, якая пясчаным шнарам расьсякала зялёную прастору, на ўскраінах якой з аднаго боку бялелі цукровыя кубікі новабудоўлі раёну Зялёны Луг, а з другога — шарэлі дахі асуджанай на зьнішчэньне вёскі. Жанчыну я згледзеў ужо на паўдарозе ад новабудоўлі, яна бегла праз поле, трасучы цяжкімі сумкамі. Яе твар быў белы й перакошаны ці то злосьцю, ці то пакутаю. Мой сполах ператварыўся ў цікаўнасьць, калі ў правай руцэ замест алоўка апынуўся важкі камень. Жанчына далецела да экскаватара, пакідала сумкі каля бліскучага каўша й толькі тады ўгледзела мяне. «А-а-а, глядзі! Я сраць хачу!» І не пасьпеў я адвярнуць галавы, як яна ўскінула спадніцу, сьцягнула майткі і, сагнуўшыся, нават ня сеўшы, абрадавала наваколле траскучымі, нібыта нехта ламаў сухое дрэўца, гукамі. З каменем у руцэ й пляншэтам пад пахаю я хутка пайшоў у бок вёскі. Малюнак давялося скончыць па памяці, вяртацца да экскаватара не хацелася. Трахім Ігнацэвіч, праўда, сказаў, што малюнак занадта схематычны й варта было б папрацаваць над ім. Але ж я ня мог расказаць пра жанчыну, у якой схапіў жывот. Трахім быў чалавек тактоўны, ён не прымаў ірацыянальнага ў жыцьці й мастацтве. Для яго йснавалі пэўныя каноны, якія ніхто ня меў права парушыць.

Цень на самай белай рэчы заўсёды цямнейшы за сьвятло на самай чорнай! Цень, які падае, цямнейшы за ўласны цень! Паміж сьвятлом і ценем, нават на гіпсавым шары, ёсьць канкрэтная вызначальная мяжа! Кантраст паміж сьвятлом і ценем слабне ў залежнасьці ад аддаленасьці аб'екту! Паралельныя лініі ў пэрспэктыве сыходзяцца ў кропку!

Пералічыць правілы, якія Трахім Ігнацэвіч убіў мне ў галаву на занятках па малюнку, я не адважуся, бо замест кароткай аповесьці пра пачуцьцё гідкасьці, атрымаецца падручнік «Як навучыць маляваць». Калі я кажу, што правілы мне «ўбілі» ў галаву, дык маю на ўвазе, што ў Ігнацэвіча была звычка пастукваць алоўкам, ён гаварыў і пастукваў, гаварыў ціха й стукаў зусім ціха-ціхенька. Ён стукаў па пляншэтах, папках, сьценах, зэдліках, мальбэртах, гіпсавых кубах і пірамідах... Тук-тук-тук... Трахім Ігнацэвіч пастуквае алоўкам, на ягоным сухім жоўтым запясьці сінее вытатуіраваны ў

ЖЫДЫ — СЛАВЯНЕ

Выдавецкая анатацыя, дасланая аўтарам

Paul Wexler. The Ashkenazic Jews: A Slavo-Turkic People in Search of a Jewish Identity, x + 306 p., Slavica Publishers, Inc., Columbus, Ohio, 1993 (ISBN: 0-89357-241-1), $19.95.

Гэтая праца, лінгвістычная пераацэнка раньняе гісторыі эўрапейскага жыдоўства, зацікавіць кожнага, хто хоць калі-небудзь цікавіўся як жыдоўскі народ, ня маючы сваёй тэрытарыяльнай базы й жывучы як меншасьць сярод нярэдка варожых нежыдоўскіх народаў па ўсіх канцох зямнога шару, здолеў захоўваць сваю апрычонасьць на працягу амаль двух тысячагодзьдзяў.

Аўтар кнігі выступае з шэрагам новых і кантравэрсыйных меркаваньняў што да адносінаў сучасных жыдоў да жыдоў старажытнапалестынскіх. Улічваючы абмежаванасьць гістарычных крыніцаў, гэтая кніга паказвае, як факты ідышу й гэбрайскай мовы сучаснага Ізраіля (разгледжаныя ў чатырох папярэдніх кнігах) могуць дапамагчы гісторыкам і археолягам у ацэнцы ведамых зьвестак і знаходак, а таксама высноўвае новую гіпотэзу пра паходжаньне ашкеназійскіх або паўночнаэўрапейскіх жыдоў, якія некалькі апошніх стагодзьдзяў складалі бальшыню жыдоўскага насельніцтва сьвету.

На думку Вэкслера, ашкеназійскія жыды найхутчэй паходзяць ад невялікай этнічнай меншасьці палестынска-жыдоўскіх эмігрантаў, якая зьмяшалася шлюбна з значна шырэйшай колькасьцю групаў іўдаізаванага разнароднага насельніцтва з Малой Азіі, Балканаў і германа-сэрбалужыцкіх земляў. Шырокае наверненьне ў іўдаізм, якое пачалося ў Малой Азіі ў хрысьціянскія часы й скончылася з замацаваньнем хрысьціянства сярод заходніх славянаў на пачатку другога тысячагодзьдзя, уратавала невялікую групу палестынска-жыдоўскага насельніцтва ў дыяспары ад поўнага зьнікненьня. Найбольшымі нежыдоўскімі ўдзельнікамі этнагенэзу ашкеназійскіх жыдоў былі славяне, хоць магчыма там быў прысутны й невялікі цюркскі элемэнт — як з каспійска-чарнаморскага рэгіёну (нашчадкі хазараў), гэтак і з Балканаў і Вугоршчыны. Ва ўсіх гэтых рэгіёнах цюркскае насельніцтва на раньнім этапе зьлілося з суседнімі славянамі.

У дадатак да разгляду лексыкі ідыш славянскага, грэцкага, раманскага й германскага паходжаньня, якая адлюстроўвае аспэкты жыдоўскае рэлігіі й народнае культуры, у кнізе паказана, што шматлікія элемэнты ашкеназійскага фальклёру й самой рэлігіі паходзяць з славянскіх крыніцаў — ад заходніх (лужыцкія сэрбы й палабы) да балканскіх. Падрабязна разглядаюцца факты шырокага наверненьня ў іўдаізм у Малой Азіі, паўдзённай Эўропе і на германа-сэрбскіх землях да дванаццатага стагодзьдзя, а таксама прычыны, чаму славяне-паганцы й хрысьціяне прымалі іўдаізм. Тым часам як гісторыкі спрачаюцца над маштабамі пераходу ў іўдаізм, Вэкслер мяркуе, што лінгвістычныя й этнаграфічныя факты пацьвярджаюць высокую верагоднасьць гэтага пераходу.

У дадатак, лінгвістычныя факты абвяргаюць традыцыйныя цьверджаньні аб тым, што ідыш — варыянт верхненямецкай мовы, а сучасны іўрыт — «адроджаная» форма старагэбрайскай; прапануюцца новыя гіпотэзы: ідыш мае ў аснове славянскую мову (іўдаізаваную форму сэрбалужыцкай), якая была на раньнім этапе рэ-лексыфікаваная ў бок верхненямецкай, а сучасны іўрыт — гэта ў сваю чаргу ідыш, рэ-лексыфікаваны ў бок старагэбрайскай, а значыць — таксама мадыфікаваны варыянт сэрбалужыцкай мовы. Гэтыя факты падтрымваюць аўтараву гіпотэзу пра славянскае паходжаньне ашкеназійскіх жыдоў і значнага масыву іх рэлігіі й народнае культуры.

Далей у кнізе паказваецца, як ва ўмовах адноснае адасобленасьці ад нежыдоўскага насельніцтва, якія разьвіліся пасьля дванаццатага стагодзьдзя, паўночнаэўрапейскія жыды выпрацавалі мэтады «іўдаізацыі» сваёй паганскай і хрысьціянскай славянскай рэлігіі й народнай культуры — прымаючы ў размоўную юдэалужыцкую/ідыш мову незвычайна вялікую колькасьць гэбрайскіх элемэнтаў і рэінтэрпрэтуючы й перакалібруючы рэлігійныя й этнаграфічныя звычаі й абрады згодна зь біблійнымі й талмудычнымі прэцэдэнтамі; так, звычаі, успрыманыя хрысьціянамі як састарэлыя, замацоўваліся сярод жыдоў як «жыдоўскія». Прыкладам, славяна-германская цырымонія біцьця чаркі каб адагнаць д'ябла ад маладых падчас вясельля, была рэінтэрпрэтаваная як напамін аб разбурэньні двух ерусалімскіх Сьвятыняў. Этнаграфічныя й рэлігійныя сьведчаньні ўзятыя галоўным чынам з палемікі ў германа-славянскай гэбрайскай рэлігійнай літаратуры XIII—XVI стагодзьдзяў, дзе выяўляецца, што шмат хто з рабінаў добра ўсьведамляў нежыдоўскае паходжаньне ашкеназійскага фальклёру й рэлігійных абрадаў. Там, дзе рабіны не маглі пераканаць масы адмовіцца ад паганска-хрысьціянскіх звычаяў, яны былі вымушаныя захаваць іх, надаўшы ім аднак іўдаізаваную форму.

Кніга зьмяшчае выпраўленьне неабгрунтаваных поглядаў нябожчыка Артура Кестлера зь ягонай кнігі «Трынаццатае Калена» (The Thirteenth Tribe, London, 1976), нібы ашкеназійскія жыды ў вялікай масе паходзяць ад цюркаў-хазараў, якія прынялі іўдаізм на Каўказе ў VIII стагодзьдзі. Вэкслер пагаджаецца з Кестлерам што да славяна-цюркскае этнічнае асновы паўночнаэўрапейскіх жыдоў — аднак аспрэчвае яго цьверджаньне аб перавазе цюркаў над іншымі этнічнымі групамі і аб Каўказе як аб «радзіме» ашкеназійскіх жыдоў. Там, дзе Кестлеравы сьведчаньні, пераважна нелінгвістычныя, былі малалікія й цалкам ненадзейныя, ідыш і ашкеназійская народная культура й рэлігія даюць безьліч разнастайных фактаў, якія пацьвярджаюць славянскую першасную этнічную аснову ашкеназійскіх жыдоў. Насуперак звычайнаму меркаваньню, што славянскія ўплывы ў культуры ашкеназійскіх жыдоў былі «пазьнейшым запазычаньнем», Вэксьлер разглядае славянскія элемэнты як «спадчыну» паганскай славянскай культуры, якая пазьней была прыхаваная й трансфармаваная пад уплывам хрысьціянства.

Такім чынам, ашкеназійскі іўдаізм — па сутнасьці іўдаізаваная форма славянскай паганскай і хрысьціянскай культуры й рэлігіі (а ня вынік лінейнага разьвіцьця палестынскага іўдаізму) і найлепшае сховішча паганскай славянскай народнай культуры, якое дажыло да нашых дзён. Вэкслер таксама выказвае меркаваньне, што іншыя жыдоўскія дыяспары — г. зн. сэфардзкая, арабская, іранская, кітайская, індыйская, эфіёпская й еменская — таксама пераважна нежыдоўскага паходжаньня. Кніга параўноўвае паняцьце жыдоўскае народнасьці з спробамі перапісаньня гісторыі, што сустракаюцца ў шматлікіх іншых народаў.

У кнігу ўлучаная бібліяграфія (каля 700 пазыцыяў) і паказальнік прыкладаў. **Ў справе замоваў на кнігу зьвяртацца на адрас: Slavica Publishers, Inc. PO Box 14388 Columbus, Ohio 43214 USA. Phone No. 614-268-4002**

канцэнтрацыйным нямецкім лягеры нумар. Тук-тук-тук... Ігнацэвіч скончыў мастацкі інстытут у Вільні. Ён вучыўся зь вядомым на той час у СССР літоўскім графікам Красаўскасам.

Красаўскас быў заўсёды знэрваваны. Ён таму й плаваньнем заняўся, каб нэрвы супакойваць. «Стаім зь ім, на практыцы, пішам эцюды. Поле, дрэвы, касьцёльныя вежы... Падыходзіць пастух. Во, і падобна выходзіць, як у жыцьці. Красаўскас зрывае аркуш з пляншэту, шкамутае, ірве на дробныя кавалкі, топча... Пастух пудзіцца, уцякае. У Красаўскаса нэрвы слабыя». Тук... Ігнацэвіч Трахім Дзянісавіч памёр улетку. Зусім выпадкова я зайшоў у Палац мастацтва і ўбачыў ягоную вальтэраўскую ўсьмешку, забраную чорнай тлустай рамкай. Блага, калі выкладчыкі паміраюць на пачатку лета, усе студэнты на практыцы, і няма каму правесьці іх у апошні шлях. І робіцца млосна, калі пачуеш... «Тут адзін памёр, яго ты ня ведаеш, але, можа, пастаіш каля труны. І на кветкі пакладзі, быццам знак павагі». Усё гэта непрыстойна, як і ўвесь Палац мастацтва, як і ўсе, хто там працуюць — непрыстойныя, як і ўсе, хто вывешвае на мёртва-гіпсавых сьценах свае мёртванароджаныя карцінкі — гідкія.

Божа, даруй беларускім мастакам грахі. Асьвяці іх сьвятлом сваім! Растлумач ім, Божа, што цень на саборным крыжы цямнейшы за сьвятло на труне. Малюся за іх, бо люблю іх. І малю Цябе, стваральнік сусьвету, даруй ім, бо не ад сатаны памылкі іхнія й нядатнасьць іхняя, а толькі ад неразумнасьці, наіўнасьці ды бязьмежнай тупасьці, ад разумовага паралюша! Аман!

Тук-тук... тук-тук... Менавіта алоўкам я пастукваў у касаватае акенца карчмы «Шынок у Лявона». Была гарачыня, я вяртаўся з працы дамоў праз Камароўскі рынак. І мне захацелася зьесьці шашлык. Дым і водар смажаніны над стракатым натоўпам, што ўсё набывае і ўсё прадае. Куплю валюту! прадаецца падстаўка пад тэлевізар. Кава замежная. 100 г. — 100 р. А мне захацелася мяса. Страўнік сьціснуўся й падпоўз пад сэрца. Давай есьці! Давай жэрці! Мяса, мяса, мяса хачу! У рабрысты сподак бліскучымі ад сала пальцамі мне паклалі мясных камякоў. Трэба хваліць тое, што ясі! Цудоўнае, сакавітае, добра прасмажанае... І пякоткі ня будзе, ад поліўкі я пасьпеў адмовіцца. У гандляркі шашлыкамі тоўстыя лыткі ў рагах гразі. Павярнуўся ў другі бок і разглядаў вітрыны мэблевай крамы. Смак дзіўны! А ў мяне адны жылы! Суседзі па сталу — пралетарыі. Іх не навучылі хваліць тое, што ясі. А мяне навучылі, і таму я... Няма дрэва, каб пастукаць і не сурочыць. Смак сапраўды дзіўнаваты, салодкі... Шпурляю сурвэтку на зямлю, а мог і ў сьметніцу. Маленькае паскудзтва. А вось і вялікае: жабрак сядзіць на прыступках падземнага пераходу, грэецца на сонцы, падкасаў нагавіцы й нібыта крычыць... Глядзіце ўсе на мае распухлыя ногі ў гнілых струпах! Я не магу хадзіць! Я — інвалід! Гной цячэ ў мае чаравікі! Грошы давай, беларускія, расейскія, амэрыканскія — усе давай! А я наеўся чалавечыны! Бліскавіца працяла патыліцу. Дакладна. Паскудзіна з бруднымі лыткамі накарміла мяне вялым чалавечым кумпяком. У яе такія востранькія іклы й шырачэзны рот. Такая ўсё зможа. Разьбярэ мужчыну, як кабана, і ня скрывіцца. Трэба дэзынфэкцыю правесьці. Сьпірт толькі літрамі, таму гарэлка, сто грамаў, больш чым дастаткова. Вось і «Шынок у Лявона», тук-тук-тук... Квіток за сорак рублёў, і я ў прахалодных сутарэньнях. Гарэлкі няма, ёсьць каньяк. Даплочваю й праводжу санітарную апрацоўку вантробаў. Хух, можна супакоіцца, пасядзець на лаўцы за аблітым півам сталом і згадаць Галіну Гласаву. У апрацаванай сьпіртусам сьвядомасьці ўзьніклі белыя й краплачныя нацюрморты нябожчыцы Гласавай. Як хутка мае настаўнікі адыйшлі за чорную мяжу! Але п'яному лягчэй і нават прыемна згадваць нябожчыкаў. Вось і Гласава зь яе нацюрмортамі, якія некалі даўно віселі на сьценах «Шынка ў Лявона» й радавалі нецьвярозых менчукоў і гасьцей сталіцы. Гладышы. Кветкі. Гронкі арабіны. Ручнікі з узорамі, крыжамі й пеўнямі. Дзе яны? У цьвілых складах, за сьлізкімі скрынямі з-пад гнілых памідораў? Гэта ў горшым выпадку. А можа, нацюрморты Гласавай пасьля сьпісаньня ўпрыгожваюць сьціплы дамок на лецішчы дырэктара «Шынка ў Лявона», якога, даю гарантыю, не завуць Лявонам, бо ў набрынялым расейшчынай Менску ён можа быць толькі Леанідам. А хутчэй за ўсё, нацюрмортаў няма, яны аблушчыліся й абляцелі, як букеты ў цёплым пакоі. Яны толькі ў маёй маладосьці засталіся яркія й лякіраваныя, сьвежыя й жывыя. У тых гадах, якія вызначыліся словам «гідлівасьць».

Ты сама прасіла расказаць, і споведзь будзе няпоўнай, калі не згадаць яшчэ два выпадкі, якія я стаміўся насіць у сабе.

Мяне калоціць, калі ўспомніцца даглядчыца зь дзіцячага садка. Як я ненавідзеў яе! Даглядчыца цягала за сабою цэлыя аблокі смуроду: вострае тхненьне хлёркі, ліпучы дух закарэлага посуду, саладжавая пякучасьць распушчанай у вадзе гарчыцы... Пакамечаны халат, упрыгожаны бурачковымі плямінамі ад вінаграду, сядзеў на ёй коса. Мусіць, гузікі прышываліся не на тое месца. А здаралася, што даглядчыца наогул не зашпіляла халат. Тады паміж заплямленых маннай кашаю фалдаў ружавела нясьвежая сарочка, пад якою цямнела ў міжножжы валасяное пакрыцьцё. Каламутныя, зусім бяз зрэнак, вочкі ўвесь час за кімсьці сачылі, некага падпільноўвалі, яны ўвесь час круціліся, як маленькія глёбусы мёртвых плянэтаў, на шырокім фактурным тварку пабітым струпкамі. Але самае агіднае было бачыць не зеленкаватыя галоўкі восьпінак, а вялізны апёк на караткапалай руцэ. Ад самай далоні й па локаць рука даглядчыцы нагадвала самаробную сялянскую каўбасу, нібыта нехта сквапны напхаў у танюткую плеўку кішкі аднаго сала. «Хто ня сьпіць? Павярнуцца ўсім на правы бок! Валодзя Адамчык і Васіль Шыш-Дударга зараз пойдуць стаяць у прыбіральні!» І мы стаялі на скразьняку ў дашчанай прыбіральні, каля аднапавярховай раўбіцкай сярэдняй школкі. О, гэта ж тыя ж самыя Раўбічы! Так, тыя самыя, куды наш садок вывозілі на лета. І дзе за тое, што ня сьпіш, мусіш стаяць басанож у прыбіральні. Васілю Шыш-Дударгу пашанцавала — ён падхапіў запаленьне лёгкіх, і яго забралі бацькі. А я застаўся давіцца маннай кашай у Раўбічах, застаўся, каб прачынацца ад слоў даглядчыцы. «Хто ня сьпіць?» Застаўся, каб хаваць за шчакою варанае сала, бо даглядчыца правярала талеркі. «Хто ня зьесьць, ня ўстане з-за стала!» І як жа карцела, хай толькі выйдзе ў другі пакой, ускочыць на стол з нагамі, і як потым не хацелася тлумачыць маці, чаму ад мяне патыхае хлёркай і прыбіральняю. «Хто ня сьпіць?»

Я ня сплю. Я позна кладуся, я позна ўстаю, бо люблю начны Менск, пусты й чысты, вымыты й падмецены. Самае вялікае сьмецьце ў горадзе нясе з сабою пасажыра-плынь у час пік. А ўночы яны сьпяць, яны паслухмяныя, іх навучылі зьядаць варанае сала, спаць на правым баку, паважаць выхавацеля, старшыну, старшыню, загадчыка, начальніка й камандзіра. А мяне навучылі стаяць у прыбіральні й ня гідзіцца, калі астатніх ванітуе. Мяне навучылі любіць ноч. А гаварыць тое, што думаю, я навучыўся сам, бо заўважыў — можна апавядаць пра самыя вясёлыя рэчы й выклікаць сум, а можна гаварыць пра непатрэбшчыну й будзе цікава слухаць.

Толькі цяпер гаворка пра іншае пачуцьцё.

Згадалася пра гідкасьць востра й нечакана, калі ўночы праходзіў паўз катэдральны касьцёл, упрыгожаны бел-чырвона-белымі сьцягамі дый харугвамі зь Ісусам ды Божай Маці. У гэтым будынку, яшчэ школьнікам, я займаўся вольнай барацьбою. Заняткі праходзілі на самым верхнім, дабудаваным паверсе. У майго аднаклясьніка, Барыса, падчас трэніроўкі ад вялікай напругі пачаў вылазіць з рота даўжэзны гліст. Спачатку паказаўся самы кончык. Мы абступілі Барыса, бо ня ўцямілі, што зь ім робіцца. Чаму гэта ён на карачках папоўз з барцоўскага кіліму? Барыс рукамі выцягнуў белаватага чарвяка й шпурнуў на дашчаны пол, побач зь сінім кілімам. Пасьля зьяўленьня гліста народу Барыс саромеўся хадзіць на вольную барацьбу й запісаўся ў сэкцыю боксу. Баксёры трэніраваліся ў тым жа будынку, толькі на першым паверсе.

Можа, таму з усіх чатырох менскіх касьцёлаў ты незалюбіла менавіта катэдральны. У ім яшчэ доўга будзе сьмярдзець спартовым потам...

АРЫЕНТАЛЬНАЯ СЬВЕДАМАСЬЦЬ

Гутарка ў Рэдакцыі «Нашай Нівы» з харвацкім прафэсарам Васілём Стрэхалюком

Васіль Стрэхалюк — доктар філялёгіі, украінец, гадаваўся, атрымаў адукацыю й працаваў у Босьніі. Цяпер працуе дарадцам па ўкраіністыцы дзеля ўрадавых і навуковых інстытуцыяў у Загрэбе, грамадзянін Харватыі. Выкладаў харвацкую мову ў Кіеве.

«НН»: За савецкім часам пра Югаславію йснавала ўяўленьне як пра самую цывілізаваную, вольную й «капіталістычную» з усіх сацкраінаў. Але тое, што там адбываецца цяпер — гэта чыстае дзікунства.

В.С.: Югаславія мела моцную галаву — Іосіф Броз. Ён памёр у 80-м годзе. Ён усё трымаў у сваіх руках. Ён увесь час паўтараў — беражыце братэрства й еднасьць... Пасьля дэмакратычных выбараў у Сэрбіі — гэта была найбольшая (10 млн.) рэспубліка Югаславіі — перамаглі шавіністычна настроеныя камуністы, якія трансфармавалі лёзунг адзінае Югаславіі ў лёзунг Вялікае Сэрбіі. У астатніх рэспубліках да ўлады прыйшлі дэмакратычныя сілы, якія пачалі абвяшчаць сувэрэнітэты. Тады, з мэтаю захаваць адзінства краіны, югаслаўская (сэрбская) армія рушыла на Славенію, Босьнію, Харватыю ды іншыя тэрыторыі, якія абвясьцілі незалежнасьць. Там яна сустрэла супраціў. Так пачалася вайна.

«НН»: Словам, прычынай усяму — сэрбскі нацыяналізм...

В.С.: Прычына — спадчына імпэрскіх вялікасэрбскіх прэтэнзій. Іх лёзунгі: усіх сэрбаў — у адну дзяржаву! дзе ёсьць хоць адзін сэрб, хоць адна сэрбская магіла — там Сэрбія! сэрбы — самая прыгнечаная іншымі нацыя, але сэрбы — найстарэйшая й вялікая нацыя! У Харватыі было 12% сэрбаў, але ўсе цэнтральныя пасады займалі сэрбы...

«НН»: Ці можна ўсё гэта разглядаць як вызначальныя прычыны для разьні? Ёсьць шмат падобных сытуацый. Напрыклад, славакі часта наракалі, што ўсе важнейшыя пасады ў іх займаюць чэхі, што непараўнальна большыя бюджэтныя сродкі йдуць на разьвіцьцё Чэхіі й г.д. Але там няма вайны. Таксама падобныя шавіністычныя ідэалёгіі існуюць ці ня ў кожнай нацыі, але — наўзбоч ад самое грамадзкае думкі. Магчыма, прычына ў людзях ці ў асобах лідэраў?

В.С. Слабадан Мілошэвіч — вельмі моцная палітычна асоба, але асоба нэгатыўная. Ён вырашыў «разьвязаць сэрбскую праблему», г.зн. пад лёзунгам адзінае Югаславіі стварыць вялікую Сэрбію. Важнейшая роля ў гэтым належыць прапагандзе як у самой Сэрбіі, так і ў сьвеце. Два дазволеныя тэлеканалы й толькі афіцыйныя газэты ствараюць культ Мілошэвіча — бацькі нацыі на манэр, як гэта было з Гітлерам у Нямеччыне. Народы тут невінаватыя, вінаватая монарэлігійная прапаганда.

«НН»: Падобна, што этнічна гэта ўвогуле адзін народ — паводле мовы, прынамсі...

В.С.: Але Сэрбія — праваслаўная, Харватыя й Славенія — каталіцкія, а Босьнія — мусульманская (славяне-мусульмане — вынік 400-гадовага панаваньня на гэтых землях Турцыі). Басьнійцы выдзеленыя ў адзіную нацыю зусім нядаўна — якраз паводле рэлігійнае прыналежнасьці. Хто яны этнічна — сэрбы ці харваты — гэта таксама прычына канфліктаў.

«НН»: Ці магчыма фігуральна сказаць, што Сэрбія — гэта Расея, у якой запанаваў Жырыноўскі?

В.С.: Так, з той хіба розьніцай, што Жырыноўскі — паяц. Але каб зьявіўся ў Расеі Мілошэвіч — так. Прычына вайны — імпэрская палітыка адной веры.

«НН»: Якая тут роля лёзунгу братэрства праваслаўных славянаў?

В.С.: Адна з вызначальных. Сэрбы перакананыя, што яны народ, які найбольш пакутаваў ад іншых, у іх ёсьць нават тэрмін — сэрбажэрства. У іх адназначная этнічная арыентацыя, яны кажуць — мы і расейцы! Апроч гэтага — вось уплыў арыенту — падступнасьць, сэрбы заражаныя чыста турэцкім фанатызмам. Праваслаўныя сьвятары ў Сэрбіі адыгралі ў гэтай вайне благую ролю — бласлаўлялі на забойства. Чаго не скажу пра мусульманаў і каталікоў.

«НН»: Падобна, што свая чорная пэрспэктыва ў арыентальнай сьвядомасьці «ўсходнеславянскага праваслаўнага братэрства» ёсьць і на нашай зямлі... Скажыце, сэрба-харвацкая мова больш не йснуе?

В.С.: Не. Ніхто пра яе й ня згадвае.

«НН»: А што робяць тамтэйшыя ўкраінцы?

В.С.: Становішча ўкраінцаў у Харватыі падобнае на становішча меншасьцяў у Літве. Наша дыяспара — 6 тысяч. Частка — тыя, што 260 гадоў назад прыйшлі сюды з Закарпацьця, лічаць сябе русінамі, другая частка — шмат пазьнейшая. Але жывем разам, як два віды аднаго народу. Вайна нарабіла нам шмат шкоды. Калі югаслаўская (сэрбская) армія рушыла на Вукавар, то ўсё — да тла. Таму ўкраінцы выступілі на абарону разам з харватамі. Цяпер шмат украінцаў жывуць па гатэлях, гуртожытках, зноў пачалі ствараць свае школы — у Загрэбе, сяле Лепаўляны... Украінцы маюць свайго дэпутата ў парляманце, сваю асацыяцыю. Праблемы — малалікасьць ды нястача кадраў.

«НН»: Ці відаць канец гэтай вайне?

В.С. Не. Акупаваная чвэрць Харватыі. Акупаваныя тэрыторыі кантралююць войскі ААН, але сэрбы робяць там, што захочуць, а менавіта — этнічныя чысткі.

ПАЎСТАВАНЬНЕ НАЦЫІ

Энтані Сміт

Прысутнасьць альбо адсутнасьць этнічных сувязяў на нейкай тэрыторыі ці сярод нейкага насельніцтва, узьнікненьне этнічнага ядра й пэрыфэрыяў, агульны фонд этнагістарычнай памяці, культывацыя мітаў аб этнічнай абранасьці, — вось некаторыя падставы для наступнага фармаваньня нацыяў.

Але якім чынам з гэтых этнічных вытокаў паўстае канцэпт нацыі як супольнасьці палітычнай ды тэрытарыяльнай? Ці можам мы разгледзець нейкія стадыі, мадэлі, шляхі?

Збольшага мы можам вызначыць некаторыя этапы, якія (хоць гэта й не агульны закон) адпавядаюць эвалюцыі пераважнай большасьці нацыяў.

Першая стадыя — аб'еднаньне кланаў і плямёнаў, паселішчаў і вёсак ў больш шырокія культурныя й палітычныя супольнасьці. Гэта зьвязана зь мітамі аб продках, міграцыі й вызваленьні, і перадусім — зь мітамі заснаваньня. Сярод найбольш вядомых — рымскі міт пра Ромула й Рэма, Траянскія прыгоды Энэя й бітвы ў Італіі, Ізраільскія міты аб патрыярхах, Эгіпэцкай няволі, Зыходу й дамове на гары Сінай.

Большасьць эўрапейскіх этніяў, альбо этнічных супольнасьцяў, ганарацца такімі мітамі, як саксонскае перасяленьне пад кіраўніцтвам Хенгіста й Хорсы, Кловіс і франкскія заваёвы, дынастыя Пястаў у Польшчы, вараскае паходжаньне Русі,— і выстаўляюць падобныя прэтэнзіі на антычны альбо біблійны радавод.

За гэтым ідзе пэрыяд этнічнае кансалідацыі, пра які потым успамінаецца як пра «залаты век». Ён часьцяком зьвязваецца з росквітам этнічнай культуры, зьдзяйсьненьнем вайсковых перамогаў ды наяўнасьцю віжоў, сьвятых і герояў. Ірляндцы зьвярталіся да часоў Сьв.Патрыка як да свайго залатога веку, калі квітнелі ірляндзкія мастацтвы, паэзія, рэлігія й навука. Падобным чынам, пасьля-ведычная эра клясычных гарадоў-дзяржаваў, пэрыяд Буды, эпасу й Упанішадаў успрымаліся пазьней як вялікая й слаўная індыйская рэлігійная цывілізацыя. Пазьнейшыя пакаленьні гэбраяў бачылі ў царстве Давіда й Саламона залаты век свайго народу, гэтак як позьнія рымляне азіраліся на суворыя рэспубліканскія каштоўнасьці часоў Катона й Сцыпіёна як на свой маральны ідэал.

Наступным ідзе трэці пэрыяд, пэрыяд разьвіцьця й падзяленьня, які часта ўспрымаецца як заняпад. Стары лад кансэрвуецца праз вышэйшыя клясы, супольнасьць касьцянее й распадаецца, а часам трапляе пад уладу заваёўнікаў альбо ў выгнаньне, як гэта было зь ірляндцамі ці гэбраямі. У Англіі пазьнейшыя генэрацыі тужылі па легендарных вольнасьцях Англа-саксонскай эры, процістаўляючы іх «нармандзкаму ярму», якое паўстала пасьля 1066 г. У Францыі «стары рэжым» зь ягонымі арыстакратычнымі прывілеямі таксама выклікаў жаданьне зьвярнуцца да больш простага, больш шляхотнага мінулага. Таксама й славянафілы ў пазьнейшыя часы царызму імкнуліся да дапятроўскіх каштоўнасьцяў «старажытнай Русі».

І менавіта тут нацыяналізм знаходзіць урадлівую глебу. Нацыяналістычныя рэвалюцыі рэканструююць мінулае ў якасьці пра-гісторыі нацыі, што мусіць узьняцца з доўгага сну й ачысьціцца ад чужародных скажэньняў. Але нацыянальны міт ёсьць разрывам зь мінулым, нават калі ён узнаўляе яго. Шчыльна зьвязаны зь візіяй будучыні, ён імкнецца надаць мінуламу сэнс лёсу й місійнасьці. Такім чынам, ён карыстае зь мінулага сэлектыўна, адбіраючы міты паходжаньня й заснаваньня, міты залатога веку, й праміная прыкрыя эпізоды й непажаданыя інтэрпрэтацыі.

У некаторых выпадках нацыяналы рэканструююць мінулае ўрыўкамі, альбо нават ствараюць цэлыя эпізоды. Выразным прыкладам гэтага была публікацыя фінскае «Калевалы» Эліясам Лёнратам у 1835 г. Лёнрат зьбіраў балады карэльскіх сялянаў, каб стварыць фінскі эпас, які ў хуткім часе пачаў лічыцца паэтычным выяўленьнем старажытнай Фінляндыі, творамі паўночнага Гамэра, з дапамогай якіх фінская інтэлігенцыя змагла мабілізаваць народ супраць прыгнятальніцкага расейскага рэжыму.

Урэшце паўстаюць сучасныя нацыі. У гэтым трэцім пэрыядзе самае істотнае — нацыянальная канстытуцыя, усталяваньне сталай палітычнай сыстэмы, разьвіцьцё сучаснае эканомікі й прававога ладу й забесьпячэньне сацыяльнага дабрабыту дзеля ўсіх. Толькі тады мы можам казаць аб цалкам сфармаванай «поўнай нацыі» й прыняцьці ейнага нацыяналізму ў якасьці ўнармаванага фактару міжнароднага парадку.

У межах гэтае схемы існуюць значныя адхіленьні ў шляхах паўставаньня нацыяў. Найбольш істотным ёсьць тып этніі будучае нацыі — «вэртыкальны» альбо «гарызантальны».

У «гарызантальным» альбо арыстакратычным тыпе этніі этнічная культура збольшага прывязаная да вышэйшае клясы. Нават там, дзе масы сялянства й пэрыфэрыйныя рэгіёны намінальна належаць да адной этналінгвістычнай, этнарэлігійнай альбо этнапалітычнай супольнасьці, сяляне й рамесьнікі заўсёды захоўваюць пэўную культурную разнастайнасьць. «Гарызантальныя» супольнасьці займаюць вялізныя прасторы зь няпэўнымі межамі й характарызуюцца значнай ступеньню мяшаных шлюбаў сярод вышэйшае клясы. Прыкладамі такога тыпу этніяў могуць быць хэты й старая пэрсыдзкая арыстакратыя, вугорскія рыцары й каталёнскі набілітэт.

Вэртыкальная, альбо простанародная этнія — сканцэнтраваная й кампактная. Адзіная этнічная культура імкнецца пранікнуць ва ўсе страты й рэгіёны супольнасьці; бар'еры да шлюбаў з чужынцамі значна вышэйшыя. Нягледзячы на канфлікты, розныя страты грамадзтва маюць агульны фонд сымболяў, мітаў, традыцыяў, агульную гістарычную памяць. Прыкладамі гэтага тыпу могуць быць этнарэлігійныя супольнасьці накшталт гэбраяў, праваслаўных грэкаў і армянаў, а таксама друзы, мараніты, сыкхі, каталікі-ірляндцы, а яшчэ этнапалітычныя супольнасьці гарадоў-дзяржаваў, такіх як старажытны Шумэр, Фінікія й Грэцыя, дзе агульная рэлігія й пантэон, гаворкі і ўстановы, разам з доўгімі войнамі супраць чужынцаў нарадзілі пачуцьцё этнічнага адзінства сярод культурна падобнага насельніцтва.

УСЯМУ ГЭТАМУ НЕ ВІДАЦЬ КАНЦА

Зь ліста Бісэркі Райчыч з нагоды сьмерці Петара Вуічыча, сэрбскага літаратара

«[...] Што да сэрбскай літаратуры, дык мушу сказаць, што пісаць пра гэта цяжка. У агульным бязладзе ніхто добра не арыентуецца. З прычыны вайны, з прычыны санкцыяў усё спынілася. А й без таго ўсё было вельмі складана. Другі раз за XX стагодзьдзе паўтараецца грамадзянская вайна. Яна зьнішчае ўсё, што ёй трапляецца на дарозе. Падчас Другой сусьветнай вайны было людагубства. Сёньня мы маем людагубства плюс самагубства. Зусім новая зьява. Трыумф чыстае дэструкцыі. Усе народы, што ваююць, вельмі адзін да аднаго падобныя. Гавораць на адной мове. Толькі веру маюць розную. Мэнтальнасьць тая самая. Усе яны — як казаў на пачатку стагодзьдзя славуты антраполяг і географ Еван Цвіч — гвалтоўныя. Адгэтуль і дамінацыя сьмерці над жыцьцём. Усё паходзіць ад комплексу ніжэйшасьці. Усе гэтыя народы доўга, занадта доўга былі пад уладаю іншых народаў, імпэрыяў. Ніхто не займаўся вызваленьнем іх ад пачуцьця няволі. На жаль, гэта народы-нявольнікі. Яны доўга церпяць, а калі выбухаюць, дык нішчаць усё. Думаю, што Югаславія была выйсьцем для ўсіх і што пасьля пэўных зьменаў у ёй можна было жыць зусім нармальна. Ясна, што мы ня можам жыць адны без адных, гэтаксама, як пасьля крывавай Другой сусьветнай вайны. Праўда, тады былі большыя людзкія страты, а сёньня — страты матэрыяльныя. Жорсткасьць засталася тая самая. Толькі цяпер у гэтай страшнай крывавай драме больш актораў.



Вы добра ацанілі профіль «Кньижевнеј Речи». Гэтае выданьне рэдагуюць вельмі маладыя людзі. Яны не належаць ні да апазыцыі, ні да істэблішмэнту. Яны нікому ня вераць, і гэта мяне ня дзівіць. Больш за 300 тысячаў найбольш здольных пакінулі краіну, уцякаючы ад мабілізацыі, нянавісьці й немагчымасьці ваяваць з братамі, сябрамі, зь якімі й далей можна было жыць нармальна. Плюралізм у Югаславіі скончыўся жахліва. Ён скончыўся найгоршымі з усіх магчымых нацыяналізмамі. Адтуль у гэтых маладых людзей наднацыяналізм, касмапалітызм, зусім іншага тыпу, чым за камуністычнымі часамі. Яны бачылі, да чаго гэта вядзе. Яны ня хочуць браць у гэтым удзелу. Іх літаратура, фільмы, тэатральныя спэктаклі вытрыманыя ў духу постмадэрнізму. Яны вельмі сьпелыя. Цудоўна зробленыя. Так што мы ня ведаем, дзе й калі гэта дзеецца. Усё гэта занадта пазачасавае й пазапрасторавае. А на тэму вайны ў прозе ніхто не пісаў. Быў конкурс на апавяданьні на тэму апошняе вайны. Гэта мелася быць анталёгія тэкстаў-дакумэнтаў. Яна яшчэ ня выйшла. Баюся, што яшчэ доўга ня выйдзе. Выйшаў толькі цыкал вершаў пра Сараева паэта Стэвана Тонтыча, які да нядаўнага часу жыў у Сараеве, а цяпер яго пакінуў. Вершы ўжо перакладзеныя на нямецкую. Гэта дакумэнтальная паэзія й паэзія добрая. Варта было б яе перакласьці.

Іншыя літаратары належаць да некалькіх антымілітарных арганізацыяў. Грамадзянскі Саюз Сэрбіі, Београдски круг независних интелектуалаца (Бялградзкае кола незалежных інтэлектуалаў), пару камітэтаў супраць ваенных дзеяньняў. Іхны ўплыў нязначны. Яны запрашаюць інтэлектуалаў з усяго сьвету. З Польшчы быў Міхнік. [...] Было шмат французаў. Але ўсё гэта слаба зьмяняе сытуацыю. Пра гэта сьведчаць апошнія выбары. Санкцыі, на жаль, толькі ўзмацняюць Мілошавіча. З усяго гэтага дзякуючы тэлевізіі ён выходзіць героем. Апазыцыя разьяднаная. Мноства лідараў-інтэлектуалаў, зь якіх бальшыня паходзіць з Дэмакратычнай Партыі Мічунавіча. Усё гэта дзіцячыя хваробы. Галоўнае — ці насельніцтва Сэрбіі перажыве гэтую зіму. Старыя ўжо паміраюць ад голаду. Няма ацяпленьня ў шпіталях. У школах. Мноства хваробаў, сухоты. Хварэюць найчасьцей дзеці. Абсалютная адсутнасьць лекаў. Адсутнасьць камунікацыі. Я праз дзень хаджу на працу 8 км пехатою. Вечарамі ўвогуле не выходзім. Усё гэта яшчэ надоўга. Эўропа дапамагае Мілошавічу. І падобным да яго ў Босьніі. І сэрбам. І харватам. І мусульманам. А звычайныя людзі паміраюць, церпяць, і ўсяму гэтаму не відаць канца. Ад пачатку было ясна, што гэта грамадзянская вайна, трэба было не дапусьціць, каб разбураўся кожны горад, кожная вёска, кожны дом. І каб міліёны бязьвінных людзей засталіся бяздомныя. І марнаваць столькі часу на размовы з звычайнымі забойцамі. Няма зь імі размоваў. Яны нічога ня могуць абяцаць і выконваць. Гэта людзі, якія маюць асабістую карысьць з вайны. Заўтра, калі ня будзе грошай, усе паўцякаюць з капіталамі ў замежных банках. А мы, калі тым часам не памрэм, застанемся ў найгоршым бядацтве.

Вось пакуль што ўсё. На жаль, у рэальнасьці ўсё ў сто разоў змрачнейшае за тое, пра што я пішу [...]».

Kultura (Paryz). 1994. Nr 3/558

Трэці тып этніі больш характэрны для новае гісторыі: эміграцка-асадніцкі. Прыкладамі могуць быць Злучаныя Штаты, Брытанскаая Канада, Аўстралія, Паўднёвая Афрыка й Аргентына. Тут частка старое этнічнае супольнасьці эмігруе ў заморскія краі, і потым прымае альбо распушчаецца ў новых плынях эмігрантаў. У выніку паўстае мяшаная палітычная супольнасьць, што першапачаткова абапіраецца на стрыжнявую этнічную групу, якая (група) можа заставацца стратэгічна важнай, але ўлучае цяпер і шматлікія пад-этніі новых мігрантаў.

Мы мусім адрозьніваць два шляхі разьвіцьця нацыяў. Першы йдзе праз бюракратычнае далучэньне да ўжо сфармаванае супольнасьці з наступным працягам у эканамічнай і адміністратыўнай рэвалюцыі — і базуецца на «гарызантальнай», альбо арыстакратычнай этніі; другі йдзе праз культурную рэвалюцыю, мабілізацыю масаў і палітызацыю культуры й трансфармуе ў выніку «вэртыкальную» альбо простанародную этнію ў нацыю. Разгледзім у якасьці прыкладу Францыю. Франкскія заваёўнікі шостага стагодзьдзя былі гарызантальнай або арыстакратычнай этніяй, якая дамінавала над культурна адрозным рыма-гальскім насельніцтвам. Пасьля каляпсу Каралінгскай імпэрыі й доўгага міжцараваньня, франкі-капэтынгі здолелі кансалідаваць моцную дзяржаву вакол Іль-дэ-Франсу з дапамогай царквы, асабліва рэймскіх арцыбіскупаў. Да 13-га ст. яны здолелі інкарпараваць некаторыя прафэсійныя й сярэднія слаі, а таксама пэрыфэрыйныя рэгіёны як Нармандыя й Лангедок. Пасьля пэрыяду слабасьці працэс паскорыўся і палітызаваўся на пазьнейшых стадыях англа-францускіх войнаў, калі ў шасьцікутніку цэнтральна-паўночнай Францыі адбыўся рост менавіта тэрытарыяльнай нацыянальнай сьвядомасьці. Новы імпульс праўна-бюракратычнай інкарпарацыі быў нададзены ў 16-м ст. дэкрэтам Віер-Катрэ ад 1539 г., які зрабіў парыскую гаворку стандартнай мовай адміністрацыі.

У 17-м ст. моцныя правадыры, карыстаючыся палітыкай культурнай стандартызацыі й мэркантылізмам, стварылі магутную дзяржаву, якая фармавала растучы тэрытарыяльны патрыятызм. «Велічнае стагодзьдзе» (эпоха Людовіка XIV) дало нацыянальнае мастацтва, навуку, літаратуру й музыку, якія хутка пачалі ўспрымацца як праявы «генія» Францыі. У наступным стагодзьдзі пісьменьнікі, крытыкі й мастакі заклікалі да нацыянальнага адраджэньня з дапамогай дзяржавы па ўзорах Асьветніцтва. Француская рэвалюцыя зь яе якабінскім канцэптам грамадзянскай культуры ды ўнітарнай рэспубліканскай нацыі-дзяржавы з «натуральнымі межамі», якія бароніць армія грамадзянаў, — даводзіць гэтыя гамагенізуючыя тэндэнцыі да лягічнага выніку. Толькі ў 19-м ст. узьнік больш «народны», масавы францускі нацыяналізм, які шукаў у манархісцка-рэлігійных або радыкальна-рэспубліканскіх мітах падставаў для фармаваньня лёсаў францускай нацыі ў адпаведнасьці са сваім спэцыфічным бачаньнем «ля Франс».

Грэцыя ўяўляе сабою нацыю, сфармаваную на аснове вэртыкальнай, простанароднай этніі. Уключэньне грэцкіх гарадоў-дзяржаваў у Рымскую і Візантыйскую

Працяг на старонцы 10



Чарнагорска-японская вайна

Андрэй Антонаў

Пра краіну, якую ніколі ня бачыў на ўласныя вочы, а ведаеш пра яе толькі з кніг ды аповедаў сяброў, хай сабе яны тройчы належаць да катэгорыі «паталягічнай этнаграфіі», аб'ектыўна напісаць немагчыма. Зрэшты, гэтага ад мяне й не патрабуецца. Аб'ектыўнасьці проста не існуе.

Дык вось, пачну з таго, што я паважаю сэрбаў. Бо ёсьць за што. Хоць бы за тое, як гэты славянскі народ пачынае дзень.

Дзень у гэтай балканскай краіне пачынаецца зь «няўмойніцы» — гэта такая невялічкая, грамаў на 20 чарачка, якую зь вечара напаўняюць ракіяй (фруктовы самагон), а з раніцы, прачнуўшыся, яшчэ да таго, як ісьці чысьціць зубы, яе выпіваюць маленькімі каўткамі. Пасьля — сьняданак, і на працу. Студэнты й прафэсура, чыноўнікі й мастакі, рабочыя й сяляне ўжываюць гэты стымулятар для абуджэньня й паляпшэньня працаздольнасьці. Калі па мне, дык піць з ранку, не прадзёршы вочы, гарэлку, пасьля яшчэ куды-небудзь ісьці — проста немагчыма.

Народ, што такім чынам пачынае жыць — рызыкуе застацца незразумелым для астатняга сьвету, дзе алкаголь з ранку — прыкмета дэградацыі.

Але я разумею сэрбаў. Яны мне вельмі нагадваюць армянаў. Кульнуўшы чарку-другую, звычайна пачынаюць казаць: «Мы, сэрбы — вялікая нацыя. Мы маем не адно тысячагодзьдзе дзяржаўнасьці. Ад нас пайшла Падунайская цывілізацыя. Наша дзяржава, наш край — гэта ўсе Балканы й Пэляпанэс. Мы — пуп Эўразіі. Мы стаім на скрыжаваньні хрысьціянскага й мусульманскага сьвету». І тут жа, амаль без пераходу, рэзка зрываюцца на мінор: «Мусульмане й каталікі хочуць заняць нашыя землі, зьнішчыць нас як нацыю, бо мы лепшыя за іх, разумнейшыя, наша перавага відавочная й не дае ім спакойна спаць».

Гэтак і армяне. «Ад нас пайшла сусьветная цывілізацыя, на нашай зямлі спыніўся Ноеў каўчэг, мы далі сьвету вялікіх матэматыкаў, кампазытараў, камбінатараў і шахматыстаў (адзін Каспараў чаго варты!), наша літаратура была й ёсьць вялікая, Сараяну не за так Нобэля далі!» Але праз хвіліну ўспамінаюць, як падчас першай сусьветнай вайны ад рук турэцкіх жаўнераў загінула 3,5 мільёны іх супляменьнікаў. «Туркі хочуць нас вынішчыць! Яны ня людзі, а туркі. Мара кожнага турка — забіць армяніна». І плачуць шчодрымі, паўднёвымі сьлязьмі. Я іх разумею, і нават шкадую, як шкадую сваю армянскую бабулю Розу, якая на сьвеце нічога не баіцца, акрамя туркаў.

Сэрбы маюць малазразумелую, але непарушную й непахісную любоў да Расеі. Гэтае палымянае пачуцьцё да далёкай і толкам нікому не вядомай краіны мне нагадвае палымяныя пачуцьці Дон Кіхота да Дульсінэі. Любоў — гэта ня вынік прапаганды, хутчэй за ўсё туга па «старэйшаму брату», яна йснавала й існуе й будзе далей існаваць. З гэтым трэба зьмірыцца, як з учорашнім надвор'ем. Сёньня Расея ўжо ня можа паўтарыць свой пераможны паход на Балканы для вызваленьня адзінаверцаў. А заўтра, хто ведае, можа ўсё складзецца лепшым чынам.

Я веру таму, што падчас нацысцкай акупацыі сэрбскія падлеткі ўпотай хадзілі да расейскіх эмігрантаў браць урокі расейскай мовы. І я веру таму, што ў 1945-м для белградзкіх прыгажунь самым жаданым кавалерам быў савецкі афіцэр.

Яшчэ сэрбы любяць казаць, што яны панслявісты, але гэта зусім не замінае ім ваяваць з харватамі ды басьнійцамі (сэрбамі, што прынялі магамэтанства) і ў той жа час мірна суіснаваць з вугорцамі, якія жывуць на поўнач. Загадка.

Дзіўлюся з гэтай краіны. Сэрбы — фанатыкі кавы. Павагу да гэтага напою яны атрымалі ў спадчыну ад туркаў. Ужываюць яе проста ў неверагодных колькасьцях. Калі ААН увяла санкцыі супроць Югаславіі, то завоз гэтага жыцьцёва патрэбнага прадукту спыніўся. І што? Сэрбы пачалі вырошчваць каву ў сваіх садох і, ня гледзячы на запэўненьні навукоўцаў, што кава можа высьпяваць толькі ў трапічным клімаце, гэтая расьліна прыжылася, высьпявае й дае неблагі ўраджай. Ну, дзе яшчэ ў Эўропе можна пабачыць збор ураджаю кавы?

З сэрбаў часам можна пасьмяяцца. Напрыклад, з чарнагорска-японскай вайны. Пачалася яна ў 1904 годзе, якраз на наступны дзень пасьля таго, як Расейская імпэрыя абвясьціла вайну Японіі. Маленькая, правінцыйная, але на той час вельмі ваяўнічая сэрбская дзяржава Чарнагорыя не захацела заставацца ўбаку ад гэтага канфлікту й таксама абвясьціла вайну краіне ўзыходу сонца. Да баталіяў ані на моры, ані на сушы справа не дайшла. Японія далёка нават паводле сёньняшніх мерак, а дазволіць сабе даслаць на другі бок сьвету свой ваенны флёт можа толькі вельмі багатая й вельмі зацікаўленая ў канфлікце дзяржава, якой Чарнагорыя ніколі не была.

Прайшлі гады, скончылася расейска-японская вайна, прагрымелі першая й другая сусьветныя войны, а чарнагорцы нават і не здагадваліся, што на працягу 70-ці гадоў ваююць з далёкай краінай. Гэтая вайна магла працягвацца бясконца, калі б у пачатку сямідзясятых супрацоўнікі японскага міністэрства замежных спраў выпадкова ня трапілі на дакументы, у якіх чорным па белым было напісана, што Чарнагорыя парывае дыпляматычныя сувязі зь Японіяй ды абвяшчае ёй вайну. Падпісаньне мірнага пагадненьня, якое адбылося ў Цітаградзе, тэлеграфныя агенцтвы абыйшлі увагай. Пра гэты гістарычны казус маўчаць слоўнікі, энцыкляпэдыі й падручнікі па сучаснай гісторыі. Маўчаць, бо іх цікавяць войны. Тады, калі гінуць людзі, адбываецца перакрой межаў — сама гісторыя. А вайна бяз трупаў — хіба гэта вайна? Гісторыкі прагнуць крыві...



ПАЎСТАВАНЬНЕ НАЦЫІ

Працяг са старонкі 9

імпэрыі захавала клясічную культуру й грэцкую мову як мову праваслаўнае царквы й лінгва франка ўсходняга Міжземнамор'я. Толькі ў IX ст., калі лацінамоўныя правінцыі былі страчаныя, а ўласна грэцкая тэрыторыя захопленая славянамі ды албанцамі, грэцкая мова стала мовай суду й адміністрацыі ў Канстантынопалі. Так мова і культура сталі «лякаматывамі» для ўзнаўленьня перарванай грэцкай цэласьці, этнарэлігійнае ўсьведамленьне якой было ўзмоцненае лацінскай ды ісламска-турэцкай пагрозамі апошніх гадоў Візантыйскай імпэрыі.

Пасьля 1453 г. грэцкая культура сталася злучаючым асяродкам усіх грэцкамоўных супольнасьцяў у самой Грэцыі ды ў дыяспары. Грэцкі асяродак, які захавала й накіроўвала праваслаўная царква й патрыярхат, уважаўся за адметную этнарэлігійную супольнасьць, за народ Кнігі. Разам з тым, захаваўшыся праз візантыйскае праваслаўе, грэцкая сьвядомасьць тым жа праваслаўем была адасобленая ад новых палітычных праяваў. Праявы гэтыя ў выніку прыйшлі зь не-царкоўнага асяродзьдзя, ад інтэлектуалаў кшталту Рыгаса Ферэяса ды Адамантаса Карэяса. Іхная мадэль, падобная на эру Пэрыкла ў старажытных Атэнах, была сэкулярнай і палітычнай.

Новы стратум — грэцкая інтэлігенцыя й прадпрымальнікі — узялі кіраўніцтва над стварэньнем грэцкай дзяржавы пад сьцягам сэкулярнага нацыяналізму, які шукаў натхненьня ў клясычнай Грэцыі. Нацыяналізм зьявіўся прадуктам таго стратуму й тых ідэалаў, што былі выключаныя з палітычнай сфэры. Ён мусіў грунтавацца на культурах, зьвязаных з гутарковай мовай, ды на этнагістарычнай спадчыне.

Амэрыканскія калёніі, заснаваныя імігрантамі, што ўцякалі ад рэлігійнага перасьледу ў Англіі й Эўропе, зьяўляюцца прыкладам эмігранцка-асадніцкага кірунку. Гэтыя пурытанскія паселішчы сфармавалі свабодную этнію, што абапіралася на агульную мову, звычаі й вераваньні. Нягледзячы на ўсе разыходжаньні, пасяленцаў яднала пачуцьцё вызначанага лёсу. Да Вайны за Незалежнасьць пачуцьцё пераемнасьці, сягаючы ў часы Айцоўпілігрымаў ды іхных пурытанскіх ідэалаў, зрабілася істотным кампанэнтам сьвядомасьці белых амэрыканцаў. Гэтае пачуцьцё перажыло ня толькі выпрабаваньне Грамадзянскай вайною, але й масавы наплыў эмігрантаў у канцы XIX-га ст. У іншых эміграцка-асадніцкіх грамадзтвах — Аўстраліі, Канадзе (па-за Квэбэкам), Паўднёвай Афрыцы — першапасяленцы зрабіліся асноўнымі агентамі фармаваньня нацыі як з дапамогай дзяржаўнай улады, так і безь яе.

Тры гэтыя мадэлі вымагаюць этнічнай асновы, мітаў аб этнічных вытоках, аб абранасьці й залатым веку. У большасьці выпадкаў мы можам прасачыць стадыі этнагенэзу, этнічнай кансалідацыі, грамадзкага заняпаду й нацыянальнага аднаўленьня, якое прыводзіць у эру сучасных нацыянальных дзяржаваў. У некаторых выпадках гэтыя працэсы займаюць некалькі стагодзьдзяў, у іншых — некалькі дзесяцігодзьдзяў. Стадыі часам могуць перакрывацца. У пераходзе ад этніі да нацыі няма нічога непазьбежнага, і было б сур'ёзным неразуменьнем што да непрадказальнасьці нацыяналізму імкнуцца ўводзіць нейкі сацыяльны або культуральны закон этнічнай эвалюцыі ў тое, што заўсёды зьяўляецца выпадковым працэсам.

Тым ня менш, магчыма вызначыць пэўныя ключавыя працэсы ў фармаваньні большасьці нацыяў. Існуюць працэсы адміністрацыйнай і эканамічнай рэвалюцыі, якія спрыяюць бюракратычнай інкарпарацыі моцнай дзяржавай, заснаванай на гарызантальнай этніі. Тут культура вышэйшых клясаў прасочваецца ўніз, у іншыя слаі, і навонкі, да пэрыфэрыйных тэрыторыяў і народаў, часта праз заваяваньне й анэксію, як здарылася ў Брытаніі й Францыі. На гэтым шляху бюракратычная дзяржава займае цэнтральнае становішча й робіцца асноўным агентам па ўтварэньні тэрытарыяльнай нацыі й бюракратычнага нацыяналізму. Вэртыкальныя этніі трансфармуюцца ў нацыі праз культурную рэвалюцыю, якую ўзначальвае інтэлігенцыя. Гэта вынікае ў мабілізуючы зрух «народу» праз інтэлігенцыю, што абапіраецца на адшуканьне ягонай этнічнай спадчыны. Заціснутыя паміж традыцыяй і вэстэрнізацыяй, інтэлектуалы-тубыльцы імкнуцца вырашыць свой уласны крызыс сьвядомасьці праз пераасэнсаваньне гісторыі й культуры іхняга грамадзтва, або праз узнаўленьне пашкоджанай этнагістарычнай пераемнасьці.

На пазьнейшым этапе інтэлігенцыя ўспрымае гэтыя канцэпты й распаўсюджвае іх дзеля мабілізацыі шырэйшых колаў грамадзтва. Гэта зьдзяйсьняецца праз тое, што культура грамадзтва пачынае служыць палітычным мэтам, для якіх яна не была прыстасаваная. З гэтым зьвязаны трэці вядомы працэс, працэс этнічнай пурыфікацыі. Ён пачынаецца зь імкненьня ачысьціць культуру грамадзтва ад чужых элемэнтаў і канчаецца вычышчэньнем самога грамадзтва ад усяго чужога й староньняга.

Эміграцка-асадніцкі шлях зьяўляецца варыянтам «вэртыкальнай» простанароднай мадэлі, але разам з тым і значна розьніцца ад яе. Асноўным сродкам нацыянальнай трансфармацыі тут зьяўляюцца першапасяленцы-утапісты, якія атаесамляюць сваё новае асяродзьдзе зь зямлёй абяцанай, якая ўтвараецца праз іхняе дбаньне, але звычайна за кошт абарыгеннага насельніцтва. Новае асяродзьдзе выклікае ў эмігрантах-асадніках пачуцьцё адмысловасьці сваёй культуры й лёсу. Моўная асыміляцыя й акультурызацыя прыбышоў падкрэсьлівае іхную адрознасьць ад «мацярыстай краіны», гэтак як у Аўстраліі, Канадзе й Аргентыне.

Тры гэтыя шляхі фармаваньня нацыяў непазьбежна даюць тры тыпы нацыянальнай сьвядомасьці. Першы, грамадзянскі

PASSIM...

Антон Сіюль

I.

Антуан Вато памёр у 1721 г., ва ўзросьце трыццаці сямі гадоў. Адна з позьніх і лепшых яго працаў — шыльда. Шыльда для крамы «Du Grand Monarque» ягонага сябра антыквара Жэрсэна. Узорная шыльда для крамы сталася апалёгіяй Мастацтва, якому Вато аддаў жыцьцё.

... Па сьценах крамы разьвешаныя палотны ўлюбёных ягоных майстроў і ягоныя ўласныя. На іх тле разгорнутыя ўжо рэчаісныя сюжэты: вось сам Жэрсэн, ягоная жонка, наведнікі, адзін зь якіх з празмернаю ўвагай узіраецца праз лярнэт у якасьці пісьма нейкае пастаралі, прысеўшы знарок на калена, пакоўшчыкі складуюць у скрыню ўжо не патрэбны партрэт Людовіка XIV (іранічная алюзія да назвы крамы), на што задуменна заглядзеўся носьбіт з кіёчкам. Мастак не забыўся кінуць пук саломы на брук перад уваходам, пакласьці сабаку, які ловіць блохаў, расхінуўшы адлегласьць паміж існаваньнем і мастацтвам. Яны, аб'яднаныя ў штучную прастору, нібы ахінутыя срабрыстым вэлюмам, што зіхціць тысячай адценьняў. У трапяткім прыцемку суха пабліскваюць залачоныя рамы, у якіх, нібы ў аскепках люстэрка, шматкроць памножаныя мастакамі прасторы адбіваюць чалавечыя летуценьні й жарсьці...

Гэта першы жывапісны твор, дзе тэмаю сталі жывапісныя творы. Жывапіс як сюжэт жывапісу. Але перадусім Вато вызначае яго месца, суадносіць з рэаліяй атачэньня. Сваёй канцэптуальнасьцю гэты твор апярэдзіў пазьнейшыя пошукі эўрапейскае культуры. Але гэта ня дзіва (заўсёды нехта першы). Дзіўнае тое, што гэта ацанілі сучасьнікі Вато. Шыльда правісела нядоўга: уважаючы на яе вартасьць, яе рупліва захавалі. Пазьней, падзеленая напалам, яна была вывезена з Францыі.

Кароль Людовік XIV памёр у 1715 г... Аднаго разу, стоячы на парадзе, ён прыйшоў у такое захапленьне ад харвацкіх гвардзейцаў, якія геройчна змагаліся ў бясконцых кампаніях за караля-сонца, што пазычыў у аднаго зь іх шалік і дэманстратыўна павязаў яго сабе на харвацкі манэр. Каралеўская даніна павагі да сваіх абаронцаў у момант была падхопленая дваром. Cravate стаў неўзабаве неад'емнаю часткай эўрапейскага цывільнага строю. Харвацкія гвардзейцы, між тым, пасьпяхова выконвалі свае абавязкі і ў Фляндрыі, мімаходзь спусташаючы разам зь іншымі й ваколіцы Валянсьена, дзе некалі ў сям'і кровельніка нарадзіўся Вато. Пасьля чарговага вайсковага нашэсьця ў 1701 г., зусім яшчэ юнаком Антуан Вато мусіў пакінуць гэты нішчымны край.

Здавалася б, мастаку павінна было хапіць дзіцячых ды юнацкіх успамінаў пра вайну на доўгае жыцьцё. Аднак ён абраў для сябе іншы сьвет. Сьвет тэатру, сьвятаў і паркаў, сьвет, дзе адвечны калаўрот бестурботнасьці, бязважкасьці, сьвет, дзе нават пыл залаты. Яго «Паломніцтва на выспу Цытэру» так далёка апынулася ад умоўнасьцяў «жанру», што паставіла ў тупік сучасьнікаў. Пусты вадэвіль пра трох кузінаў, якіх Афрадыта запрасіла ў падарожжа на яе выспу, дзе нібыта кожны напаткае каханьне, стаў мастаку нагодай для фантастычнай фээрыі. Тут усё ад пачатку да канца толькі вынік яго ўяўленьня. Тут прыдумана ўсё: дрэвы, караблі, строі й паветра. Вато нават вымысьліў колеры: алійкава-ружовы, бэзава-жоўты, gris perle (пэрлавінава-шэры), нават saumon (ласасёвага мяса). Усё гэта нямала зьдзівіла акадэмікаў, што прыдумалі для Вато нягеглае званьне «майстар галянтных сьвяткаваньняў». На тым і разыйшліся.

Аказалася, Вато меў рацыю. Мастацтва павінна быць найперш цікавае, а не зразумелае... Выламаныя постаці актораў, дамаў з кавалерамі, што здавалася б павінны былі толькі пырскаць сьмехам ў тым фантастычным сьвеце, у якім яны жылі, раптам паўсталі поўныя невыноснай самоты. Ці прадчуваў мастак недалёкую будучыню сваёй радзімы, у якой не было б месца ні яму, ні ягоным летуценьням?.. Што мог бы распавесьці нам ягоны Жыль, што з такой тугою глядзіць праз нас, нібы нас і няма?..

Перад сьмерцю мастак абачліва зьнішчыў вялікую колькасьць сваіх карцінаў і малюнкаў, якія палічыў недасканалымі.

Пасьля караля Людовіка XIV застаўся гальштук ад харватаў, разумнага тлумачэньня якому сёньня ўжо не знайсьці.

Наступнае мастацтва пайшло дыямэтральна ў іншым кірунку. Яно ймкнулася да адназначнасьці, прагнучы прэпараваць сюжэт, колер, форму. Мастацтва стала сродкам спасьціжэньня псыхікі, гісторыі, афтальмалёгіі ды г. д. Неадназначнасьць, невытлумачальнасьць сталіся заганамі. Ад дывізіяністаў мастацтва наогул перастае быць таямніцаю, кожны творца ўжо ў стане распавесьці што й навошта ён зрабіў... Колеры выціскаліся з натуры, як сок з памаранчу, але й гэтага было малавата. Урэшце «кветкі й садавіна» сталі жменяю полівітамінаў.

На разьвітаньне Гаген кінуў: «Колер хакі — колер зацьвілае эўрапейскае цывілізацыі...» Але гэта НАШ колер. Адназначна.

II.

Вы каму спачуваеце ў Босьніі? Таму, у каго меней зброі? Ці таму, хто ня першы пачаў ствараць канцэнтрацыйныя лягеры? Ці тым, хто, помсьцячы за сваіх родных, забівае родных чужых?

Плятон у сваіх дыялёгах «Дзяржава» абгрунтаваў неабходнасьць гвалту над суседзямі патрэбаю мець удосталь пашаў і выганаў. Але паколькі гэта можа суседзям не спадабацца, альбо ім у галаву прыйдзе такая ж думка, то на такія выпадкі трэба ўтрымліваць войска.

Агрэсіўнасьць — натуральная чалавечая якасьць, як і безьліч іншых, жадаем мы іх альбо не. Цывілізаванасьць жа выяўляецца ў арганізаваных формах гвалту. У мінулым стагодзьдзі філёзафы й гісторыкі «адкрылі» ролю гвалту ў фармаваньні чалавецтва. Так званыя тэорыі гвалту вытлумачылі праз яго зьяўленьне клясаў, дзяржавы й цывілізацыі наогул. Адныя рабілі ўпор на нутраным гвалце, г. зн. на гвалце адных супляменьнікаў над астатнімі (Дзюрынг), другія — на зьнешнім, на зьнішчэньні слабейшых плямёнаў (Гуімпловіч, Каўцкі...). Завязалася славутая палеміка з марксыстамі. Марксысты, ня могучы ігнараваць ролю агрэсіі ў міжчалавечых кантактах, настойвалі на матэрыяльнай вытворчасьці як стрыжні фармаваньня грамадзтва. Каб яно было так, то першымі правадырамі калматых плямёнаў сталі б булачнікі, цесьляры ды бортнікі. Зь іншага боку, каб не было вытворчасьці — не было б чаго адбіраць. Пабуджальныя матывы натуральнага гвалту — зайздрасьць і пажада. Нашчадкі Каіна апынуліся, праўда, надзвычай шматлікія. Цывілізацыі давялося заняцца масавым тэрорам (ад часоў Плятона). Бо спакусу гвалту можна спыніць толькі зьнішчэньнем жаданьняў.

Разгляд праблемы агрэсіўнасьці культуролягамі, гісторыкамі, псыхіятрамі й нават архітэктарамі прыводзіць да простае канстатацыі: у сацыяльных заганах вінаватыя ня самі трушчобы, а тыя носьбіты гэтых заганаў, якія й ствараюць трушчобы. Спробы ігнараваць прыроду сканчаюцца драмай, тым большай, чым большыя памеры экспэрымэнту. Амэрыканскі сацыёляг Мілтан Эйзэнхаўэр, аўтар фундамэнтальнае працы «Гвалт у Амэрыцы: гісторыя й сучаснасьць» даводзіў, што гвалт і гатовасьць індывіда яму супрацьстаяць ёсьць неад'емнаю часткай амэрыканскае гістарычнае традыцыі, адным з складнікаў нацыянальнага мэнталітэту. На падставе сацыялягічнага дасьледаваньня, Эйзэнхаўэр ня толькі выявіў схільнасьць да агрэсіі ва ўсіх станах і этнічных групах Амэрыкі, але й прыйшоў да высновы, што ў іх прапорцыі злачыннасьці вельмі стабільныя й ніколі не пераходзяць крытычнае мяжы. Большую індывідуальную агрэсіўнасьць амэрыканцаў у параўнаньні з жыхарамі Старога Сьвету сацыёляг тлумачыць шэрагам фактараў, сярод якіх і традыцыі дзяржаўнасьці, дзякуючы якім Амэрыка не зазнала масавых рэпрэсіяў у дачыненьні да сваіх грамадзян, чужое акупацыі.

Другі амэрыканец, культуроляг Уол-Рокіч нават увёў у абарачэньне тэрмін «субкультура гвалту», для вызначэньня зьвязаных з агрэсіўнасьцю амэрыканскіх стэрэатыпаў паводзін, этыкету, праяваў у мастацтве.

Свая субкультура гвалту ўласьцівая любому этнасу. Этнографы мінулага стагодзьдзя з замілаваньнем люлялі міт пра рахманасьць беларусаў. Зыходзячы з такога ўяўленьня, цяжка вытлумачыць, на чым грунтавалася гатовасьць беларусаў у XVIII—XIX стст. вырашыць свой лёс радыкальнымі мілітарнымі сродкамі. Адкуль узялася такая плеяда: Каліноўскі, Грынявіцкі, Савіцкі, Прытыцкі?..

Ня трэба быць этнографам, каб ведаць, што беларуская моладзь часам вельмі жорстка ўсталёўвае адносіны між сабою, пры гэтым аддаючы перавагу групавым бойкам. Існуюць і свае этычныя абмежаваньні: не дабіваць ляжачага, не ўжываць халоднае зброі. У той жа час кол альбо штакеціна — звычайны рыштунак. Спэцыфіка субкультуры навідавоку.

Больш складана вызначыць патэнцыяльную ступень агрэсіўнасьці ва ўнутранай ды зьнешняй палітыцы Беларусі. Досьвед папярэдніх часоў тут мала надаецца. Сёньняшняя беларуская дзяржаўнасьць ня мае папярэдняе традыцыі, яна не перанятая ні ад ВКЛ, ні ад БНР. Гэта цалкам новыя ўмовы. Геаграфічны цэнтар, да прыкладу, моцна зрушаны на Захад у параўнаньні з этнічным абшарам беларусаў на пачатку XX ст., па-за палітычнымі межамі засталіся Вільня, Беласток, Дзьвінск, усходнія тэрыторыі. Ужо толькі гэта дэтэрмінуе зусім іншыя падыходы да нацыянальнага будаваньня. Па-сутнасьці, сёньня нараджаецца новая нацыя. Нацыя безь мінулага, у якім можна было б разгледзець якія-небудзь шляхі. Раптоўна апынуўшыся сама з сабою, Беларусь не пасьпявае зірнуць у люстэрка, штораз азіраючыся назад (на 10, 40, 100, 250 гадоў). Доўгі час беларусы, стаўшы ахвярамі чужога гвалту, маглі альбо мірыцца альбо адказваць гвалтам. XX ст. паставіла гэтую альтэрнатыву рубам. Заўтра на зьмену пакаленьням, змарнелым, стомленым, абачліва інэртным, прыйдзе новае, зь нявыплеснутай вонкі агрэсіяй. Хто стане яго героямі? Леў Сапега? Каліноўскі? Машэраў? Пазьняк? Альбо чарапашкі-ніндзя? Калі ня хопіць пашаў і выганаў...

тып, знаёмы нам па Заходняй Эўропе, зыходзіць з прынцыпу грамадзянства па тэрытарыяльнай прыкмеце. Нацыя тут — гэта патрыя, бацькаўшчына, зямля бацькоў. І хоць гензалягічны аспэкт можа таксама ўлічвацца, але большае значэньне надаецца гістарычнай тэрыторыі, радзіме, акрэсьленай пэўнымі натуральнымі межамі ды прысутнасьцю бюракратычнай дзяржавы. Пражываньне на зямлі бацькоў робіцца асноўным крытэрыем для членства ў нацыі, а пазьней — для грамадзянства. Пражываньне гэтым вылучаецца ад паходжаньня. Такім чынам, у грамадзянскай нацыі іншаземцы ды меншасьці могуць набываць правы грамадзянства праз доўгатэрміновыя зносіны, грамадзянскую ляяльнасьць і ўдзел у грамадзкай культуры.

Грамадзянскія нацыі бачаць сябе як грамадзтвы з агульнымі для ўсіх законамі. Этнічныя нацыі, наадварот, падкрэсьліваюць калектыўную лучнасьць праз паходжаньне. Індывіды зьяўляюцца членамі этнічнай нацыі толькі тады, калі яны лічаць сябе й лічацца іншымі як нашчадкі першых, заснавальніцкіх гензрацыяў грамадзтва, што маюць агульныя вытокі. І цалкам няважна, што продкі й вытокі хутчэй уяўныя, чым рэальныя. Міт аб агульных вытоках і паходжаньні быў абраны за вызначальны крытэрый самой нацыі. Адсюль вынікае неабходнасьць вылучэньня членаў этніі й супрацьстаўленьня не-членам, якія не стасуюцца да вызначальнага міту, нават жывучы значны час на дадзенай тэрыторыі. Там, дзе лічыцца неабходным, нацыя вычышчаецца ад кантамінацыі чужакамі. Этнічнае ачышчэньне ўваходзіць у лёгіку гензалягічна вызначаных нацыяў.

Этнічныя нацыі выяўляюць палкую адданасьць народнай культуры ды этнагісторыі. Набыцьцё гэтай культуры й гісторыі для кожнага члена робіцца палітычным абавязкам, тэстам «сапраўднасьці паходжаньня» й калектыўнай ляяльнасьці. Гэта ёсьць спадчына простанароднай этніі, зь яе востра акрэсьленымі межамі і пазаклясавай культурай. Разам з тым гэта й вынік доўгай барацьбы за прызнаньне, якую вялі столькі меншых этніяў, і той ролі, якую адыграла мабілізацыя масаў праз інтэлігенцыю. Калі фіны й чэхі, баскі й армяне пачынаюць вызваляцца ад улады дзяржаваў, у якія яны доўгі час былі інкарпараваныя, то іхняя інтэлігенцыя мусіць заклікаць народ як цэлае — праз аднаўленую народную культуру — да канфрантацыі зь дзяржавай і зьмяненьня палітычнае мапы.

У трэцім тыпе — плюралістычнай нацыі — пражываньне й этнічнае паходжаньне падпарадкаваныя, прынамсі тэарэтычна, усеахопнай грамадзянскай рэлігіі. У той жа час дзяржава падтрымлівае інстытуцыяваныя этнічныя культуры. Нацыя складаецца з сэрыі даволі розных іміграцкіх фрагмэнтарных этніяў, якія захоўваюць элемэнты сваіх першапачатковых культур, прыстасаваныя да новых умоваў. Але індывіды перш аддаюць перавагу грамадзкай, масавай культуры. Прадстаўнікамі гэтага тыпу зьяўляюцца перш за ўсё аўстралійцы, амэрыканцы й аргентынцы, затым — ірляндцы, немцы або яўрэі.

На практыцы грамадзкая культура гэтых «плюралістычных» нацыяў у значнай ступені зьяўляецца спадчынай дамінуючай першапасяленскай культуры. Ангельскія пасяленцы ў Аўстраліі, Амэрыцы ды Канадзе (па-за Квэбэкам) дыктавалі культурнае разьвіцьцё й кіравалі грамадзтвам і палітыкай задоўга да наплыву пасяленцаў зь іншых этніяў. Культура іхніх нашчадкаў працягвае вызначаць мову, сымбалі й цырымоніі, а таксама праўны статус новай плюралістычнай нацыі пасяленцаў-імігрантаў.

Гэтыя тры ідэалізаваныя тыпы нацыянальнай сьвядомасьці ўтварыліся з розных мадэляў фармаваньня нацыі. Сапраўдныя, не ідэалізаваныя нацыі часта спалучаюць элемэнты ўсіх гэтых тыпаў. Але гэтыя тыпы даюць нам уяўленьне аб тым, што нацыяналізм ня ёсьць нечым уніфікаваным, што існуе разнастайны нацыянальны вопыт, і адсюль — разнастайная нацыяналістычная палітыка.

Неабходна адзначыць, што прагноз адносна перавагі грамадзянскага й плюралістычнага тыпаў нацыі ня спраўджваецца. Апошнія некалькі гадоў выявілі літаральна выбух формаў нацыяналізму, якія патрабуюць стварэньня або аднаўленьня менавіта этнічных нацыяў на аснове простанародных этніяў. Не дазваляючы сабе зачаравацца эмацыйнай узьнёсласьцю моманту, мы тым ня менш ня мусім выпускаць з-пад увагі цяперашнія й будучыя хвалі этнічнага нацыяналізму як нечага другаснага ў вялікай плыні сучаснай гісторыі. Гісторыя сучаснага сьвету, пачынаючы ад Францускай рэвалюцыі, бачыла шмат разоў выбухі этнічнага пратэсту й этнічнага нацыяналізму ў розных частках зямное кулі, і таму было б занадта пасьпешліва прадказваць ім хуткі канец. Падабаецца гэта ці не, але нацыя застаецца галоўнай дзейнай асобаю ў сусьветных падзеях і галоўным носьбітам сацыяльнага й палітычнага разьвіцьця. Этнічныя асаблівасьці застаюцца галоўнай крыніцай мабілізацыі масаў.

Нацыяналізмы, зь якімі мы мусім паразумецца сёньня, выходзяць з больш старых і больш глыбокіх каранёў, чым уяўлялі сабе многія з нас. З гэткімі глыбокімі падмуркамі нацыянальная ідэнтычнасьць наўрад ці зможа хутка засохнуць або лёгка трансмутаваць у палітычныя аб'яднаньні вышэйшага парадку. Мы мусім прыйсьці да разуменьня й прымірэньня з этнічнай ідэнтычнасьцю й нацыяналізмам ды выбудоўваць між-нацыянальны парадак як мы маем яго сёньня, — альбо зноў і зноў паўтараць памылкі ды расчараваньні.

Пераклаў з ангельскае Віталь Зайка.

КНІЖНЫ РЫНАК У ІСЛЯНДЫІ

Хальдоўр Гудмундсон

Дзякуючы стараньням і дапамозе нашага Сталага Аўтара з Эўрапейскага Крайняга Захаду, адбыўся кантакт «НН» з блізкім ёй паводле духу й зьместу валійскім выданьнем — двухмесячным часапісам PLANET, што выходзіць у Абэрыстўіце, Валія. Трымаючыся дарагіх нашаму сэрцу прынцыпаў рацыянальна-касмапалітычнага нацыяналізму, прапануем адну з публікацыяў часапіса. Спадзяемся, не апошні раз.

«Празьмерны рост кніжнай прадукцыі стаўся прычынаю сур'ёзнага непакою тут, у Ісляндыі».

Тыя, хто піша пра культуру, часам засмучаюцца, калі ім здаецца, што яна выходзіць з-пад кантролю, калі яны бачаць, што нейкі яе аспэкт квітнее больш, чым належала б дзеля спакою й стабільнасьці грамадзтва. Пададзенае вышэй выказваньне рэдактара аднаго зь вядучых культурных часапісаў свайго часу ў Ісляндыі — прыклад такой міжвольнай рэакцыі з боку кіраўнікоў культуры, і яго ня варта было б цытаваць, калі б яно не было напісанае ў 1925 годзе. Калі празьмерны рост кніжнага рынку быў прычынай непакою тады, дык той рэдактар мусіць падзякаваць сваёй шчасьлівай зорцы, што ён не жыве сёньня, калі колькасьць афіцыйна зарэгістраваных выдавецтваў — а значыць, без уліку прыватна выдрукаваных выданьняў — пераваліла за пяцьдзесят, а сьпіс сяброў Саюзу Пісьменьнікаў Ісляндыі распачаў ужо трэцюю сотню.

І аднак сёньня рэдка можна было б пачуць галасы накшталт зацытаванага вышэй. Бурлівую дзейнасьцю на ісляндзкім кніжным рынку запалоханыя галоўным чынам замежнікі. Як і ўсё астатняе ў ісляндзкім жыцьці, гэтая дзейнасьць мае свае значныя ўзьлёты й падзеньні, яна поўная неасьцярожнае амбітнасьці, яна выяўляе адначасна слабую здольнасьць да выжываньня й асалоду пладавітасьці, што мяжуе з вар'яцтвам — і ў дадатак да ўсяго залежыць ад цэнаў на рыбу на замежных рынках.

Неяк я прабіраўся праз залы неабдымнага Франкфурцкага Кніжнага Кірмашу зь велізнаю кнігай пра птушак Ісляндыі, на 300 старонак, у чатырох колерах — сапраўднае шыкоўнае выданьне — калі да мяне падыйшоў дацкі калега й запытаўся, колькі грошай уклаў у гэтую кнігу Ісляндзкі ўрад. Пачуўшы, што ўрад ня даў ні шэлегу, ён пакачаў галавой: лухта, ніхто не паверыць, што такое магчыма ў цывілізаванай краіне з доўгай традыцыяй кнігадрукаваньня — аднак гэта дакладна характарызуе ісляндзкую сытуацыю.

І ўсё ж, ці кніжны рынак у Ісляндыі й сапраўды такі вялікі? Праўда, што ісляндцы амаль ва ўсім прызвычаіліся біць сусьветныя рэкорды, калі браць пад увагу колькасьць насельніцтва, але гэта, магчыма, больш сьведчыць пра маленькасьць краіны, чым пра дасягненьні яе жыхароў. Праўда, што ў Эўропе ня знойдзецца такога асобна ўзятага гораду з 250 тысячамі жыхароў, які мог бы пахваліцца такім аб'ёмам кніжнай прадукцыі, як у Ісляндыі, але такія гарады не складаюць асобнае моўнае прасторы або незалежных дзяржаваў. Менавіта гэты просты факт, а ня тое, што ісляндцы больш таленавітыя або большыя чытачы за іншыя народы, вызначае адмысловае становішча ісляндзкага кніжнага рынку.

Наколькі вялікі гэты рынак? Мы прызвычаіліся лічыць, што ў Ісляндыі штогоду выходзіць каля 1000 новых кніг. Паводле апошняе даступнае мне статыстыкі, з 1986 і 1987 гадоў, гэта недалёка ад праўды. Сярэдні паказьнік за гэтыя гады — 1250 кніг і брашураў (зь якіх кнігі складаюць тры чвэрці), 1000 зь якіх выйшлі першым выданьнем. Гэтыя лічбы ўлучаюць усё — ад арыгінальных літаратурных твораў да спэцыялізаваных буклетаў для прафсаюзных арганізацыяў. Крыху больш за сотню складалі дзіцячыя кнігі, 50 — школьныя падручнікі. Як бы там ні было, гэта вельмі значная колькасьць публікацыяў, прапарцыянальна большая, чым у любой суседняй краіне.

Мы напэўна не памылімся, калі скажам, што ў Ісляндыі штогод прадаецца мільён асобнікаў новых кніг, у грубым падліку чатыры кнігі на чалавека. Улічыўшы ўсё гэтае, можна сьцьвярджаць, што сёньня ня так ужо й кепска быць выдаўцом або аўтарам у Ісляндыі і што нашы замежныя калегі часам глядзяць на нас з зайздрасьцю ўвачччу.

Гэта што да памераў рынку. Але чым асаблівым вылучаецца ісляндзкі кніжны рынак? Найперш, ён сапраўды неверагодна малады й якраз пачаў набываць свае абрысы, калі былі напісаныя словы, што цытаваліся на пачатку гэтага артыкулу. Кнігадрукаваньне ў больш-менш істотных маштабах пачалося тут даволі позна — першы ісляндзкі раман выйшаў з друку ў 1850 годзе, а другога — павольнага працягу першага — давялося чакаць яшчэ дваццаць гадоў. На пачатку дваццатага стагодзьдзя найбольш уплывовыя ісляндзкія пэрыёдыкі ўсё яшчэ выдаваліся ў Капэнхагэне й дасылаліся ў Ісляндыю марскім шляхам, аднак пасьля ўсё пачало мяняцца, і кнігадрукаваньне пачало разьвівацца паралельна з ростам клясы буржуазіі й павышэньнем узроўню агульнае адукацыі. У першыя дзесяцігодзьдзі гэтага стагодзьдзя былі заклаdзеныя першыя мясцовыя рыбныя кампаніі, што паспрыяла поступу адукацыі; у 1911 годзе, прыкладам, быў заснаваны Ісляндзкі Ўнівэрсытэт. Здабытая ў 1918 годзе сувэрэннасьць прынесла з сабою палітычную незалежнасьць, а Дваццатыя сталіся часам вялікага розруху ў ісляндзкім культурным — і разам з тым літаратурным — жыцьці.

Якраз у тыя часы па вуліцах Рэйк'явіка самавіта пахаджаў першы чалавек, які зрабіў сабе прафэсію зь пісаньня кніг, які жыў з прыбыткаў ад іхнага продажу і зь нерэгулярных дзяржаўных датацыяў. Гэты зялёны маладзён часта фарсіў у даўгім плашчы й шыракаполым капелюшы, а часам нават з панаватым кійком і лярнэткай. Праз трыццаць гадоў гэты чалавек, Хальдоўр Лахснэс, атрымае Нобэлеўскую прэмію ў літаратуры.

Ад таго часу на працягу шасьцідзесяці гадоў кнігавыдавецкая справа ў Ісляндыі разьвівалася няспынна й інтэнсыўна, так што сёньня краіна мае, калі ўзяць пад увагу колькасьць насельніцтва, тыпова заходні выдавецкі рынак. Яго адносная маладосьць надалей дае сябе адчуць, як з добрага, гэтак і з кепскага боку. Адмоўнае выяўляецца ў слабасьці сыстэматычных мэханізмаў і доўгатэрміновага пляніваньня; станоўчае — у ступені адкрытасьці рынку да аднаўленьня, у тым, як лёгка ў ім заняць сваё месца й стацца «каралём на адзін дзень».

Другая важная адметнасьць ісляндзкага кніжнага рынку тлумачыць чаму, хоць ісляндцы купляюць больш кніг, чым людзі ў іншых краінах, так і застаецца невядомым, што яны зь імі робяць — бо наўрад ці яны чытаюць больш за іншыя народы. Проста рэч у тым, што ўжо доўгі час кнігі ў Ісляндыі — найпапулярнейшы калядны падарунак. Як і іншыя народы, што жывуць там, дзе дні ўзімку кароткія, ісляндцы любяць гуляць у Калядных Дзядоў, і нават самы нялюбы й нязносны сваяк заўсёды атрымвае свой падарунак. Традыцыйнаю азнакаю калядгае шчодрасьці даўно сталася дараваньне кніг. Гэта дапамагае растлумачыць адмысловасьць рынку, а таксама тое, чаму ісляндцы — да самага нядаўнага часу — не задавальняюцца кішэннымі выданьнямі ды ўвогуле глядзяць на танныя кнігі зь недаверам. Дзеля гэтае прычыны нават пераклады трылераў сшываюцца, укладаюцца ў дарагую кардонную вокладку з залатымі літарамі на сьпінцы й забясьпечваюцца супэрвокладкай. У выніку гэтага яны робяцца ў чатыры разы даражэйшыя, чым у Вялікабрытаніі — але яны пакуюцца ў калядныя падарункі.

Цяжка дакладна вызначыць месца, якое займаюць Каляды ў кніжным рынку ў цэлым, аднак можна з пэўнасьцю сьцьвярджаць, што яны адыгрываюць вырашальную ролю ў продажы арыгінальнай і перакладной прозы, папулярна-пазнавальнай літаратуры й дзіцячых кніг. Тры чвэрці кніг у гэтых катэгорыях выдаюцца ў лістападзе й сьнежні, і нехта нават аднойчы падлічыў, што 7 % ад усіх рэалізаваных за год у краіне кніг агульнага попыту былі прададзеныя ў дзень Сьв. Торлака, 23 сьнежня, апошні гандлёвы дзень перад Калядамі.

Гэта, вядома ж, стварае пэўныя цяжкасьці для выдаўцоў, якія мусяць цярпець розныя выдаткі праз увесь год і атрымваць прыбытак у апошнія два месяцы. Думаецца, што большасьць выдавецтваў зь цяжкасьцю працуе ў такіх умовах, і сапраўды, галоўная праблема, што стаіць перад ісляндзкімі выдаўцамі, — як знайсьці сродкі для фінансаваньня буйных доўгатэрміновых праектаў.

Трэцяя адметнасьць ісляндзкага кніжнага рынку зьвязаная з густамі чытачоў, якія найбольш аддаюць перавагу жыцьцяпісам сваіх землякоў. На працягу больш чым дзесяці гадоў ва ўсіх сьпісах папулярнасьці ў Ісляндыі пануюць біяграфіі, і таго выдаўца, які з ходу ня можа адказаць на пытаньне «Чыю біяграфію вы зьбіраецеся выдаваць сёлета?», сапраўды чакаюць змрочныя пэрспэктывы.

Найбуйнейшую катэгорыю кніг, што трапляюць на шырокі рынак, складае, ведама ж, проза. Калі яшчэ раз зьвярнуцца да згаданай раней статыстыкі, за кожны з 1986 і 1987 гадоў выйшла каля 200 раманаў. Зь іх менш за дваццаць былі ісляндзкія, а рэшта — больш за 90% — пераклады замежнае прозы. З другога боку, у кожным з гэтых гадоў выйшла ў сярэднім 50 біяграфіяў, зь якіх толькі 4 былі перакладамі. Ісляндцы амаль не цікавяцца біяграфіямі сусьветных славутасьцяў, папулярных на сусьветным рынку. Нават найбольшыя бэстсэлеры ў гэтай катэгорыі, як правіла, не перакладзеныя на ісляндзкую мову. Ісляндцаў значна болей цікавяць жыцьцяпісы іх землякоў, нават тых, хто не набыў сабе вялікай славы й ня мог бы пахваліцца выдатнымі дасягненьнямі. Тым ня менш, гэтыя творы зь нейкае прычыны кранаюць нас больш за іншыя; гэта тое жыцьцё, якое мы ведаем, а вельмі часта гэта й тыя людзі, якіх мы ведаем, і таму калядная кніжная пара часам можа ператварацца ў сьвята сустрэчаў з старымі знаёмымі.

Ведама ж, некаторыя напісаныя ў Ісляндыі біяграфіі — выдатныя літаратурныя творы, асабліва аўтабіяграфіі, аднак разам з тым біяграфічная гарачка часам дае й некаторыя непажаданыя вынікі. Так, сумна бачыць, як кніга інтэрвію, складзеная за шэсьць тыдняў пасрэдным журналістам, перамагае ў вайне передкаляднага продажу выдатны раман, які пісаўся тры гады. Аднак нельга спадзявацца, каб ісляндзкі кніжны рынак у дадатак да ўсяго астатняга быў яшчэ й справядлівы. З другога боку, ад таго часу, як Хальдоўр Лахснэс гуляў па вуліцах Рэйк'явіка, колькасьць прафэсійных пісьменьнікаў значна вырасла. Тых, хто зрабіў сабе кар'еру зь пісаньня бэлетрыстыкі й жыве цалкам за кошт ганарараў і ўрадавых стыпэндыяў, налічваецца каля трыццаці. Гэтую лічбу можна падвоіць, калі ўлучыць сюды тых, для каго пісаньне складае галоўны занятак, але хто час ад часу вымушаны шукаць іншага заробку на сваё ўтрыманьне. Сюды можна дадаць аўтараў школьных падручнікаў і папулярна-пазнавальнай літаратуры, а таксама шырокае кола тых, хто піша кнігі ў свой вольны час. Аднак нягледзячы на ўсе магчымыя складанасьці, я ня думаю, што ў сьвеце знойдзецца шмат месцаў, дзе б можна было так лёгка надрукаваць сваю кнігу, як у Ісляндыі. Нават калі не ўдалося б нічога іншага, заўсёды можна самому аплаціць друк а пасьля самому й разьнесьці сваю кнігу па кнігарнях, якія гандлююць бэлетрыстыкай.

З усяго, што я адзначыў, зусім відавочна, што выдавецкая справа ў Ісляндыі цалкам падпарадкоўваецца рынкавым законам. Яна зусім не падтрымваецца ўрадам і нават ня мае з гэтае крыніцы ніякіх пазыкаў. Горш таго, доўгі час яна цярпела ад значна вышэйшых, чым у іншых эўрапейскіх краінах, падаткаў — падатак ад продажу складаў 24%. 1 верасьня 1990 году адбылася гістарычная падзея, калі падатак ад продажу быў скасаваны для кніг *на ісляндзкай мове*, такім чынам прадажны кошт кнігі скараціўся на пятую частку. Гэта была вялікая перамога ісляндзкіх выдаўцоў і пісьменьнікаў у іх змаганьні за лепшыя ўмовы йснаваньня.

З другога боку, урад падтрымвае пісьменьнікаў, падобна да таго, як гэта робіцца ў іншых паўночных краінах: пісьменьнікі могуць зьвярнуцца па дапамогу ў Фонд Пісьменьніцкіх Прэміяў, грошы на які выдзяляюцца ўрадам і распараджаецца якім адмысловы камітэт, які абіраецца сярод кандыдатаў, выстаўленых Саюзам Пісьменьнікаў. Гэтая сыстэма была прынятая ў 1977 годзе пасьля доўгіх зацятых спрэчак над старой сыстэмай прэміяў, якія найчасьцей выліваліся ў палітычныя кампаніі. Прафэсійны пісьменьнік звычайна можа разьлічваць штогод на некалькі месяцаў стыпэндыі з гэтага фонду, максымальна на поўгады.

Адзіныя грошы, на паступленьне якіх могуць спадзявацца выдаўцы — так званы Фонд Перакладаў, які падтрымвае пераклады на ісляндзкую мову выдатных твораў замежнай літаратуры. Гэты фонд невялікі, тым ня менш ён паспрыяў выданьню твораў сусьветнай літаратуры ў ісляндзкіх перакладах.

Ва ўсім астатнім ісляндзкія выдаўцы мусяць клапаціцца аб сабе самі, і гэта, напэўна, добра — хоць бы толькі з тае прычыны, што ў іншым выпадку памеры кніжнага рынку сапраўды б сталіся прычынаю сур'ёзнага непакою, як гэтага баяўся рэдактар, цытаваны на пачатку артыкулу. Аднак яшчэ важнейшаю прычынаю ёсьць тое, што літаратурная культура, нягледзячы ні на што, займае ў гэтай краіне надзвычай унікальнае становішча. Ісляндцы ня маюць сваёй філязофскай традыцыі, аднак маюць велізарную традыцыю апавядальніцтва. Мы ня маем вялікай архітэктурнай гісторыі, затое можам пахваліцца цудоўнай гісторыяй літаратуры. Літаратура — проста неад'емная частка нашага нацыянальнага вобразу. І таму мы мусім стварыць адпаведныя ўмовы для разьвіцьця літаратурнае культуры й дазволіць ёй самой стаяць на нагах. Калі б яна пачала патрабаваць для свайго йснаваньня большае, чым цяпер, дапамогі, тады для нашага народу сапраўды настала б змрочная пара.

Пераклад з ангельскае BKZ

Іван Радоеў

ПЯСЧЫНКІ

* * *

Юда хутка пацалаваў Ісуса
І ўзяў трыццаць срэбнікаў
пад самым носам у Пётры.

* * *

І ў Гітлера, і ў Сталіна былі вусы,
але ў Гітлера былі меншыя.

* * *

Будзь аптымістам!
Заўсёды, калі бачыш тапельца,
веруй, што ён купаецца!

* * *

Наша краіна маленькая, Божа!
Як нам пракарміць столькі герояў!

* * *

Народ храбры,
але людзі баязьлівыя.

* * *

Ніколі не сядай паміж Юдам і
Хрыстом!
Пацалуюць па памылцы!

* * *

Ньютон.
Яблык.
Гравітацыя.
Слава чарвяку!

* * *

Пралетарыят страціў кайданы,
але інтэлігенцыя іх знайшла.

* * *

Адна справа бясьпечная дзяржава,
іншая справа — Дзяржаўная бяспека.

Здымак Алены Адамчык

* * *

У целахоўнікаў выхадны —
у дзень пахаваньня.

ЧЫСТАЯ СПРАВА

Чорныя машыны.
Чорныя касьцюмы.
Чорная ікра.
Чорныя сьпісы.
Очи черные.

ЭВАЛЮЦЫЯ ПАЭЗІІ

Першасная,
лірычная,
касьмічная,
грашовая,
загранічная,
безасобавая,
клясычная.

СПРАЖЭНЬНЕ

Сьмяяліся.
Сьмяюцца.
Будуць сьмяяцца.
Мы плакалі.
Плачам.
Будзем плакаць.

З балгарскай пераклала
Венета Георгіева-Козарава

Маленькая пагулянка містэра Лаўдэя

Іўлін Ўо

1.

— Ты ўбачыш, што бацька амаль не зьмяніўся, — сказала лэдзі Моўпінг, калі машына заехала ў браму паштовай вар'ятні.

— Ён носіць форму? — спыталася Анджэла.

— Не, дарагая, вядома ж не. Зь ім тут вельмі добра абыходзяцца.

Анджэла ўпершыню адведвала бацьку — яна сама захацела гэта зрабіць.

Дзесяць гадоў прайшло з таго непагоднага летняга дня, калі забралі лорда Моўпінга, дня, ад якога ў яе засталіся цьмяныя, але горкія ўспаміны. Вось як усё адбылося. У той дзень лэдзі Моўпінг мелася ладзіць штогадовы прыём на вольным паветры. Надвор'е было цудоўнае, але з прыездам першых гасьцей неба зацягнулі хмары і ўзьняўся шквальны вецер. Госьці кінуліся ў дом. Абваліўся шацёр. Абрус узьвіўся ўгару й павіснуў на гольлі араўкарыі. Усчалася мітусьня зь пераносам падушак і крэслаў. Праз нейкі час зноў засьвяціла сонца, і госьці пачалі асьцярожна выходзіць на мокры лужок. Але зноў наляцеў шквал, пасьля чаго дваццаць хвілін зьзяла сонца. І так паўтаралася шмат разоў. А шостай гадзіне лорд Моўпінг паспрабаваў скончыць жыцьцё самагубствам. Гэта была кульмінацыя таго жахлівага дня.

Лорд Моўпінг штогод пагражаў самагубствам напярэдадні традыцыйнага прыёму, але ў той дзень ён зьдзейсьніў сваю пагрозу. Ён павесіўся ў аранжэрэі на сваіх шлейках. Суседзі, што хаваліся там ад дажджу, знайшлі яго счарнелага, паставілі на ногі, і праз гадзіну па яго прыехаў фургон. З тае пары лэдзі Моўпінг зрэдку наведвала свайго мужа. Звычайна доўга яна там не заседжвалася й вярталася якраз да гарбаты, нічога не распавядаючы.

Шмат хто з суседзяў быў схільны крытыкаваць прытулак лорда Моўпінга. Аднак лорд ня быў звычайны хворы. Ён жыў у асобным крыле вар'ятні, спэцыяльна прызначаным для багатых хворых. Яны мелі права на ўцеху пэўных сваіх прыхамацяў. Напрыклад, ім дазвалялі выбіраць вопратку (некаторыя ў гэтым давалі волю сваім дзівацтвам), курыць найдаражэйшыя цыгары й ладзіць вечарыны для сваіх прыяцеляў-вар'ятаў на ўгодкі прызнаньня іх хворымі.

Але гэта была далёка ня самая дарагая ўстанова. Бескампрамісны адрас «Шпіталь для псыхічна хворых», прастаўлены на паштовай паперы й нават вышыты на ўніформе пэрсаналу, не выклікаў радасных пачуцьцяў. Калі-нікалі сяброўкі далікатна нагадвалі лэдзі Моўпінг пра йснаваньне прыватных лякарняў на беразе мора, пра «дасьведчаных лекараў з усімі неабходнымі ўмовамі для лекаваньня нэрваў і больш цяжкіх выпадкаў». Але яна не надавала вялікай увагі гэтым парадам. Яна адказвала сваім сяброўкам, што калі яе сын стане паўналетнім, то ён зможа зрабіць усё, што палічыць патрэбным, але пакуль што яна ня мае вялікага жаданьня мяняць свой рэжым эканоміі. Яна лічыла, што муж здрадзіў ёй якраз у той момант, калі яна чакала ад яго адданай падтрымкі і што жывецца яму ў вар'ятні лепей, чым ён заслужыў.

Некалькі самотных постацяў у шэрым сноўдалі па парку.

— Гэта хворыя найніжэйшае клясы, — заўважыла лэдзі Моўпінг. — Для людзей накшталт твайго бацькі ёсьць нейкі ўтульны садок. Летась я дастала для яго колькі саджанцаў.

Машына праехала ўздоўж суцэльнага фасаду з жоўтае цэглы і спынілася каля прыватнага ўваходу. Доктар прыняў іх у пакоі для наведнікаў, прызначаным якраз для гэткіх сустрэчаў. Адзінае акно было надзейна абароненае мэталёвымі прутамі й аплеценае дротам. Каміна там не было, і калі Анджэла паспрабавала перасунуць сваё крэсла далей ад радыятара, дык адчула, што яно прымацаванае да падлогі.

— Лорд Моўпінг гатовы з вамі сустрэцца, — сказаў доктар.

— Як ён чуецца?

— О, вельмі добра. Я б нават сказаў цудоўна. Пару дзён таму ён быў прастудзіўся, але цяпер ён у выдатнай форме. Ён шмат піша.

У гэты момант яны пачулі шорганьне нечых ног па калідоры. Высокі бурклівы голас, што, як здагадалася Анджэла, належаў яе бацьку, сказаў: «Я ня маю часу. Скажыце ім, каб прыйшлі пазьней». Другі, лагаднейшы голас зь лёгкім вясковым акцэнтам адказаў: «Хадземце. Гэта чыста афіцыйная аўдыенцыя. Вы можаце заставацца там столькі, калі захочаце».

Потым дзьверы расчыніліся (на іх не было ні замка, ні засаўкі), і лорд Моўпінг увайшоў у пакой. Усьлед за ім зьявіўся старэнькі сівы дзядок, твар якога сьвяціўся дабрынёй.

— Гэта містэр Лавдэй, памочнік лорда Моўпінга.

— Сакратар, — запярэчыў лорд. Ён падыйшоў, падскокваючы, да жонкі й паціснуў ёй руку.

— Гэта Анджэла. Ты памятаеш Анджэлу?

— Не, я б не сказаў. Чаго яна хоча?

— Мы проста прыйшлі цябе адведаць.

— Вы для гэтага выбралі надзвычай непрыдатны час. Я вельмі заняты. Вы ўжо надрукавалі той ліст да Папы, Лавдэй?

— Не, ваша сьветласьць. Калі вы памятаеце, вы прасілі мяне знайсьці спачатку лічбы наконт рыбнага промыслу на Ньюфаўндлэндзе.

— Сапраўды. Тым лепей, бо я думаю, што трэба будзе перарабіць увесь ліст. Надта шмат новай інфармацыі прыйшло пасьля абеду. Надта шмат... Ты бачыш, дарагая, я страшэнна заняты. Ён перавёў свой мітусьлівы, хітраваты позірк на Анджэлу. — Я мяркую, вы да мяне завіталі наконт Дуная. Баюся, вам давядзецца падыйсьці да мяне трохі пазьней. Скажыце ім, што ўсё будзе ў парадку, у поўным парадку, але ў мяне не было часу, каб сур'ёзна заняцца гэтай справай. Перадайце ім гэта.

— Добра, тата.

— Дый наогул, — капрызьліва дадаў лорд Моўпінг, — гэта другарадная справа. Перадусім трэба разабрацца з Эльбаю, Амазонкай і Тыграм. Праўда, Лавдэй?... Ох, ужо мне гэты Дунай. Мярзотная рачулка. Ну, мушу бегчы. Дзякуй, што зайшлі. Я б вам дапамог, але самі бачыце, колькі ў мяне праблем. Напішыце мне пра гэта. Вось.

Сказаўшы гэта, ён выйшаў з пакою.

— Бачыце, — сказаў доктар, — ён у цудоўнай форме: набірае вагу, выдатна есьць і сьпіць. Фактычна яго здароўе ў норме.

Дзьверы зноў прычыніліся: вярнуўся містэр Лавдэй.

— Прабачце, што перапыняю, сэр, але я баяўся, што маладая лэдзі будзе засмучаная тым, што яго сьветласьць не пазнаў яе. Вы не павінны наракаць на яго, міс. Наступным разам ён будзе вельмі рады вас убачыць. Сёньня ён не ў гуморы, бо завалены працай. Ведаеце, сэр, увесь гэты тыдзень я дапамагаў у бібліятэцы і ня змог надрукаваць усе дакумэнты яго сьветласьці. Ён заблытаўся ў картатэцы. Вось і ўсё. Ён не хацеў вас пакрыўдзіць.

— Які добры чалавек, — сказала Анджэла, калі містэр Лавдэй вярнуўся да свайго падапечнага.

— Так. Ня ведаю, што б мы рабілі безь яго. Усе яго любяць: і пэрсанал, і пацыенты.

— Я добра яго памятаю. Дзе вы толькі бераце такіх добрых санітараў? — ска-

Працяг на старонцы 14

ГАЦЬ

Анджэй Вархал

— Наступны! — прахрыпеў стары.

— Можа я? — нясьмела азваўся невысокі худы мужчына. Ён стаяў далёка ад пачатку чаргі й баяўся, што старому хопіць тых, якія стаялі перад ім

— Вы? — засьмяяўся стары. — Дык вас жа зьнясе.

— Адыйду далей, добра скокну й напэўна затрымаюся.

— А, скачыце, — згадзіўся стары. — Будзеце замест жвіру.

Невысокі мужчына пабег уверх па плыні ракі й з высокага берагу кінуўся ўніз галавой.

— Наступны! — крыкнуў стары.

Цяпер падыйшла чарга высокага хлопца. Ён узяў разгон і скокнуў на жывот.

— Во, во, — сказаў стары, — такіх нам і трэба. Яшчэ крыху, і гаць будзе гатовая.

— Можна было б кожнаму даць мяшок зь пяском альбо вялікі камень, — азваўся хтосьці з натоўпу.

— Хто гэта сказаў? — запытаўся стары, углядаючыся ў натоўп. У мёртвай цішы нехта падняў руку.

— Вы цяміце?! — крыкнуў стары.

— Я закончыў аддзяленьне гацяў.

— Мы хочам скакаць без камянёў, — захвалявалася чарга.

— Дык жа з каменем хутчэй пойдзеш на дно, — спрабаваў пераконваць дыплёмнік.

— Ня хочам нічыёй дапамогі, — адказала чарга. — Дый негуманна скакаць з каменем.

— Застанецеся тут, пакуль ня высьветлім, — перарваў дыскусію стары. — Наступны!

На чале чаргі цяпер стаяў спалоханы мужчына.

— Ну, давай, — падганяў яго стары.

— Аднак мне нельга скакаць, — прамармытаў ён нясьмела. — Лекар забараніў.

— Можаце ўвайсьці ў раку й крочыць па дне.

— Дык мяне ж зьнясе. Калі я раблю больш крок левай нагой, мяне заўсёды зносіць управа. Магчыма, мяне можна скіраваць у адміністрацыю?

— Мы змагаемся супроць разьдзьмутых штатаў, — захваляваўся стары — Скачыце. Раз, два і пайшоў. Найлепшы сродак.

— Гэтага яшчэ не хапала. З кішэняў усё павысыпаецца!

— Вы што, баіцёся?!

— Я?! Баюся?! — абурыўся хворы. — Я нічога не баюся. Я магу нават два разы.

Ён разагнаўся й скокнуў.

— Наступны! — крыкнуў стары.

Наперад пачаў прабірацца малады чалавек. Яго не хацелі прапусьціць, аднак у яго ў руцэ была нейкая паперка.

— Ну, што ў вас? — запытаўся стары.

— Я хацеў бы за Вацакам. Ён мой сябрук.

— Дыхніце.

— Навошта?

— Мера перасьцярогі. Скакаў тут адзін. Ледзь усю рыбу не атруціў...

— Але ж я павінен скокнуць! — адчайна ўсклікнуў малады чалавек. — Не дарэмна ж вучыўся!

— Ну, добра, — сказаў стары. Толькі каб у апошні раз.

Малады чалавек разагнаўся й скокнуў. З вады паявіліся бурбалкі. Хутка паказалася галава і, нарэшце, захліпаючыся, зьнікла назаўсёды.

З польскай пераклаў Уладзіслаў Струміла



Малюнак Яўгена Лугавога

Маленькая пагулянка містэра Лаўдэя

Працяг са старонкі 13

зала лэдзі Моўпінг. — Недасьведчаныя людзі гавораць столькі глупстваў пра вар'ятні.

— Але містэр Лавдэй не санітар, — сказаў доктар.

— Вы хочаце сказаць, што ён таксама касамозгі? — запыталася Анджэла.

— Ён пацыент, — паправіў яе доктар. — Даволі цікавы выпадак. Жыве тут ужо трыццаць пяць гадоў.

— Але ж ён зусім нармальны, — сказала Анджэла.

— Так, выглядае на тое, — пагадзіўся доктар, — і апошнія дваццаць гадоў мы ставімся да яго як да нармальнага. Немагчыма ўявіць шпіталь безь яго. Вядома, ён не належыць да групы прыватных пацыентаў, але мы дазваляем яму свабодна зь імі кантактаваць. Ён цудоўна гуляе ў більярд, паказвае на канцэртах розныя штукарствы, напраўляе іхныя грамафоны, прыслужвае ім, дапамагае разьвязваць крыжаванкі й займацца ўсялякімі... э-э... хобі. Мы дазваляем ім даваць містэру Лавдэю трошкі грошай за паслугі, і ён, мабыць, за ўсе гэтыя гады ашчадзіў кругленькую суму. Ён знаходзіць агульную мову нават з самымі неспакойнымі зь іх. Ён проста бясцэнны чалавек для нашай установы.

— Добра, але чаму ён трапіў да вас?

— Ну, гэта вельмі сумная гісторыя. Калі ён быў яшчэ малады, ён забіў незнаёмую маладзіцу — зваліў яе з ровара й прыдушыў. Пасьля гэтага ён адразу ж здаўся, і з таго часу ён у нас.

— Але ж цяпер ён, відаць, ужо бясьпечны. Чаму яго не выпускаюць?

— Ведаеце, калі б нехта быў у гэтым зацікаўлены, ён бы даўно быў на свабодзе. Але ў яго няма іншых крэўных апрача зводнай сястры, што жыве ў Плімуце. Даўней яна наведвала яго, але вось ужо некалькі гадоў яна не прыяжджае. Ён цалкам задаволены сваім жыцьцём тут, і можаце быць пэўныя, што мы ня маем намеру рабіць захады дзеля яго вызваленьня. Ён занадта карысны для нас.

— Але гэта несправядліва, — сказала Анджэла.

— Зірніце на свайго бацьку, — не згадзіўся доктар. — Што б ён рабіў без Лавдэя?

— Усё адно гэта несправядліва.

2.

Пасьля наведваньня шпіталя Анджэла адчувала сябе прыгнечана.

— Страшна падумаць, што нехта можа правесьці ў вар'ятні ўсё сваё жыцьцё.

— Ён спрабаваў павесіцца ў аранжэрэі, — стрымана запярэчыла лэдзі Моўпінг, — перад носам у Чэстэр-Марцінаў.

— Я ня маю на ўвазе тату. Я пра містэра Лавдэя.

— А хто гэта? Я яго ня ведаю.

— Ведаеш. Ну, той псых, якога прыставілі да таты.

— А, сакратар твайго бацькі. Вельмі прыстойны чалавек. Ён цудоўна выконвае сваю працу.

Анджэла часова адклала абмеркаваньне гэтае тэмы й вярнулася да яе на другі дзень падчас абеду.

— Мам, а што трэба зрабіць, каб вызваліць чалавека з псыхушкі?

— З псыхушкі? Божа мой, я спадзяюся, ты не зьбіраесься паскорыць вяртаньне свайго бацькі *сюды*!

— Не, не. Я пра містэра Лавдэя.

— Анджэла, цяпер я бачу, што няможна было ўчора браць цябе з сабой. Ты занадта ўражлівая.

Адразу пасьля абеду дзяўчына схавалася ў бібліятэцы, дзе ўзялася старанна вывучаць законы аб вар'яцтве.

Пэўны час Анджэла не размаўляла з маці наконт гэтае праблемы. Але праз два тыдні трэба было адвезьці ў шпіталь колькі фазанаў: бацька ладзіў вечарыну, прысьвечаную адзінаццатым угодкам прызнаньня яго вар'ятам. Анджэла зь незразумелай настойлівасьцю папрасіла маці дазволіць ёй завезьці прадукты. Лэдзі Моўпінг была занятая іншымі справамі й ня ўгледзела ў гэтым нічога падазронага.

Анджэла прыехала ў шпіталь на сваім невялікім аўтамабілі і, пасьля разгрузкі дзічыны, папрасіла паклікаць містэра Лавдэя. У гэты момант стары якраз рабіў карону для аднаго са сваіх прыяцеляў, які меўся быць памазаны на імпэратара Бразіліі, але, тым ня менш, ён ласкава згадзіўся пагаварыць зь ёю. Яны пагаманілі трохі пра здароўе й настрой лорда Моўпінга, а потым Анджэла мімаходзь запыталася:

— Вам ніколі не хацелася выбрацца адсюль?

Містэр Лавдэй паглядзеў на яе сваімі пяшчотнымі блакітна-шэрымі вачыма й сказаў:

— Я прывык да такога жыцьця, міс. Я адчуваю сымпатыю да гэтых нябогаў і думаю, што некаторыя зь іх адчуваюць прыхільнасьць да мяне. Прынамсі, хто-ніхто засумаваў бы, калі б я зьехаў адсюль.

— Але ці марыце вы калі-небудзь пра тое, каб зноў апынуцца на волі?

— Вядома, міс, я пра гэта мару... мару ці ня ўвесь час.

— Што б вы зрабілі, калі б вам удалося выбрацца са шпіталя? Мусіць, ёсьць нешта такое, што вам вельмі хацелася б зрабіць.

Стары неспакойна заварушыўся.

— Ведаеце, міс. Мабыць, гэта прагучыць няўдзячна, але мне б вельмі хацелася схадзіць на кароткую пагулянку, адзін разочак, пакуль я не зрабіўся зусім стары. Я мяркую, у нас ва ўсіх ёсьць свае таемныя жаданьні. Вось і я таксама хацеў бы зрабіць адну рэч. Не пытайцеся якую... Гэта не забярэ шмат часу. Але я адчуваю, што зрабіўшы гэта, я мог бы зь лёгкім сэрцам сысьці на вечны спакой. Мая душа была б задаволеная, і я б прысьвяціў рэшту свайго жыцьця гэтым бедным хворым людзям.

Калі Анджэла вярталася дамоў, у яе ўвачу былі сьлёзы. «Ён пойдзе на сваю маленькую пагулянку», — думала яна.

3.

З гэтага дня ў жыцьці Анджэлы зьявілася новая мэта. Дзяўчына выконвала свае хатнія абавязкі зь нейкім летуценным выглядам, зь незнаёмай, стрыманай далікатнасьцю, што вельмі бянтэжыла лэдзі Моўпінг.

— Дзіця, відаць, закахалася. Не давядзі Бог, каб у таго нехлямяжага хлопца Эгбэртсонаў.

Анджэла цэлымі днямі сядзела ў бібліятэцы, дапякала пытаньнямі кожнага госьця, які меў хоць нейкае дачыненьне да мэдыцыны або юрыспрудэнцыі, дэманстравала сваю прыхільнасьць старому сэру Родэрыку Лэйн-Фоскоўту, што быў сябрам парляманту ад іх акругі. Словы

ОСКАР МІЛАШ У КІТАІ

(замест крыжаванкі)

Хэ Лю быў студэнтам псыхасаматычнае мэдыцыны ў Цюрыху, дзе «Джойс і Музіль, суседзі, ніколі не сустрэліся». Ён вярнуўся ў Кітай у 1989, пакінуўшы верш Трыстана Цара прыклееным да свайго ровара ў якасьці разьвітаньня.

Ягоныя вершы й пераклады былі сабраныя (Carcanet, Manchester, 1991) Джонам Пэкам, які сам паступіў у Інстытут Юнга, напісаўшы колькі добрых вершаў у 70-х.

Пэк заўважае ў сваёй прадмове, што «абнаўленьнем, якое ён [Хэ Лю] найбольш цаніў у эўрапейскай паэзіі XX стагодзьдзя, ... была спроба стварэньня новае хрысьціянскае мэтафізыкі ў позьніх вершах у прозе Оскара Мілаша... аднак Хэ Лю ведаў, што яны ляжаць далёка за межамі перакладальнага абсягу яго народу. Гэты эліксір ня вытрывае пераліваньня ў іншую бутэльку, накрэмзаў ён побач зь вершам 81 у Les Arcanes...: Тут, у гэтай скрынцы з прыладзьдзем, О Кароль работнікаў, ты знойдзеш крыж, скіпэтар і карону сьвету. Аднак я мушу зноў сказаць табе, як стары Кароль асьлеп».

Не забываючыся пра папярэджаньне, укладальнік выбірае пераклады Хэ Лю такіх паэтаў як матэматык-малярмэанец Іон Барбу, Мандэльштам у Італіі, Сэлян у Асызе і Баброўскі, што марыць пра Сарматыю (ён «знайшоў у некалькіх простых словах згубленую краіну») раньні Мілаш: «Учора, дзесяць гадоў таму, сёньня, праз месяц / — страшныя словы, штампы, але ці не ўсё роўна. / Пішы, засьні або памры — мусіш уцячы ад сваёй абрыдлай сутнасьці / так або йначай...»

Гэта падобна на непасрэдны пераклад, аднак некаторыя вершы ранейшых паэтаў крыху падноўленыя, як «Плач Мокрай Вясною» Лі Хоў (791—817, за 1100 гадоў да Багдановіча!): «Як здолеў Цара / выскаляючыся пераехаць на Белым Асьле / праз гэтыя сьпічастыя вяршыні? // Ірляндзец Джэймс ляжыць цяпер / шмат гадоў у сваёй уяўнай грабніцы, / куча сьмярдзючых костак. // А першасьвятар Цвінг-Лі / мае інкруставаную дамавіну з чорнага ружадрэву. / Што за марнаваньне абалёнаў». (Абалёнавыя ракавіны — крыніца пэрлямутру.)

Сярод арыгінальных вершаў сустракаюцца прыклады «перакладзізмаў», як прыкладам «Нават у дні сарокі / калі пяро ляціць міргаючы / і лёгкі ветрык сыціць шматлікія крылы — / нават тады голас чарапахі мосьціць даўгую дарогу» або [Я недзе згубіў] «мокрае сьвятло пад грыбамі, гук / патокаў глыбока пад дашчаным мастом, / празрыстасьць / крыла, што якраз прамінула і / блiснула перад пачаткам», тым часам як іншыя грунтуюцца на архаічных формах кітайскіх іерогліфаў, інтэрпрэтаваных Бэрнхардам Карлгрэнам.

Але Хэ Лю найбольш прыдатны для цытаваньня ў «Тузіне Тузінаў Вершаў, Злучаных Адвольным Парадкам», зь ягоным матывам (узятым з аднаго з «23 вершаў пра коней» Лі Хоў?) «Я паіў каня з паглыбленьняў у Сьцяне» (заўвага пра іншую сьцяну, пазначаную як «Маёнтак Брэхта» належыць, пэўна, Пэку, а не Хэ Лю), у некаторых зь іх гаворыцца пра менш модных выгнаньнікаў:

Уга Фаскола ўцёк ад Буонапартэ / каб жыць з куранятамі / на задвор'і плябаніі / у пратэстанцкім Хотынгене. / «Прышлі мне майго Дантэ». (Дантэ рыфмуецца з Дзантэ, адкуль паходзіць Фаскола). Фаскола ўцёк зь Цюрыху ў Лёндан / дзе ён купіў дом з садам / але адмовіўся выкладаць італьянскую мову / шляхцянкам. «Прышлі грошай, / у гэтай краіне беднасьць лічаць за грэх».

Гэтыя 144 паэмы — толькі малая частка ўсёй кнігі, у якой роўна гэтулькі ж поўных старонак; гэта, а таксама далёка закінутая сетка намёкаў тлумачыць, чаму гэтае выданьне патанула бязь сьледу ў брытанскай культуры, амаль не прыцягнуўшы нічыёй увагі. Аднак я не магу стрымацца, каб не працытаваць яшчэ пару кавалкаў з тузіну тузінаў:

Артэмідор і Юн Чы / су-працоўнікі аднае раніцы, / з Сынгам і чайкай, на якую ён глядзеў / праз доўгую раніцу на Аране / спрабуючы загнаць гольфавы мячык на скалах.

(Артэмідор — сучасьнік Марка Аўрэлія, які напісаў «Тлумачэньне сноў»).

«Прастора — ня тое, што яны кажуць, / апроч таго, ёсьць яшчэ й le mouvement...» / Оскар Мілаш / мінае малельны перазвон каровіных званкоў / сярод туманаў у горах Рыгі.

Вальзэр Леніну / на Шпігельгасэ: «А вы таксама любіце / гэты Glarner Birnbrot?»

Вальзэр — гэта Робэрт Вальзэр, аўтар кніг «Кляйст у Туне» і «Прагулка» (не на кожны густ, аднак смачны кавалак!). Ягоны верш «Сьнег» прапушчаны, бо ягоныя (пасьмяротныя) ахоўнікі сказалі Хэ Лю, што гэты твор неперакладальны. За ім (або не за ім) ідзе верш Хайдэгера («этычна спрэчнага» філёзафа, якога можна лічыць героем за яго працу аб Лао Цзы), пазьней у страху спалены Маёнткам Хайдэгера.

Верш, які пачынаўся «Азёрнае срэбра / рассыпаецца на цёмных берагох...», быў пра Райхенаў, дзе Валяфрыд Страбон, блізкі сучасьнік Лі Хоў, у заснаваным ірляндцамі манастыры піша вершы пра садоўніцтва: «Дзе быў схаваны шпік, цяпер гадуецца дрэва, / кветкі ў цэўцы — бясспрэчна добры знак».

Тым часам у Францыі апошні вялікі ірляндзкі тэоляг Джон Шкот Эрыўгена, «згорбіўшыся ў воску сваёй цэлі», пісаў, што «Кожная йстота зноў вернецца ў цень, гэта значыць / да Бога, як зорка побач зь сьвітальным сонцам. / Цемра сьвятлейшая за нашае зьзяньне».

Цяпер ясна, што я мела на ўвазе, гаворачы пра далёка закінутую сетку?! Паедзем далей свабодным ходам і скончым яшчэ адным кітайскім паэтам, што робіць наезды на Захад, які быў знаёмы з вучаніцай Гурджыева Кэтрын Мэнсфілд і перакладаў для Тагора. «Хаваючыся ад залевы ў кэмбрыджскай кнігарні / і п'яны ад Годвін, Шэлі, Хэмілтана, Кавура, / Сю Чжымо вяртаецца да Пэйтэра». (Пэўна, Аляксандар Хэмілтан, а не ірляндзкі вынаходнік кватэрніёнаў; Пэк, крыху па-Паўндаўску, не дае тлумачэньняў.) «Сю ляціць на ровары праз Кэмбрыджскія балоты ў захад сонца / каб працягнуць яго».

М.М.

«псыхіятар», «адвакат», «дзяржаўны чыноўнік» вабілі цяпер яе так, як некалі імёны кінаактораў і прафэсійных барцоў. Яна ўпарта змагалася за дасягненьне сваёй мэты і, пад канец паляўнічага сэзону, дамаглася свайго. Містэр Лавдэй атрымаў свабоду.

Хоць доктар і ня меў вялікае ахвоты выпускаць старога, але ж і не праціўіўся. Сэр Родэрык напісаў у Міністэрства ўнутраных спраў. Былі падпісаныя неабходныя паперы, і, нарэшце, надыйшоў дзень, калі містэр Лавдэй разьвітаўся з домам, у якім правёў столькі доўгіх і карысных гадоў.

З гэтай урачыстай нагоды была арганізаваная невялікая цырымонія. Анджэла й сэр Родэрык сядзелі поруч зь лекарамі на сцэне, абсталяванай у спортзале. Перад сцэнай былі сабраныя ўсе, каго лічылі дастаткова ўстойлівымі, каб вытрымаць гэткае ўзрушэньне.

Лорд Моўпінг сказаў колькі добрых слоў пра містэра Лавдэя й падараваў яму ад імя багатых вар'ятаў залаты партабак. Тыя, што ўважалі сябе за імпэратараў, засыпалі яго ардэнамі й ганаровымі тытуламі. Санітары адшкадавалі яму срэбны гадзіньнік. Шмат хто зь бедных пацыентаў, назіраючы цырымонію, ціха плакаў.

Доктар выступіў з прамовай.

— Дарагі Лавдэй, — сказаў ён, — памятайце, што мы зычым вам толькі дабра. Нітка, што нас зьвязвае, ніколі не абарвецца. Мы вашыя даўжнікі, і час толькі абвострыць гэтае пачуцьцё. Калі вы раптам адчуеце стому ад жыцьця там, на свабодзе, мы заўсёды будзем рады прыняць вас назад. Вашая пасада застанецца вакантная.

Тузін ці болей расчуленых псыхаў падскакам праводзілі яго да выхаду. Жалезная брама адчынілася — і містэр Лавдэй апынуўся на свабодзе. Ягоную маленькую пакоўню ўжо адправілі на вакзал, бо ён вырашыў прайсьціся пешшу. Стары нікому не сказаў пра свае пляны, але грошай у яго было нямала, і ўсе думалі, што перад тым, як наведаць сваю зводную сястру ў Плімуце, ён паедзе павесяліцца ў Лёндан.

Усе былі страшэнна зьдзіўленыя, калі праз дзьве гадзіны пасьля разьвітаньня ён вярнуўся. Яго твар асьвятляла загадкавая, ласкавая ўсьмешка, нібы ён згадваў нешта прыемнае.

— Я вярнуўся, — паведаміў ён доктару. — Думаю, што цяпер назаўсёды.

— Але чаму такі кароткі адпачынак, Лавдэй? Вы ж, пэўна, не пасьпелі й павесяліцца!

— О не, сэр. Дзякую вам, сэр. Я *выдатна* павесяліўся. Усе гэтыя гады я абяцаў сабе адно маленькае задавальненьне. Яно было вельмі кароткае, сэр, але *надзвычай* прыемнае. Цяпер я без усялякага шкадаваньня вазьмуся за сваю працу.

Трохі пазьней за паўмілі ад брамы вар'ятні, на дарозе быў знойдзены стары жаночы ровар. Паблізу, у канаве, ляжала цела задушанай маладзіцы. Напэўна, едучы дадому на гарбату, яна мела няшчасьце напаткаць містэра Лавдэя, які гуляў па дарозе, думаючы, што рабіць са свабодай.

Пераклаў з ангельскай Віктар Лук'янаў

ШТО ПІШУЦЬ?

Шаноўная Рэдакцыя!

Дзякуй вам за той вялікі кавалак жыцьця, які мае назву «Наша Ніва». Першы нумар за 1994 год узрушыў і мяне ўзяцца за самапіску.

Перш за ўсё — доўгачаканы (асабіста для мяне) плян Вільні. Здарылася так, што, студэнтуючы ў Пецярбурзе, марыў памераць крокамі Парыж (як, дарэчы, і цяпер мару). Мне ён здаецца Горадам зь вялікай літары (паводле Картасара), дзе я проста павінен пабываць. Але, дзякуючы «НН», у мяне зьявіўся другі Горад — Вільня. Сорамна, што ў свае 27 гадоў не пабываў яшчэ там. У мяне ўжо ляжаць каардынаты фірмы «Ваўкалака», якая, думаю, дапаможа ў спатканьні. І вось гэты ваш «Vilenski plan», бо любім з жонкай (яшчэ зь Пецярбургу) самі «бадзяцца абы-дзе». Вось толькі ня ведаю, ці хопіць маіх лекарскіх грошай на такую вандроўку хаця б на 2-3 дні. Але, паколькі мы не скідаем з плянаў і Парыж, то, думаю, гэтым летам абавязкова заедзем у Вільню.

І другое. Чытаў Севярына Квяткоўскага ў гэтым жа нумары, і здавалася, што ён зрабіў з маіх думак вялікі «плягіят» (хай прабачыць аўтар). Зь вялікім задавальненьнем прыняў ягоныя нататкі. Мне цяпер якраз і не хапае такіх сяброў, каб за куфэркам «Лідзкага» ці «Старажытнага» піва пагаварыць аб «Дасканалым Моманце». Старыя сябры далёка, а новых не прыдбаў пакуль. Дый, здаецца, зусім не прыдбаю. Адразу захацелася падарыць яму адно з маіх практыкаваньняў з алеем і пэндзлем. І калі шаноўная Рэдакцыя дашле Квяткоўскаму мой адрас, то я чакаю Севярына ў госьці, тым больш, што неўзабаве павінна адчыніцца мая выстава ў мясцовым краязнаўчым музэі. Вядома, я не Шагал і не Малевіч, але, думаю, кагосьці зацікавяць мае мэтамарфозы.

Спадзяюся, што мае вусны ў хуткім часе дакрануцца да Вострае Брамы, а мае рукі падораць рэдакцыі «НН» адну з маіх карцін, калі для яе знойдзецца месца (хаця б у прыбіральні) і калі яе не забароняць улады ад вывазу зь Беларусі як нацыянальны здабытак.

Няхай жыве «Уліс» Джойса ў беларускім перакладзе!

З павагай да вас Алесь Зьдзешчыц з Картуз-Бярозы.

Вельмі Пав. Рэдактар бел. газэты Н.Н.

Перажываючы ўжо прыблізна 50 гадоў па-за межамі сваё Бацькаўшчыны, нічога дзіўнага, што, калі атрымаю бел. прэсу, то зь вялікай прагнасьцяй чытаю ад першай да апошняй старонкі. Асабліва цікавяць мяне весткі пра Беларусь і бел. жыцьцё. Чытаючы Нашу Ніву, я поўнасьцю згаджаюся з спадарыняй Раісай Жук-Грышкевіч, што ў гэтай газэце вельмі мала пішацца пра Беларусь і ўсё тое, што нам баліць, турбуе і клапоціць. На маю думку, калі там штосьь робіцца добра, то трэба хваліць, а калі нядобра, то абавязкова крытыкаваць, ганіць. Я ўпэўнены, што для жыхароў Літвы ёсьць свабода гаварыць і пісаць. Калі газэта Н.Н. будзе друкавацца толькі каб задаволіць патрэбы толькі адукаваных людзей, тады яна ня стане такой папулярнай, як яе папярэдніца ў пачатку стагодзьдзя. Мая другая заўвага, што ў газэце друкуецца шмат перакладаў з другіх моваў і што мова аўтараў ёсьць перасеяна чужамоўнымі словамі, можа аўтары хочуць паказаць, што яны ёсьць адукаваныя людзі. Вялікая пагроза на чысьціню бел. мовы ёсьць ня толькі са ўсходу, але і з захаду.

Астаюся з пашанай да Вас

М.Баяроўскі з Англіі.

Паважаныя чытачы з усіх магчымых замежжаў.

Некаторыя з вас чакаюць ад «НН» рэгулярнае палітычнае, эканамічнае ды іншае інфармацыі пра Беларусь. Але такая інфармацыя не ўваходзіць у задачы Рэдакцыі. На тое ёсьць шмат выданьняў з больш частай пэрыядычнасьцю: «Свабода», «ЛіМ», «Голас Радзімы», ня кажучы ўжо пра штодзённыя.

Мы ж робім сваю газэту для Беларусі й толькі з таго, чаго сапраўды не стае ў Беларусі, ня так дзеля інфармацыі, як дзеля разваті й пачуцьця. Таму добрая палова нашага выданьня — гэта тэксты, якія йдуць з вольнага сьвету й мусяць патрапіць да беларускага чытача. У астатнім наша задача — творчасьць і ўзгадаваньне новых літаратараў ды аналітыкаў на традыцыйнай глебе несавецкай беларушчыны. Гэта беларуская рэфлексія на сьвет, на сябе й рэфлексія сьвету на беларушчыну. Таму мы ня ёсьць інфарматарам для замежжа, як ня ёсьць і выданьнем беларускай меншасьці ў Літве. 99% нашых чытачоў жывуць у межах цяперашняй РБ.

Вялікая просьба да ўсіх чытачоў на эміграцыі — паведамце, ці патрэбная вам гэтая газэта і калі не, мы ня будзем уводзіць вас у зман, калі ТАК — мы будзем дасылаць вам «НН» бясплатна й разьлічваць на ваш удзел і дапамогу.

Рэдакцыя


ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Ірыне Ш. зь Менску. У Вас лёгкае пяро. І гэта неаспрэчная здольнасьць. Але ў гэтым апавяданьні яно занадта лёгкае, бязважкае, амаль не кранаецца паперы. І гэта ўжо недахоп.

Зьмітру Б., Аўгену К., Уладзімеру С., Алегу Ч., Сяргею С. ды ўсім, хто з намі — у Гомлі. Абяцаны гомельскі нумар «НН» падрыхтавалі, але бяз вашых тэкстаў ён атрымаецца недастатковы. Таму чакаем у блізкім часе.

Юрасю П. Артыкул падрыхтаваны, але пакуль няма нагоды.

ВЯЛІКДЗЕНЬ!



НАША НІВА №3(21) Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Рэдактар Сяргей Дубавец. Выдавец Павал Жук. Адрасы для допісаў: 2041 Вільня а/с 2082 і 220123, Менск а/с 71. Падпісны індэкс у Літве: 67233, на Беларусі: 63125. Рэдакцыя (Вільня, Жыгімонта 12/2): Алег Мінкін (адк. сакратар), Сяргей Шупа (літ. рэдактар), Сяргей Харэўскі (маст. рэдактар). Менскае бюро (Менск, Іванаўская 56): Алег Дзярновіч (загадчык), Ігар Бабкоў (дыскурс). Рэдакцыйная Рада: Уладзімер Арлоў, Сяргей Астраўцоў, Адам Глёбус, Лявон Луцкевіч, Генадзь Сагановіч, Алесь Чобат. Афсэтны друк. Фармат А3. Агульны наклад 20 тыс. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом Друку» (220041 Менск, праспэкт Ф.Скарыны, 79) Замова 442

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12